Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9 ЛЮТАГА 2008 г.
СУБОТА
№ 26 (26139)

Кошт 490 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Прэзідэнт Беларусі даручыў павысіць нагляд за рацыянальным выкарыстаннем паліўна-энергетычных рэсурсаў

Такую задачу кіраўнік дзяржавы паставіў у час даклада генеральнага пракурора Пятра Міклашэвіча.

Аляксандр Лукашэнка даручыў забяспечыць безумоўнае выкананне патрабаванняў Дырэктывы № 3 і прыняць неадкладныя меры, накіраваныя на актывізацыю і павышэнне якасці пракурорскага нагляду за выкананнем заканадаўства аб рацыянальным выкарыстанні і захаванасці паліўна-энергетычных рэсурсаў.

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы запатрабаваў не зніжаць актыўнасці ў ажыццяўленні пракурорскага нагляду за няўхільным выкананнем патрабаванняў дырэктыў № 1 «Аб мерах па ўмацаванні грамадскай бяспекі і дысцыпліны» і № 2 «Аб мерах па далейшай дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарату».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што злачыннасць і карупцыя па-ранейшаму застаюцца фактарамі сацыяльнай напружанасці і аказваюць негатыўнае ўздзеянне на эканамічнае развіццё рэспублікі. Прэзідэнт запатрабаваў прыняць вычарпальныя і своечасовыя меры па павышэнні каардынуючай ролі пракуратуры ў барацьбе са злачыннасцю і карупцыяй, абароне канстытуцыйных правоў грамадзян і дзяржаўных інтарэсаў.

Генеральны пракурор далажыў аб выніках дзейнасці органаў пракуратуры Беларусі па ўмацаванні законнасці і правапарадку ў 2007 годзе.

У цэлым па рэспубліцы ў мінулым годзе зарэгістравана 180,4 тыс. злачынстваў, што на 5,8 працэнта менш, чым у 2006 годзе. Колькасць злачынстваў, учыненых непаўналетнімі і пры іх саўдзеле, скарацілася на 19,4 працэнта (з 8150 да 6572). Колькасць наўмысных забойстваў і цяжкіх цялесных пашкоджанняў знізілася адпаведна на 16,6 працэнта (з 948 да 791) і на 5,4 працэнта (з 1986 да 1878). Назіраецца значнае скарачэнне разбояў (на 17 працэнтаў) і рабяжоў (на 8,9 працэнта). Агульная колькасць цяжкіх злачынстваў скарацілася на 18 працэнтаў.

Тым не менш, Прэзідэнт паставіў задачу актывізаваць у гэтым годзе работу праваахоўных органаў па раскрыцці злачынстваў.

Актыўна праводзілася работа па выкананні арганізацыйных і практычных мерапрыемстваў, запланаваных Дзяржаўнай праграмай па барацьбе з карупцыяй на 2007—2010 гады. У выніку прынятых мераў колькасць карупцыйных злачынстваў скарацілася на 8,9 працэнта (з 3387 да 3084), у тым ліку з 887 да 675 — фактаў крадзяжоў шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі, з 373 да 310 — фактаў злоўжывання ўладай або службовымі паўнамоцтвамі. Нязначна павялічылася колькасць выяўленых фактаў хабарніцтва (з 1045 да 1066).

Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў, каб дзейнасць пракуратуры і іншых праваахоўных органаў у барацьбе са злачыннасцю праводзілася больш мэтанакіравана ў сферах эканамічнай і дзяржаўнага кіравання.

У 2007 годзе павялічыўся памер кампенсаванага матэрыяльнага ўрону ад карупцыйных злачынстваў да Br82,2 млрд (у 2006 годзе — Br56,2 млрд).

У мінулым годзе прадаўжалася работа па кантролю за выкананнем заканадаўства, што рэгламентуе парадак прадастаўлення і выкарыстання зямель, а таксама па выкананні дэкрэта № 18 ад 24 лістапада 2006 года аб дадатковых мерах па дзяржаўнай падтрымцы дзяцей у няўдалых сем'ях.

Ажыццяўляючы кантроль за выкананнем заканадаўства і законнасцю прававых актаў, у мінулым годзе пракуроры правялі амаль 14 тыс. праверак на прадпрыемствах, ва ўстановах, мясцовых выканаўчых і распарадчых органах, рэспубліканскіх органах дзяржаўнага кіравання, кантралюючых органах. Па іх выніках адменена больш як 3,5 тыс. незаконных актаў і адноўлены парушаныя правы грамадзян, узбуджана 388 крымінальных спраў. Па патрабаваннях пракуроў больш як 31 тыс. парушальнікаў законнасці прыцягнуты да дысцыплінарнай, матэрыяльнай і адміністрацыйнай адказнасці. Фізічнымі і юрыдычнымі асобамі ў пазасудовым парадку кампенсаваны нанесены іх дзеяннямі матэрыяльны ўрон у суме больш як Br105,5 млрд. Агульныя і гаспадарчыя суды задаволілі больш як 17 тыс. іскаў пракуроў і спагналі з вінаватых матэрыяльны ўрон у суме больш як Br205,5 млрд.

У 2007 годзе ў органах пракуратуры вырашана больш як 44 тыс. зваротаў грамадзян. У асноўным яны датычыліся парушэнняў працоўных, жыллёвых і іншых сацыяльных правоў, незаконнасці прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці, неправамерных рашэнняў органаў дазнання і папярэдняга следства. Кожны пяты зварот прызнаны абгрунтаваным, і па ім прыняты канкрэтныя меры па аднаўленню парушаных правоў грамадзян. На асабістым прыёме пракурорамі прынята больш як 47 тыс. грамадзян. Павысілася патрабавальнасць пракуроў да парушальнікаў заканадаўства аб зваротах грамадзян. Па выніках пракурорскіх праверак афіцыйна папярэджаны аб недапушчальнасці парушэння закона 292 службовыя асобы і больш як тысяча чалавек прыцягнуты да дысцыплінарнай і адміністрацыйнай адказнасці.

Асабліва значэнне надавалася рабоце следчага апарату органаў пракуратуры, удасканаленню яго дзейнасці. Завершана расследаванне больш як 4 тыс. крымінальных спраў, у тым ліку 826 спраў аб наўмысных забойствах.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Фота Анатоля КЛЕЩЧУКА.

ПАДНЯПРОЎСКАЯ ЦАЦКА — СІМВАЛ ДАБРАБЫТУ

Крычаўскі народны майстар-керамічст Вячаслаў Якавенка па адукацыі гісторык, ён выпускнік Белдзяржуніверсітэта, але праца над пластыкай малых формаў з гліны зрабіла яго вядомым майстрам Магілёўшчыны. Менавіта ён адрадзіў падняпроўскую гліняную цацку і свісцёлку.

— Прызванне прыйшло ад маёй бабулі, — кажа Вячаслаў Якавенка. — Яна рабіла забаўных жаўрукоў, размалёўвала, і мы разам «гукалі» вясну.

Майстар ганарыцца, што яшчэ застаў апошніх ганчароў Крычава, і лічыць сваім абавязкам адрадзіць тут цэнтр ганчарства і керамікі.

Першым Вячаслаў вынайшаў крык савы, лёгка дабіваецца на сваіх свісцёлках падабенства гуку лесу, вады, ветру. Напэўна, таму, што праз гліну, пра сакрэты яе гартавання ведае амаль усё.

— У нас тут розныя віды гліны — ахрыстая, цёмная, белая, зялёная і нават блакітная.

Яшчэ ён — паэт, мастацтвазнаўца, грыбнік і рыбак. І шмат гадоў кіруе дзіцячым народным калектывам дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Свісцёлка».

НОВЫЯ НАЗНАЧЭННІ

Прэзідэнт Беларусі назначыў Рыгора Васілевіча генеральным пракурорам Беларусі з далейшым узгадненнем яго назначэння з Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу.

Прэзідэнт Беларусі назначыў Пятра Міклашэвіча суддзёй і старшынёй Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, вызваліўшы яго ад пасады генеральнага пракурора з далейшым узгадненнем яго назначэння з Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнт Беларусі павіншаваў народнага артыста СССР Вячаслава Ціханава

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Героя Сацыялістычнай Працы, народнага артыста СССР Вячаслава Ціханава з 80-годдзем. «Вашы жыццё і лёс — гэта цэлая эпоха ў развіцці савецкага і расійскага кінематографа, — гаворыцца ў віншаванні. — За дзесяцігоддзі нястомнага творчага гарэння і плённай працы Вы стварылі шмат незабыўных вобразаў гераічных, мужных, моцных целам і духам людзей, сталі кумірам для мільёнаў гледачоў». У Беларусі, паводле слоў кіраўніка дзяржавы, творчасць Вячаслава Ціханава карыстаецца ўсенародным прызнаннем і любоўю.

Прэс-службa Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ФРАНЦЫЯ ПРЫНЯЛА КАНСТЫТУЦЫЙНЫ ДАГАВОР

Нацыянальны сход і Сенат Францыі падпісалі новы канстытуцыйны дагавор ЕС. Тым самым была вырашана крызісная сітуацыя, якая ўзнікла ў 2005 годзе пасля таго, як Францыя і Нідэрланды прагаласавалі супраць еўрапейскай канстытуцыі.

Для завяршэння фармальнасцяў дагавор павінен падпісаць прэзідэнт Францыі Нікаля Сарказі, які браў актыўны ўдзел у яго распрацоўцы. Такім чынам, Францыя стане пятай дзяржавай ЕС, якая падпісала «Лісабонскае пагадненне». Згодна з новым дакументам, які замяняе еўраканстытуцыю, будзе скарочана колькасць рашэнняў, што патрабуюць адзінадушнага адабрэння, значыць, радзей будзе выкарыстоўвацца права нацыянальнага вета. Акрамя таго, сатрэцца з памяці дзеючая сістэма краін-старшынь ЕС. Замест гэтага на два з паловай гады будзе абірацца прэзідэнт Еўрасаюза і прадстаўнік ЕС па замежных справах.

КАНДЫДАТ АД РЭСПУБЛІКАНЦАЎ: РАСІЮ ТРЭБА ВЫКЛЮЧЫЦЬ З G8

Трэба выпрацаваць адзіную лінію паводзінаў у дачыненні да Расіі, кіраўніцтва якой не хоча далучыцца да дэмакратычнага курсу на мір. «Вялікая васьмёрка» (G8) павінна зноў стаць клубам вядучых дэмакратычных дзяржаў з рынкавай эканомікай. Неабходна прыняць у G8 Індыю і Бразілію і выключыць адтуль Расію, заявіў Джон Макейн, сенатар штата Арызона і кандыдат у прэзідэнты ЗША ад Рэспубліканскай партыі.

Таксама, на яго думку, Еўропа і ЗША павінны павялічыць значнасць і скаардынаванасць праграм падтрымкі дэмакратыі. Нагадаем, Макейн зараз з'яўляецца лідарам прэзідэнцкай гонкі ў рэспубліканцаў.

УСТАНОЎЛЕНА ПРЫЧЫНА СМЕРЦІ БХУТА

Лідар пакістанскай апазіцыі Беназір Бхута загінула не ад кулі тэрарыста, а ад удару галавой аб машыну, калі яе адкінула выбуховай хваляй. Паводле The New York Times, гэта інфармацыя прыводзіцца ў справаздачы Скотланд-Ярда, прадастаўленай прэзідэнту Первезу Мушарафу.

Як удалося ўстанавіць экспертам, ні адзін са стрэлаў, зробленых тэрарыстам перад тым, як ён падарваў сябе, не дасягнуў мэты. Адна з куль зачапіла валасы і хустку Бхута. У той жа час прыхільнікі экспрэм'ера заявілі, што не прызнаюць вынікі расследавання Скотланд-Ярда. Яны працягваюць лічыць, што Бхута загінула ад кулі забойцы.

ПІЛОТАМ ВПС ІЗРАІЛЯ ПРАПІШУЦЬ «ВІЯГРУ»

Як устанавілі вучоныя, актыўныя элементы, што ўтрымліваюцца ў «Віягры», паляпшаюць дзеянні чалавечага арганізма ва ўмовах недахопу кіслароду.

Ізраільскія ваенныя ўрачы разглядаюць магчымасць выкарыстання «Віягры» пілотамі перад асабліва адказнымі заданнямі, якія патрабуюць павышанай увагі і дакладнасці дзеянняў.

ПАЛІЦЭЙСКІМ ЗАПЛАЦЯЦЬ ЗА ПАХУДЗЕННЕ

Улады мексіканскага горада Агуаскальентэс плануюць выплачваць паліцэйскім узнагароджанне за страту вагі.

Калі мэрыя станоўча вырашыць гэта пытанне, то паліцэйскія пачнуць атрымліваць па 100 песа (9 долараў) за кожны скінуты кілаграм. Улады горада тлумачаць такую ініцыятыву тым, што атлусценне вельмі шырока распаўсюджана сярод гарадскіх паліцэйскіх.

«ХАБАРНЫЯ» МАХЛЯРЫ

Даваць хабар — не толькі небяспечная справа (за гэтае злачынства прадугледжана крымінальная адказнасць), але і падчас марная трата ўласных грошай. У тым сэнсе, што існуе даволі вялікая верагоднасць трапіць на вуду прайдзісветаў, якія спецыялізуюцца на выманьванні і прысваенні карупцыйных грошай. Падрабязнасці некаторых крымінальных спраў такога кшталту агучвалі ў «Звязды» распаведзе начальнік следчага аддзела пракуратуры Мінска Сяргей ІВАНОЎ.

Антон Руткевіч (імёны і прозвішчы фігурантаў гэтай і іншых крымінальных спраў па вядомых прычынах зменены) трапіў у аддзяленне міліцыі выпадкова. Хлопца затрымалі ў дварэ ўласнага дома па падазрэнні ў гандлі наркотыкамі. І хоць ніякіх доказаў яго прыналежнасці да наркабізнэсу ў аператыўнікаў не было, Антона ўсё ж змясцілі ў камеру для «далейшай распрацоўкі». Там ён пазнаёміўся са Святаславам Шынкарэвічам. Пасля шчырай размовы з таварышам па няшчасці, Шынкарэвіч недвухсэнсава намякнуў, што ў яго ёсць уплывовыя знаёмыя ў праваахоўных органах, і прапанаваў Руткевічу свае паслугі ў вызваленні з-пад варты. За свабоду Антон павінен быў заплаціць 1 тысячу долараў. Хабар Шынкарэвіч абяцаў перадаць тым самым добрым збавіцелям. Руткевіч хоць і быў ні ў чым не вінаваты, чамусьці пагадзіўся на карупцыйныя ўмовы вызвалення і пакінуў спагадліваму сукамерніку кантакты тэлефон сваёй сяброўкі.

Неўзабаве міліцыянеры ва ўсім разабраліся і абодвух затрыманых адпусцілі. Аднак Антон думаў, што сваім вызваленнем ён абавязаны менавіта сувязям Шынкарэвіча. А той у хуткім часе з'явіўся па ўзнагароду. Руткевіч здолеў сабраць 800 долараў, астатнія 200 «зялёных» абяцаў аддаць пазней. Антон лічыў, што яго збавіцель дзейнічае разам з супрацоўнікамі міліцыі, таму пабаяўся новага арышту і папрасіўся пераначаваць у сваіх сяброў, якім шчыра ўсё распавёў. Сябры параілі Руткевічу звярнуцца ў праваахоўныя органы, каб тыя вывелі на чыстую воду вымагальніка хабару. Антон так і зрабіў. Праз некалькі дзён супрацоўнікі Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй МУС краіны арыштавалі Шынкарэвіча ў момант атрымання хабару ад Руткевіча. Як высветлілася, прайдзісвет дзейнічаў адзін. Ніякім міліцыянерам за вызваленне Антона ён і не збіраўся перадаваць грошы.

Муж і жонка Саркулян увогуле стварылі «дуэт» па выманванні хабару ў даверлівага бізнэсмена. Жонка працавала старшым тавараведам у сістэме сталовых аднаго буйнога беларускага прадпрыемства. Больш за тое, яна з'яўлялася сакратаром тэндарнай камісіі, якая павінна была выбраць пастаўшчыка сталовага посуду. Паколькі партыя посуду была даволі вялікая, то ахвотнікаў зарабіць на выгадным заказе было нямала. Аднаго з такіх прэтэндэнтаў муж старшага таваразнаўцам і падбухторыў заплаціць ганарар за выгадны заказ. «Адкат» ад кантракта склаў 700 долараў. Гэтыя грошы, паводле слоў Саркуляна, прызначаліся для ўлагоджвання кіруючых асобаў прадпрыемства, ад якіх у рэшце рэшт і залежала, каму прысудзіць перамогу ў тэндары. Насамрэч, «зялёныя» аселі ў кішэні старшага таваразнаўца. Больш за тое, неўзабаве аферысты звярнуліся да бізнэсмена і запатрабавалі яшчэ 700 «зялёных». У адваротным выпадку пагражалі скасаваць ранейшую дамоўленасць. Камерсант пагадзіўся. Між іншым, перадача хабару адбылася паблізу сталічнага Дома правасуддзя на вуліцы Сямашкі. Праз некаторы час «салодкая парачка» зноў прапанавала бізнэсмену свае пасрэдніцкія паслугі ў перадачы хабару ўплывовым асобам прадпрыемства. На гэты раз Саркулян абяцаў садзейнічанне ў заключэнні кантракта на пастаўку камплектуючых для аргтэхнікі агульным коштам 35 тысяч долараў. Але гэтая карупцыйная здзелка мела для Саркуляна сумны працяг: аферыста затрымалі супрацоўнікі праваахоўных органаў.

У дырэктара мінскай фірмы, якая займалася прыёмам шклатары, узніклі праблемы з аддзелам архітэктуры і будаўніцтва, а таксама з некаторымі іншымі службамі адміністрацыі аднаго з раёнаў сталіцы. Знаёмы параіў яму звярнуцца да свайго сябра, які займаў кіруючую пасаду ў гэтым самым выканкаме. Чыноўнік і сапраўды пагадзіўся дапамагчы. Зразумела, не бясплатна, а за 1 тысячу долараў. Бізнэсмену ён патлумачыў, што грошы бярэ не для сябе, а нібыта для перадачы іншым, больш уплывовым асобам, ад якіх і залежала станоўчае вырашэнне праблем. Напачатку чыноўнік атрымаў 400 долараў, а потым яшчэ 600. У момант перадачы апошняй «траншы хабару» яго і затрымалі супрацоўнікі праваахоўных органаў. Пазней высветлілася, што чыноўнік не збіраўся дзяліцца са сваімі калегамі, а проста прысвоіў палову сумы сабе, астатнюю перадаў сябру, які знайшоў яму «выгадны заказ». Зрэшты, сам карупцыянер апраўдваўся, што атрымаў ад удзячнага бізнэсмена ганарар за... карысную кансультацыю ў справе вырашэння яго праблем з мясцовай уладай. Гэта ў чарговы раз пацвярджае, што «хабарныя» махляры — людзі не проста хітрыя і спрытныя, але зазвычай добра юрыдычна падкаваныя. Яны — прафесіяналы свайго «злачыннага бізнэсу». Таму, паважаныя сугамадзяне, лепш не мець з імі справы: усё роўна падмануць. Свае праблемы трэба вырашаць законным шляхам.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

ПАЦУЧЫНАЯ ДЫВЕРСІЯ Ў БРЭСЦЕ

За суткі ў адным з мікрараёнаў Брэста спыніліся 36 ліфтаў. Прычына здарэння — пашкоджанне пацукамі абмоткі магнагажыльнага кабелю дыспетчарскай сувязі.

Усе ліфты, якія спыніліся, дастаткова хутка запусцілі. Прычыненая пацукамі шкода ацэньваецца прыкладна ў Br1 млн. На згаданым участку гэта ўжо трэцяе за апошнія два месяцы пашкоджанне кабеляў пацукамі.

БЕЛТА.

Мінскія кватэры працягваюць таннець

Усё мінулае лета ўласнікі сталічнага жылля чакалі псіхалагічнага буму на падаражанне кватэр восенню, а потым і зімой. Гэтага не адбылося, але гаспадары «лішніх» кватэр працягвалі трымаць высокія цэны на свой дарагі тавар ажно на працягу 8—9 месяцаў. Першая ластаўка патаннення кватэр на другасным рынку сталіцы рэальна «аб'явілася» ў снежні, калі загадзя стаў вядомы прымальны кошт для нашай краіны расійскай нафты і газу. Пасля амаль мёртвага святочнага сезона ў студзені, у пачатку лютага чакалася актывізацыя ўдзельнікаў рынку жыллёвай нерухомасці. Першая дэкада лютага прадэманстравала працяг трывалай тэндэнцыі сталічных кватэр на патанненне.

Самай дарагой катэгорыяй мінскага жылля застаюцца сёння аднапакаёвыя кватэры. Летась, у другой палове лістапада, квадратны метр агульнай плошчы аднапакаёвак прапанаваўся пакупнікам за 2100 долараў. Сёння «квадрат» такога жылля істотна патанneў, і сярэдні яго кошт складае 2044 долары, а сярэдняя цана прапановы аднапакаёвай кватэры вагаецца каля 71 тысячы долараў.

Разам з тым **старшыня савета Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ** падкрэсліў, што ў лютым сапраўды пачалі таннець не зусім якасныя кватэры менавіта ў старых дамах з «нулявой» планіроўкай і праблематычнай сантэхнікай. Так, цяпер нават у спецыялізаваных каталогах прапанова такіх неліквідных кватэр працягвае зніжацца даволі хуткімі тэмпамі. Сёння кватэры ў пяціпавярховых дамах з агульнай плошчай 30—34 квадратныя метры і кухнямі плошчай ад 5 да 7,2 квадратнага метра на першых ці апошніх паверхах каштуюць ужо не больш як 50—55 тысяч долараў. Пры рэальных здзелках гаспадары такіх «хрушчовак» усё актыўней пачынаюць згаджацца з сур'ёзнымі скідкамі, якія дасягаюць нават 3—6 тысяч долараў. У выніку кошт квадратнага метра неліквідных аднапакаёвак часам зніжаецца да 1700 долараў. Аднак эксперты рынку нерухомасці лічаць, што і такі кошт для зусім слабенькіх кватэр застаецца завышаным.

(Заканчэнне на 5-й стар.)

Прыватны юбілей з успамінамі пра агульную «Звязду»

Акурат перад гэтым інтэрв'ю колішняя стэнаграфістка «Звязды» Ніна Іванаўна Казармшчыкава збіралася ў цырульню: учора вечарам у банкетнай зале аднаго з мінскіх рэстаранаў яе чакала сустрэча з самымі блізкімі людзьмі, святкаванне ўласнага 85-годдзя.

— З цяперашніх «звяздоўцаў» мне пашчасціла працаваць з Яўгенам Пясецкім, з колішніх — з Анатолем Мясніковым, Уладзімірам Гойтанам...

— А хто першым павіншаваў вас сёння?

— Янка Казлоў! Я так хацела б, каб ён прыйшоў да мяне ў госці, але ён няважна сябе адчувае. Працаваў у «Звяздзе» адразу пасля вяртання з фронту. Памятаю, што быў загадчыкам аддзела. Яго фельетоны сапраўды ўпрыгожвалі газету, Янка — чалавек — з вялікім пачуццём гумару, пісаў цудоўна. Разам з жонкай размаўляў толькі па-беларуску. Мы дагэтуль падтрымліваем цесную сяброўскую сувязь.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

— Калі вы прыйшлі ў газету?

— 26 жніўня 1947 года...

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Гісторыя сучаснасці

ГАЎДЭАМУС, ЖУРФАК!

Упершыню ў гісторыі факультэт журналістыкі Белдзяржуніверсітэта — адзіная ў краіне журналісцкая alma-mater — атрымаў свой будынак, свой дом

Пра «свае сцены» восенню 1944 года марылі першыя студэнты факультэта журналістыкі. Зруйнаваны Мінск, яшчэ ідзе вайна — яны вучацца, працуюць, у вольны час адбудоўваюць горад. А збіраюцца разам — мараць з верай у будучыню.

Сёння мы з удзячнасцю схіляем галаву перад памяццю франтавіка прафесара Рыгора Булацкага, намаганнямі якога журфак набыў крылы.

Мы рады, што і цяпер з намі першыя выпускнікі журфака: франтавік прафесар Міхась Цікоцкі, прафесар Ефрасіння Бондарава, дацэнт Ніна Сніцарава... Менавіта яны закладвалі трывалыя журфакаўскія традыцыі, што ашчадна захоўвалі і творча развівалі сотні іх наступнікаў... На працягу дзесяцігоддзяў марылі і верылі: калісьці і ў журфака з'явіцца свой дом. Свой будынак.

І ён ёсць! І ён будзе!..

Гэты ўнікальны падарунак дзяржавы — прызнанне вялікай ролі журналістыкі ў грамадстве. Гэта падзея не толькі для студэнтаў і выкладчыкаў, але для ўсёй краіны.

...Яшчэ ў далёкім сярэднявеччы, са стварэннем першых універсітэтаў, з'явілася вясёлая студэнцкая песня «Гаўдэамус» (у перакладзе з лацінскай мовы — «будзем весяліцца, радавацца»). На працягу стагоддзяў гэта песня аб'ядноўвала студэнтаў усіх універсітэтаў, усіх краін, усіх эпох.

А для беларускіх журналістаў розных пакаленняў новыя сцены родных пенатаў — нібыта сімвал студэнцтва і маладосці, прафесійнай грунтоўнасці, кампетэнтнасці і сацыяльнай адказнасці.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Пра ўсё гэта мы падрабязна гутарым з дэканам факультэта журналістыкі БДУ Сяргеем ДУБОВІКАМ.

— Калі праязджаеш па Кальварыйскай і бачыш белы ўрачысты будынак-прыгажун, падобны на магутны карабель, — і залатыя літары на фасадзе: Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт... Скажу шчыра: сэрца перапаўняе пачуццё гонару за родны журфак, за сваю прафесію, за адносіны ўлады да адукацыі, да моладзі, да будучыні. Усе ведаюць: Беларусь — інтэлектуальна багатая краіна, якая дбае пра адукацыйна-творчы патэнцыял нацыі...

— Гэты будынак па аб'ёму, па плошчах не намнога саступае галоўнаму корпусу БДУ: 25600 кв. м.

Вялікі падарунак дзяржавы — ва ўсіх сэнсах!

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 08026>

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 9.02.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 148,00
1 еўра	3 111,81
1 латвійскі лат	4 468,48
1 літоўскі літ	901,31
1 чэшская крона	1213,47
1 польскі злоты	861,28
1 расійскі рубель	86,68
1 украінская грыўня	424,97

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	24,7813
10 UAH	48,6022
1000 BYR	11,561
EUR	35,8585

Курс у гандлёвых кампаніях (на 9.02.2008 г.)

USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

БЕЛАРУСБАНК 1922-2007 85 ЛЕТ

Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк»,

расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32, сообщает о проведении 14 февраля 2008 года внеочередного Общего собрания акционеров в заочной форме со следующей повесткой дня:

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.
2. Об утверждении Дополнения 1 к Положению о службе внутреннего аудита АСБ «Беларусбанк».

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 12 февраля), а также с решениями, принятыми внеочередным Общим собранием акционеров банка (после 14 февраля) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах — областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

Дата окончания приема бюллетеней — 11 февраля 2008 года.

Телефоны для справок: (8 017) 218 84 38, 218 84 04.

УНП 100325912.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводит открытый аукцион

по продаже: **Лот № 1**: здание столовой (об. пл. 841,0 кв.м), расположенное: г. Жодино, ул. 40 лет Октября, 5. Начальная цена (снижена на 20 %) — 161 738 598 белорусских рублей. Площадь земельного участка — 0,1667 га; **Лот № 2**: здание склада (кирпичное, об. пл. 143,1 кв.м), г. Жодино, ул. 40 лет Октября, 5А. Начальная цена (снижена на 20 %) — 30 949 277 белорусских рублей. Площадь земельного участка — 0,0617 га. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 27.11.2007 г. **Аукцион состоится 26.02.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321.** Заявления на участие и **необходимые документы принимаются по 25.02.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.**

Телефон (8017) 224 61 34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ СЁЛЕТА 100-ПРАЦЭНТНЫ АХОП НАСЕЛЬНІЦТВА МЕДАГЛЯДАМІ

— такая норма ўтрымліваецца ў загадзе, які падпісаў міністр аховы здароўя нашай краіны Васіль ЖАРКО.

Як паведамляла раней «Звязда», напрыканцы мінулага года Міністэрствам аховы здароўя была зацверджана пастанова і падпісаны адпаведны загад аб арганізацыі дыспансэрнага назірання дарослага насельніцтва. Згодна з падпісаным нядаўна міністрам загадам, да 15 лютага ва ўсіх паліклінічных установах краіны павінны быць створаны аддзяленні прафілактыкі, галоўнай задачай якіх будзе арганізацыя і правядзенне прафілактычных дыспансэрных аглядаў, ранняе выяўленне хворых і асобаў з фактарамі рызыкі неінфекцыйных захворванняў (артэрыяльнай гіпертэнзіі, ішэмічнай хваробы сэрца, цукровага дыябету, анкалагічных захворванняў) і туберкулёзу, а таксама прапаганда здаровага ладу жыцця. Распрацаваць і зацвердзіць службовыя абавязкі супрацоўнікаў аддзялення прафілактыкі павінны кіраўнікі арганізацый аховы здароўя. Да загада прыкладаецца таксама Прыкладнае палажэнне аб аддзяленні прафілактыкі паліклінікі, якім прадугледжана, што штатная колькасць аддзялення прафілактыкі будзе залежаць ад колькаснага складу насельніцтва, якое абслугоўваецца. Згодна з Палажэннем, аддзяленне прафілактыкі можа ўключаць: кабінет загадчыка аддзялення — урача-тэрапеўта, кабінеты ўрача ці памочніка ўрача (у залежнасці ад аб'ёму нагрузкі), даўрачэбныя кабінеты, дыспансэрны кабінет, назіральны жаночы і мужчынскі кабінеты, кабінет прапаганды здаровага ладу жыцця і кабінет імунапрафілактыкі.

Аддзяленні прафілактыкі павінны быць аснашчаны персанальнымі камп'ютарамі з адпаведным праграмным забеспячэннем, апаратамі для вымярэння артэрыяльнага ціску, табліцамі для вызначэння вастрыні зроку, партатыўным пераносным электракардыёграфам, аналізатарам для вызначэння экспрэс-метадам у крыві халестэрыну, партатыўным глюкометрам для вызначэння глюкозы ў крыві таксама экспрэс-метадам, вагамі, растометрам, табліцай для вызначэння індэксу масы цела, апаратам для вымярэння ўнутрывочнага ціску бескантактным і кантактным метадамі.

Аддзяленні прафілактыкі будуць займацца правядзеннем як індывідуальных кансультацый, так і групавых заняткаў з асобамі, якія маюць фактары рызыкі, арганізоўваць правядзенне заняткаў з пацыентамі ў школах здароўя.

— Адкрыццё аддзялення прафілактыкі, як мы спадзяёмся, дазволіць нам размежаваць у паліклініках патокі пацыентаў, — патлумачыла журналісту «Звязды» намеснік **начальніка ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Людміла ЖЫЛЕВІЧ**. — Участковыя тэрапеўты, асабліва ў сталіцы, сёння літаральна «задыхаюцца» ад вялікіх нагрузак. Таму, на нашу думку, будзе памылкай змешваць на прыёме тых, каму патрабуецца ўрачэбная дапамога, і тых, хто прыйшоў у паліклініку з прафілактычнымі мэтамі, інакш мы можам дабіцца негатыўнай рэакцыі з боку і першых, і другіх. Аддзяленні прафілактыкі павінны працаваць так, каб гэта было зручна людзям, якія таксама працуюць. Бо ад таго, наколькі візіт пройдзе ўдала, будзе залежаць вельмі шмат: ці ўсталюецца давер паміж пацыентам і медыцынскімі работнікамі, ці зможам мы выхаваць паважлівае стаўленне чалавека да свайго здароўя і ці прыйдзе ён да нас зноў з мэтай прафілактыкі.

А пасля першаснай ацэнкі стану здароўя прафілактычныя аддзяленні будуць размяркоўваць усіх пацыентаў на тры групы. Першая група — гэта цалкам здаровыя людзі (іх назіранне можна будзе ажыццяўляць адзін раз у два гады). Другая — практычна здаровыя, якія маюць пэўныя фактары рызыкі (яны будуць назірацца адзін раз у год). І трэцяя група — гэта хранічныя хворыя, якія будуць пастаўленыя на ўлік ва ўчастковага ўрача ці ў больш «вузкага» спецыяліста» .

Уся інфармацыя будзе штомесяц збірацца з прафілактычных аддзяленняў і перадавацца ў Міністэрства аховы здароўя і РНПЦ медтэхналогій, інфарматызацыі, кіравання і эканомікі аховы здароўя для ажыццяўлення маніторынгу і аналізу праведзеных прафілактычных даследаванняў. Вось так — крок за крокам — мы спадзёмся атрымаць поўную карціну стану здароўя беларусаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

У розных узроставых групах дыспансэрны агляд будзе ўключаць:

ад 18 да 29 гадоў: вымярэнне артэрыяльнага ціску, індэкса масы цела, агульны аналіз крыві і мачы, вымярэнне глюкозы ў крыві (па паказаннях), флюараграфію, агляд жанчын акушэр-гінеколагам (у тым ліку малочных залозаў);

ад 30 да 39 гадоў: вымярэнне артэрыяльнага ціску, індэкса масы цела, агульны аналіз крыві і мачы, глюкозы і халестэрыну ў крыві (пры наяўнасці паказанняў), ЭКГ, флюараграфію, агляд жанчын акушэр-гінеколагам (у тым ліку малочных залозаў);

пасля 40 гадоў: вымярэнне артэрыяльнага ціску, індэкса масы цела, агульны аналіз крыві і мачы, глюкозы і халестэрыну ў крыві, ацэнку рызыкі сардэчна-сасудзістых захворванняў па табліцы Skore, ЭКГ, вымярэнне ўнутрывочнага ціску, агляд жанчын акушэр-гінеколагам (у тым ліку малочных залозаў), даследаванне прастаты (для мужчын), флюараграфію.

Ва ўсіх узроставых групах будзе праводзіцца таксама анкетаванне для выяўлення фактараў рызыкі.

ГЛАБАЛЬНАЕ ПАЦЯПЛЕННЕ СЁЛЕТА ЗАМАРУДЗІЦЦА?

Мая старэйшая дачка, якой хутка споўніцца 11 гадоў, днямі пачала задаваць мне цікавыя пытанні. Чаму, напрыклад, апошні месяц года мае назву «снежань» (а снегу тады ўвогуле не было), што гэта за студзень, у якім яна толькі некалькі дзён насіла цёплы кажух? Пра люты ўвогуле няма гаворкі, а малая параіла называць яго «хлюпота». Калі я расказваў сваёй дачцэ, што ў маё дзяцінства сумёты былі вышэйшыя за мяне, то яна здзіўлена пыталася: «Няўжо, тата, ты жыў у ледавіковую эру?».

Так, насамрэч мы цяпер назіраем амаль самую моцную зімовую анамалію. **Начальнік аддзела клімату Рэспубліканскага гідраметцэнтра Алена КАМАРОЎСКАЯ** падлічыла, што па выніках двух зімовых месяцаў цяплейшым быў сезон толькі 89—90 гадоў таму. Калі прыняць на веру прагноз сіноптыкаў аб тым, што ў лютым моцных маразоў мы ўжо не ўбачым, то гэта зіма па цеплыні паб'е ў нашай краіне ўсе існуючыя рэкорды. Між іншым, менавіта 1989 год пакуль лічыцца самым цёплым, калі сярэднегадавая тэмпература была плюс 8 градусаў. Нагадаю, што сярэдняя па рэспубліцы тэмпература паветра за 2007 год склала плюс 7,8 градуса, што на 2 градусы вышэй за норму.

Пры падрыхтоўцы гадавога метэапрагнозу айчынныя спецыялісты выкарыстоўваюць інфармацыю Нацыянальнай метэаралагічнай службы Злучанага Каралеўства. **Начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ** паведаміў, што англійскія эксперты лічаць, што сёлета будзе халадней, чым у мінулыя гады, разам з тым гэты сезон павінен увайсці ў дзесятку самых цёплых гадоў.

Чакаецца, што глабальная тэмпература ў 2008 годзе будзе на 0,37 градуса вышэйшая за сярэднія паказчыкі, разлічаныя паводле інфармацыі сіноптыкаў у 1961—1990 гадах, і дасягне 14 градусаў. Гэта будзе самы халодны год пасля 2000 года, калі значэнне глабальнай тэмпературы перавысіла норму «толькі» на 0,24 градуса.

Між іншым, сусветныя эксперты ўпэўненыя: тое, што 2008 год хоць і чакаецца халаднейшым за мінулыя 7 гадоў, зусім не азначае, што глабальнае пацяпленне спынілася і пачнецца глабальнае пахаладанне. Гэта толькі часовае запавольванне хуткасці павелічэння глабальнай тэмпературы.

Дзмітрый Рабаў лічыць, што негатыўныя наступствы пацяплення клімату закрануць у нашай краіне найперш сельскагаспадарчы сектар. Анамальныя сінаптычныя з'явы могуць прывесці да паслаблення загартоўкі раслін, пагаршэння ўмоў зімоўкі культур пры рэзкіх перападах тэмператур, пашкоджання азімых культур ад вымакання, да гібелі ўсходаў ранніх пасеваў замаразкамі ў маі пасля вельмі цёплага красавіка. Праблематычна стане збіраць добрыя ўраджаі позніх гатункаў бульбы і гародніны. З іншага боку, важным плюсам пацяплення можа стаць істотная эканомія паліўна-энергетычных рэсурсаў у ацяпляльны перыяд. Ужо цяпер падлічана, што за апошнія гады ацяпляльны перыяд скараціўся прыкладна на 6—9 дзён.

Паводле слоў Дзмітрыя Рабава, галоўны мегаполіс краіны з'яўляецца крыху цяплейшай зонай у параўнанні з бліжэйшымі тэрыторыямі адпаведнай шыраты. Тут тэмпература паветра прыкладна на 2 градусы вышэйшая, чым у зоне суседніх тэрыторый і населеных пунктаў. Самымі «цёплымі» з'яўляюцца прамысловыя раёны, дзе ёсць вялікая загазаванасць або пастаянна выкідваюцца шкодныя рэчывы. Тэмпература паветра па раёнах адрозніваецца мінімум на 1—2 градусы.

Плошча сталіцы нашай краіны працягвае павялічвацца, таму ў межах горада існуе нават свая істотная разбежка па выпаданню ападкаў. У апошнія гады больш за астатнія тут залівае цэнтральныя раёны, галоўным чынам каля метро «Няміга». Спецыялісты зазначаюць, што за апошнія гады колькасць ападкаў у Мінску істотна павялічылася менавіта ў летнія месяцы. У апошнія гады ў Мінску стаў назірацца яшчэ адзін феномен вялікага горада — моцныя зімовыя і восеньскія туманы і смог у бязветранае надвор'е.

Сяргей КУРКАЧ.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Напружаная абстаноўка на праспекце Незалежнасці ў лютаўскі туман.

У аварыі загінулі трое

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзеле інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, аварыя адбылася вечарам у чацвер на сталічнай вуліцы Маскоўская. Тут напачатку дзесятай гадзіны сутыкнуліся машына БМВ і тралейбус, якія ехалі ў спадарожным напрамку: першы аўтамабіль пасля ўдару адкінула з праезнай часткі і ён уехаў у дрэва. Як высветлілася, легкавым аўто кіраваў 44-гадовы грамадзянін Расіі, а ў салоне акрамя вадзіцеля знаходзіліся яшчэ два пасажыры — начальнік і намеснік начальніка аддзела адной з вайсковых часцей. У выніку ДТЗ расіянін і двое яго пасажыраў загінулі. Пацярпела і 34-гадовая пасажырка тралейбуса, якая з закрытай чэрапна-мазгавой траўмай сярэдняй цяжкасці была змешчана ў 10-ю гарадскую клінічную бальніцу.

Ігар ГРЫШЫН.

Немаўля пакінулі без дапамогі...

Трохмесячны хлопчык загінуў ад чэрапна-мазгавой траўмы.

Як паведаміла карэспандэнту «Звязды» прэс-афіцэр Заводскага РУУС Анжаліка Гурыновіч, здарэнне зафіксавана ў кватэры аднаго з дамоў па вуліцы Несцерава: адсюль і паступіў трывожны званок у «хуткую дапамогу» ад 26-гадовай жанчыны, якая знаходзіцца ў дэкрэтным водпуску па доглядзе дзіцяці. Праваахоўнікамі было ўстаноўлена, што 30 студзеня маці ад'язжала з дому і на час пакінула немаўля са сваім сужыцелем. У нейкі момант хлопчык, які ляжаў на канапе, выпадкова ўпаў з яе і стукнуўся галавой — на месцы ўдару з'явіўся сіняк. Жанчына ж, вярнуўшыся дадому, аб інцыдэнце даведалася, аднак своечасова звярталася па кансультацыю да медыкаў не стала...

Ігар ГРЫШЫН.

16 намінацый «Лепшага прадпрымальніка года»

З мэтай павышэння прафесіяналізму і дзелавой рэпутацыі кіраўнікоў і калектываў прадпрымальніцкіх структур, каб стварыць станоўчы імідж прадпрымальніка і стымуляваць дзелавую актыўнасць насельніцтва для вырашэння задач сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны Мінэканомікі аб'явіла аб правядзенні конкурсу «Лепшы прадпрымальнік 2007 года».

Конкурс, як адзначаюць у міністэрстве, праводзіцца па выніках фінансава-гаспадарчай дзейнасці юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў за 2007 каляндарны год. Праходзіць ён будзе па 16 намінацыях: «Лепшы прадпрымальнік у сферы вытворчасці спажывецкіх тавараў», «Лепшы прадпрымальнік у сферы вытворчасці прадуктаў харчавання», «Лепшы прадпрымальнік у сферы вытворчасці тавараў прамысловага прызначэння», «Лепшы прадпрымальнік у сферы будаўнічай дзейнасці», «Лепшы прадпрымальнік у сферы грамадскага харчавання», «Лепшы прадпрымальнік у сферы аптовага і рознічнага гандлю», «Лепшы прадпрымальнік у сферы медыцынскай дзейнасці», «Лепшы прадпрымальнік — арганізацыя з замежнымі інвестыцыямі», «Лепшая сялянская (фермерская) гаспадарка», «Лепшы прадпрымальнік у сферы аказання паслуг», «Лепшы прадпрымальнік у сферы аказання фізкультурна-аздараўленчых паслуг», «Лепшы прадпрымальнік у сферы турызму», «Лепшы суб'ект інфраструктуры падтрымкі і развіцця прадпрымальніцтва», «Лепшы прадпрымальнік-экспарцёр» і «Лепшы банк па аказанні паслуг прадпрымальнікам».

У конкурсе бяруць удзел юрыдычныя асобы і індывідуальныя прадпрымальнікі — пераможцы і лаўрэаты абласных (Мінскага гарадскога) конкурсаў «Лепшы прадпрымальнік года вобласці (г. Мінска)» за справаздачны перыяд. Каб удзельнічаць у абласным (Мінскім гарадскім) конкурсах, юрыдычныя асобы і індывідуальныя прадпрымальнікі да 10 сакавіка гэтага года падаюць у абласныя (Мінскі гарвыканкам) па месцы рэгістрацыі заяўку, а таксама іншыя дакументы, што вызначаны Палажэннем аб парадку правядзення конкурсу «Лепшы прадпрымальнік вобласці (г. Мінска)», зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 15 верасня 2005 года № 1024 (у рэдакцыі пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 31 мая 2007 года № 728).

У Мінэканомікі падкрэсліваюць, што пераможцы і лаўрэаты конкурсу вызначаюцца Прэзідэнтам нашай краіны. Пераможцы ўзнагароджваюцца нагрудным знакам «Лепшы прадпрымальнік года», дыпломам і прызам, а лаўрэаты — дыпломам «Лаўрэат конкурсу «Лепшы прадпрымальнік года». Між іншым, удзельнік конкурсу, які прызнаны трэці раз запар пераможцам, адначасова ўзнагароджваецца і дыпломам «Ганаровы прадпрымальнік».

Ігар ГРЫШЫН.

Рэканструкцыя дома: па закону і па сумленню

Зварот у карпункт

«Я — Валянціна Паўлаўна Логінава. Жыву ў вёсцы Арэшанкі Віцебскага раёна. Падпісчыца «Звязды» з вялікім стажам. Цяжкая жыццёвая сітуацыя ў майго малодшага сына Івана. Ён з жонкай жыў у Віцебску ў прыватным сектары. У іх двое маленькіх дзяцей: Сярожу 2,6 года, Арцёму толькі 5 месяцаў. Праблема ў наступным. Яны пажадалі рэканструяваць і адрамантаваць частку дома, дзе жывуць разам з суседкай. Апошняя спачатку дала дазвол, а потым перадумала. Пайшоў паток скаргаў. Нават была пагроза штрафам. Што рабіць?»

Згодна з данымі тэхнічнага пашпарта жонка Івана — Наталля набыла меншую частку дома ў ліставадзе 2003-га.

— Рамонт быў проста неабходны, — расказвае Наталля. — Наша палова знаходзілася ў аварыйным стане. У двух пакоях працякалі столі. У адным з так званых «глухіх» пакояў была неабходнасць «выразаць» акно, бо там заўсёды цемра, а ў нас маленькае дзіця. Зараз ужо два. Хацелі дах змяніць — зрабіць яго двухскатным. Гэта б дазволіла павысіць вышыню столяў, што не перавышала 1,8 метра. Спачатку мы з мужам звярталіся ў аддзел архітэктуры і гарадабудаўніцтва гарвыканкама, каб атрымаць афіцыйны дазвол. Але там нам растлумачылі, што з красавіка 2007 года трэба атрымаць пісьмовую згоду суседзяў...

— Калі я папрасіў суседку аб такой паслузе, яна адзначыла, што дах на яе баку добры, — расказвае Іван Логінаў. — Аказалася, што суседка — не гаспадар, а проста там жыве. А валодае паловай дома яе пляменніца, якая жыве ў Мінску. Мы звязаліся з ёй, і яна пабяцала прыехаць, абмеркаваць усё. Але не прыехала...

Выходзіць, што фактычна закон парушаны. Але ўявіце сябе ў такім становішчы: жыллё ў аварыйным стане, з родным дзіцем ды і з вамі з-за гэтага могуць адбыцца непрыемнасці. Дапамагчы маладым бацькам стараліся многія. Звярталіся яны па дапамогу і да дэпутата Нацыянальнага сходу. Прыязджалі на месца адказныя прадстаўнікі адміністрацыі Першамайскага раёна Віцебска. У выніку рэкамендавалі аформіць усе неабходныя дакументы, як таго патрабуе закон. У карпункце ёсць копіі афіцыйных адказаў, падобныя адзін да другога, сэнс якіх адзін: патрэбны дазвол саўладальніка жылля.

Іван і Наталля і іх дзеці цяпер фактычна не маюць асабістага даху над галавой: вымушаны жыць у свякоўі ў вёсцы Камары Віцебскага раёна. Зняць жыллё? Няма на гэта грошай, ды і адкуль, калі Наталля ў дэкрэтным водпуску, а муж яе зарабляе няшмат — просты рабочы. Часовае жыллё, той жа інтэрнат улады не прапануюць. Мо і сапраўды ёсць абгрунтаваныя прычыны для адказу? Праўда, паставілі на ўлік для паляпшэння жыллёвых умоў, але, калі яны атрымаюць кватэру, зноў жа не задарма.

Атрымліваецца нейкае замкнутае кола. Ужо год ходзяць па інстанцыях і атрымліваюць адмоўныя адказы. Ну, не дае згоду саўладальнік дома, і што тут зробіш? Па закону мае на гэта права, а па сумленню?

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Прыватны юбілей...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У мяне за плячыма былі толькі 10 класаў... Я ж у 17 гадоў, перад вайной, выйшла замуж. Закахалася, як гэта бывае ў такім узросце і выйшла замуж. За пагранічніка, афіцэра. Мы паехалі з ім на мяжу Гродзенскай вобласці, дзе нас і застала вайна. І ў няпоўныя 19-ць я стала ўдавой з маленькім дзіцем на руках... Мама з сястрой працавалі ў шпіталях, а я жыла ў грамадзянскім лагеры пры партызанскім атрадзе. Каб вывесці людзей з блакады, партызаны падзялялі ўсіх на дробныя групы, але ніхто не хацеў браць мяне з дзіцем. Я ж часта наведвалася да маці і сястры, і адзін са шпіталізаваных — сібірак — прывязваўся да маёй дачкі. Калі яго прызначылі кіраўніком адной з груп, якая павінна была ісці на прарыў блакады, то пагадзіўся ўзяць нас з дзіцем, але пры адной умове: той, хто будзе ісці з маленькай Томачкай, будзе ісці апошнім. Гэта была мая мама... На адным небяспечным участку па атрадзе стралялі немцы. Калі мы вырваліся, я заўважыла, што няма ні мамы, ні дачкі... Пасля высветлілася, што мама тры дні хадзіла па лесе, ела заячую капусту, нарвалася на акупантаў, якія завезлі яе ў гарнізон, распытвалі, хто яна і адкуль. Ёй удалося ўцячы. Маці пайшла да сялян з бліжэйшай вёскі. Мы сустрэліся з ёй і дачкой пасля вызвалення Мінска.

— Пасля вайны работа ў «Звяздзе» стала вашым першым працоўным заняткам?

— Я прачытала аб'яву аб наборы на курсы стэнаграфіі. На іх я сустрэла колішняга свайго знаёмага Сідара Аляксеевіча Конанава. Каб я засталася працаваць у «Звяздзе», мяне ўзялі падчытчыцай у карэктуру, пасля перавялі ў радыстку, а па заканчэнні курсаў пакінулі стэнаграфісткай. Конанаў, загадчык аддзела партыйнага жыцця, быў маім начальнікам. Я нічога спачатку не друкавала. Усё, што прымала ад карэспандэнтаў з абласцей, дыктавала машыністкам. А Конанаў сказаў, што трэба вучыцца самой друкаваць, і я пачала вучыцца. І беларускую мову вучыла, канешне. Адпрацавала ў «Звяздзе» 33 гады, мяркую, гэта былі лепшыя гады, з якімі звязаны самыя светлыя ўспаміны. Пасля 10 гадоў была перакладчыцай у часопісе «На экранах Беларусі». А ў 1990-м спыніла працоўную дзейнасць.

— Як вы плануеце адзначыць сваю важкую дату?

— Мая ўнучка Лена Спірыдовіч сказала: «Мы з Юрам — (з мужам, значыць), вырашылі адзначыць твой дзень нараджэння не дома». Я пачала адмаўляцца... Леначка сказала, што нават калі гэта не патрэбна мне, то «патрэбна нам». І зняла банкетную залу, дзе збярэцца толькі самыя блізкія. Пляменнік, дачка з мужам, унучка з мужам. Дачка мая, дарэчы, 38 гадоў адпрацавала на тэлебачанні — памочнікам рэжысёра, асістэнтам рэжысёра і рэжысёрам. Апошнія 10 гадоў Тамара Барысёнак — дырэктар на тэлерадыёкампаніі «Мир».

— Прыміце, калі ласка, з нагоды вашага юбілею самыя цёплыя пажаданні ад усяго калектыву рэдакцыі газеты «Звязда».

— Дзякуй вялікі! Мне вельмі прыемна...

Гутарыла Святлана БАРЫСЕНКА.

ГАЎДЭАМУС, ЖУРФАК!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Лёс новага будынка-«карабля» досыць няпросты...

— Сапраўды. Ён пачаў узводзіцца яшчэ ў савецкі час для буйнога навукова-вытворчага аб'яднання. Потым перабудоўчана-постперабудоўчая мітусня... У сярэдзіне 1990-ых гэты «недабуд» перадалі Белдзяржуніверсітэту, было прынята рашэнне размясціць на Кальварыйскай факультэт журналістыкі. У 2006 годзе аб'ект пад пільны кантроль узяло Міністэрства адукацыі краіны, былі ўкладзены значныя сродкі. Будаваўся корпус па праекце УП «Мінскпраект», фінансаванне ішло з рэспубліканскага бюджэту ў межах дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы. Толькі за апошнія два гады на рэалізацыю праекта было выдзелена больш як 50 мільярдаў рублёў.

З адкрыццём новага будынка журфака створаны ўсе ўмовы для падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў. У корпусе не толькі вучэбныя аўдыторыі, тэлецэнтр, выдавецкая і іншыя вытворчыя лабараторыі, выдатна абсталяваная актавая зала, але і сучасная бібліятэка, дзе сабраны тысячы тамоў кніг па журналістыцы і іншых грамадскіх накірунках. Прасторная газетная зала, дзе студэнтам будзе зручна працаваць з падшыўкамі газет. Дзве спартыўныя залы трэнажорнага тыпу (сілавой падрыхтоўкі і аэробікі).

Тут жа, на Кальварыйскай, будуць праходзіць заняткі па фізкультуры — нашым студэнтам ужо не трэба будзе ездзіць у спартзалы на іншыя факультэты, і гэта стварае добрыя магчымасці для навучання.

— А для студэнта, што немалаважна, велізарная эканомія часу!

— Вы ж успомніце і свае студэнцкія гады: дарога на фізкультуру проста «даставала» (выбачайце за студэнцкі слэнг), бо за кароткі час трэба праехаць ледзь не палову Мінска, каб трапіць у спартзалу. У тым ліку і па гэтай прычыне было нямала пропускаў фізкультуры — і гэта давала падставу для дзіўных размоў пра быццам бы «неспартыўнасць» журфакаўцаў... Так што для падтрымання здароўя, добрай фізічнай формы, для занятку спортам у нашых студэнтаў сёння ёсць усе належныя ўмовы.

— Чарговае пытанне задаю па просьбе іншагародніх студэнтаў, якія жывуць у інтэрнаце ў Шчомысліцах. Аўтобус № 47, які адпраўляецца з філіяла БДУ, быў вельмі зручным. Зараз «транспартных» турбот значна больш...

— Мы ўжо працуем над тым, каб стварыць максімальныя транспартныя зручнасці для студэнтаў. Паколькі я з'яўляюся дэпутатам Мінскага гарсавета — а студэнцкія інтэрнаты філіяла БДУ якраз увахо-дзяць у маю акругу, — буду садзейнічаць арганізацыі бесперасадачнага праезду студэнтаў на вучобу. Гэта сённяшні мой клопат. Мяркую, і кіраўніцтва горада, і аўтатранспартныя прадпрыемствы пойдуць насустрач: гэта агульная задача.

Кіраўніцтва БДУ накіравала ліст на імя старшыні Мінгарвыканкама з просьбай надаць назву прыпынку грамадскага наземнага транспарту «Факультэт журналістыкі». Прынцыповая згода атрымана. Хутчэй за ўсё, прыпынак будзе мець двайное найменне, па прыкладу «Плошча Незалежнасці — гандлёвы цэнтр «Сталіца».

— Сяргей Валянцінавіч, не магу не задаць пытанне з разраду «па чутках і кампетэнтна». Корпус пачаў узводзіцца яшчэ ў эпоху СССР. «Даўгабуд!» — гучала на працягу многіх гадоў ледзь не як прысуд (спёка—дажджы—маразы...). Вось і ўзнікаюць асцярожныя пытанні наконт бяспекі.

— І гэтыя пытанні поўнасцю зняты адпаведнымі службамі. Перш чым пачалі актыўна будаваць-дабудоўваць гэты прыгожы велічны будынак, спецыялісты, якія адказваюць за бяспеку будаўніцтва, грунтоўна вывучылі стан «каробкі». Былі праведзены значныя работы па ўмацаванні нясучых канструкцый, лесвічных праёмаў, ліфтавых шахтаў і г.д. Камісія, якая прымала рашэнне аб пачатку актыўнага будаўніцтва, прыйшла да высновы, што будынак гатовы да завяршэння будаўніцтва і далейшай эксплуатацыі.

— У журфака ёсць суседзі па будынку — факультэт філасофіі і сацыяльных навук. Напэўна, гэта лагічна, паколькі журналістыка — не толькі сацыяльная практыка, але і сацыяльная навука?

— Несумненна. Я рад, што пабач будзе менавіта ФФСН, які таксама рыхтуе інтэлектуальную эліту грамадства. Філасофія, сацыялогія, псіхалогія — гэта тое, што, як паветра, неабходна сучаснаму журналісту. Філасофскія веды спрыяюць глыбокай публіцыстычнай рэфлексіі паводле рэчаіснасці, псіхалагічныя — заглыбленню ва ўнутраны свет герояў журналісцкіх твораў. А сацыялогію і ўвогуле можна назваць адным з інструментаў эфектыўнай дзейнасці СМІ.

— Згодна з класічнымі канонамі журналістыкі, форма і змест павінны быць узаемаадпаведнымі. Істотна змянілася форма факультэта журналістыкі — гэта непазбежна паўплывае і на змест навучання, на адукацыйна-творчыя перспектывы?

— Пытанне, як вы самі разумееце, рытарычнае. Атрымаўшы такі неацэнны падарунак ад дзяржавы, пра які некалькі пакаленняў журналістаў толькі марылі — і які ўвесь час ім толькі абяцалі: вось-вось журфак атрымае свой будынак... Дзякуючы сённяшняму кіраўніцтву краіны, гэта ўсё спраўдзілася. Журфак атрымаў такія плошчы, такія магчымасці для заняткаў, якіх няма ў большасці факультэтаў БДУ. Дый ні ў адной рэспубліцы былога СССР падобных умоў для падрыхтоўкі журналістаў не стварана.

Мы гэта выдатна разумеем і, натуральна, будзем форму напаўняць адпаведным зместам.

Неабходна значна павысіць якасць падрыхтоўкі журналістаў. Мы павінны выпускаць ужо не «паўфабрыкаты» — людзей, якіх трэба яшчэ пару гадоў «даводзіць» у рэдакцыях, непасрэдна на рабочых месцах...

—... і за гэта нярэдка крытыкавалі журфак.

— Будзем выпускаць спецыялістаў, якія літаральна за некалькі месяцаў змогуць адаптавацца да журналісцкай вытворчасці і працаваць нароўні са сталымі, вопытнымі журналістамі. Удасканальваюцца вучэбныя праграмы, уключаецца ў іх найбольш запатрабаваная тэматыка. Формула плённай журналісцкай адукацыі: гарманічны сплаў тэорыі і практыкі. Гэта і дапаможа нашым студэнтам за 5 гадоў навучання максімальна падрыхтавацца да будучай прафесіі.

Журфак адчувае велізарную меру адказнасці. Разам з тым падрыхтоўка журналісцкіх кадраў — задача не толькі штатных выкладчыкаў, але і агульная карпаратыўная мэта. Заўсёды насустрач нам ідзе Міністэрства інфармацыі краіны. Іноднымі кіраўнік рэспубліканскіх СМІ таксама ніколі не адмовіў у дапамозе. Многія таленавітыя, вопытныя, высокакваліфікаваныя журналісты працуюць на журфаку сумяшчальнікамі.

Як будучага ўрача можа навучыць толькі прафесійны ўрач, так і будучага журналіста — толькі выкладчык-журналіст. Гэта крэда журфака.

На працягу ўсіх гадоў вучобы студэнты праходзяць практыку ў СМІ — прычым рэдакцыі просяць: дашліце больш студэнтаў на практыку! Ужо з 3-га курса многія журфакаўцы стала ўваходзяць у рэдакцыйныя калектывы. Менавіта з такой формы супрацоўніцтва пачынала, напрыклад, і значная частка сённяшніх звяздоўцаў. Дый цяпер у вашай газеце плённа сумяшчаюць вучобу з творчасцю Надзея Дрыла, Ала Мачалава, Павел Бераснеў, Марына Бегункова, іншыя студэнты.

Запатрабаванасць выпускнікоў журфака вельмі вялікая, прычым не толькі ў Беларусі. Тыя, хто па розных жыццёвых абставінах пераязджаюць у Маскву, Пецярбург, Кіеў, іншыя гарады, — таксама паспяхова працуюць у самых уплывовых выданнях, на тэле- і радыёканалах. Павага да дыплома беларускага журфака нязменна высокая.

Назіраецца і наступная тэндэнцыя: многія выпускнікі расійскіх школ імкнуцца паступіць менавіта на журфак БДУ.

— Журфак рыхтуе кадры па пяці спецыяльнасцях: друкаваныя і аўдыёвізуальныя СМІ, міжнародная журналістыка, інфармацыя і камунікацыя, літаратурная работа. Але гэта не мяжа?

— Так, мы ідзём у нагу з часам. З верасня 2008 года журфак пачынае падрыхтоўку студэнтаў яшчэ па адной спецыяльнасці — вэб-журналістыка. Для яе ўжо выдзелена 10 бюджэтных месцаў. Мяркую, будуць ахвотнікі навучацца па гэтай спецыяльнасці і на платнай аснове. Прафесіяналаў для інтэрнэт-СМІ сёння ніхто не рыхтуе. Дарэчы, спецыяльнасць «вэб-журналістыка» пакуль не адкрыта на журфаках Расіі, Украіны — тут мы ідзём у авангардзе. Калегі з блізкага замежжа будуць арыентавацца на журфак БДУ.

— Кожны курс студэнтаў-газетчыкаў выпускае вучэбныя газеты...

— Само жыццё патрабуе істотнага павышэння і якасці студэнцкіх вучэбных газет. Каб яны былі запатрабаванымі не толькі ў групе, на курсе, на факультэце — а значыць, каб утрымлівалі цікавую эксклюзіўную інфармацыю, узнімалі актуальныя тэмы, не абыходзілі і праблемныя пытанні. Адпаведна, яны становяцца і больш тыражнымі. Не 30 экземпляраў, як раней, а значна больш — з улікам, што журфакаўскія вучэбныя газеты будуць чытаць і на іншых факультэтах.

— Гэта рэальная?

— Наша выдавецкая лабараторыя сур'ёзна ўмацоўваецца. Запускаецца новы размнажальны цэх, паступіла адпаведная сучасная тэхніка.

— А калі гаварыць пра будучых тэлевізіёншчыкаў і радыйшчыкаў?

— Магу смела сказаць: магчымасці журфакаўскага тэлецэнтра неабмежаваныя. Прынамсі, на яго базе плануецца стварыць адукацыйны тэлеканал. Многае, вядома ж, будзе залежаць ад фінансавання: усё-такі новы тэлеканал — дарагое задавальненне. Толькі тэхнічных работнікаў, якія будуць абслугоўваць тэхніку тэлецэнтра, неабходна каля 40 чалавек. Прычым гэта павінны быць спецыялісты, якія маюць добрую адпаведную падрыхтоўку. Не меншы штат патрабуецца і для арганізацыі творчага працэсу. Такім чынам, як мінімум 100 чалавек павінны займацца работай на адукацыйным тэлеканале.

Студэнты будуць непасрэдна супрацоўнічаць з прафесіяналамі тэлеканала і вучыцца ўсяму: ад здымачнага працэсу і апрацоўкі матэрыялу пры дапамозе камп'ютарнай графікі да выпуску канчатковай прадукцыі. Акрамя таго, у нас плённа працуе эксперыментальнае маладзёжнае творчае тэлерадыёаб'яднанне (ЭМТТРА), якое арганізавана на журфаку па даручэнні. Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Ужо напрацаваны пэўны вопыт, падрыхтаваны шэраг тэлеперадач, якія выйшлі ў эфір Першага нацыянальнага тэлеканала. Выкарыстоўваючы магчымасці тэлецэнтра і ЭМТТРА, аптымальна арганізуем навучальную работу па падрыхтоўцы спецыялістаў для аўдыёвізуальных СМІ.

— Журфак працуе не толькі са студэнтамі?

— Яшчэ адзін накірунак дзейнасці — павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўка журналісцкіх кадраў. На жаль, у нашай галіне адсутнічае гэтая «надбудоўчая» сістэма, хоць неабходнасць у ёй востра адчувальная. І вось чаму. У раённых газетах краіны працуе каля 40 працэнтаў карэспандэнтаў, якія не маюць базавай журналісцкай адукацыі, — па асноўнай прафесіі гэта настаўнікі, інжынеры, аграномы і г.д. Аднак умець напісаць заметку для райгазеты — яшчэ не значыць быць журналістам. Да нас пастаянна паступаюць просьбы, прапановы дапамагчы гэтай катэгорыі супрацоўнікаў (пераважна рэгіянальнай прэсы) атрымаць журналісцкую адукацыю.

— Але ж, згодна з заканадаўствам, толькі адну вышэйшую адукацыю можна атрымаць на бюджэтнай аснове, другая — платная?

— Гэта і стрымлівае нашых патэнцыяльных студэнтаў. Відавочна: у імя істотнага павышэння якасці рэгіянальнага друку варта адшукаць аптымальныя варыянты навучання для штатных супрацоўнікаў СМІ, якія не маюць базавай журналісцкай адукацыі. Арганізуем падрыхтоўку журналістаў на базе вышэйшай адукац

Краіна здароўя

Выпуск № 7 (63)

Інфарм-укол

БЕЗ ЦІКАВАСЦІ ДА ЖЫЦЦЯ

Нямецкія псіхолагі мяркуюць, што падрабязнае абмеркаванне праблем з равеснікамі павышае рызыку дэпрэсіі ў дзяўчат падлеткавага ўзросту.

У апошні час бацькі дзяўчат-падлеткаў усё часцей звяртаюцца па дапамогу да псіхолагаў: дзяўчаты ва ўзросце 14—17 гадоў сустракаюць цікавасць да жыцця, праяўляюць дэпрэсіўны настрой. Спецыяльнае даследаванне паказала, што ў дзяўчат, якія шмат абмяркоўваюць з сяброўкамі праблемы, застаецца надта мала сіл і часу на больш карысныя заняткі, якія маглі б узняць ім настрой. А вось хлопцы, якія абмяркоўваюць свае праблемы з сябрамі, радзей пакутуюць ад дэпрэсіі. Прычына ў тым, што дзяўчынкі больш схільныя прымаць чужыя праблемы блізка да сэрца і адчуваць асабістую адказнасць за іншых.

Між тым, вучоныя нагадваюць аб неабходнасці адрознення стрэсу ад дэпрэсіі, паколькі гэтыя станы патрабуюць рознага лячэння. Калі чалавек адчувае нервовасць, раздражненне і гатовы сарвацца, значыць, ён знаходзіцца ў стрэсавым стане. У гэтым выпадку могуць дапамагчы прэпараты з экстрактамі мяты, мелісы і валяр'яну. Пры дэпрэсіі чалавек перажывае прыгнечанасць, хранічную стомленасць і эмацыянальнае знясіленне. Яму неабходны прэпараты, здольныя палепшыць стан нервовай сістэмы. Сярод лекавых траў такім дзеяннем вылучаецца зверабой.

Класічную дэпрэсію можна западозрыць па наступных прыкметах:

- падаўлены настрой на працягу большай часткі дня і амаль штодня;
- страта цікавасці або пачуцця задавальнення;
- значнае зніжэнне або павелічэнне вагі, змяненне апетыту;
- бяссонніца або санлівасць;
- узбуджэнне або затарможанасць;
- стомленасць або ўпадак сіл;
- адчуванне ўласнай непатрэбнасці або неабгрунтаваныя ідэі вінаватасці;
- зніжэнне здольнасці да мыслення, канцэнтрацыі ўвагі і прыняццю рашэнняў;
- думкі пра смерць, суіцыдальны намер ці спроба.

Дэпрэсію-хваробу варта адрозніваць ад нармальнай рэакцыі чалавека на пэўныя адмоўныя падзеі. Захворванне валодае высокай інтэнсіўнасцю, працягласцю і прыводзіць да з'яўлення спецыфічных сімптомаў, пералічаных вышэй. У развіцці дэпрэсіі бяруць удзел як біялагічныя, так і псіхалагічныя фактары, таму ўрачы спалучаюць падчас лячэння медыкаментознае і псіхатэрапеўтычнае лячэнне. Псіхатэрапія дапамагае таму, каб захворванне не вярнулася пасля адмены прэпаратаў.

Прыгожае даўгалецце

ЦЕЛА+ДУША+РОЗУМ=100 ГАДОЎ

Асноўнай умовай працяглага жыцця з'яўляецца гармонія цела, душы і розуму — гэткая відавочная і... амаль недасягальная для вельмі многіх з нас.

Сапраўды, немагчыма пералічыць пару-тройку мерапрыемстваў, здольных прадоўжыць жыццё ўсім і кожнаму. Прычым прадоўжыць якасна. Нездарма спецыялісты заўсёды збіваюцца з канкрэтных парад на пажаданні змяніць лад жыцця ў цэлым. Іншымі словамі, мы павінны клапаціцца пра задавальненне патрэб не толькі цела, але і розуму, душы і пачуццяў. У адваротным выпадку нават фізічна здаровы ад прыроды чалавек вельмі хутка пачне «здаваць» і пакутаваць ад шматлікіх расстройстваў у рабоце самых розных органаў і сістэм.

У падмурку прыгожага даўгалецця хаваецца, несумненна, здароўе (здаровым, як кажуць, ніхто не памірае), але здароўя фізічнага абсалютна не дастаткова. Гаворка ідзе пра гарманічнае суіснаванне духоўнага і цялеснага. Наколькі трывалым будзе гэты саюз, залежыць ад кожнага з нас, ад тых намаганняў, якія мы прыкладзём для дасягнення высокай мэты. Наступныя рэкамендацыі памогуць стаць на правільны шлях, а калі вы ўсё яшчэ знаходзіцеся ў нерашучасці, падумайце аб тым, што сваімі цяперашнімі паводзінамі пазбаўляеце магчымасці дажыць «да ста» і сваіх нашчадкаў.

1. Амаль штодня (што называецца, з лёгкай забыўлівасцю) прымайце вітамінна-мінеральныя комплексы. Арганізму патрэбны належныя дозы вітамінаў А, С, Е, групы В, мінеральных рэчываў — кальцыю, жалеза, ёду, медзі, магнію, марганцу, цынку, малібдэну, хрому, селену.

2. Абмяжуйце ўжыванне рафінаванага і нерафінавага цукру, мёду. Не дадавайце цукар у чай і каву. Не ўжывайце надта салодкую ежу і не піце салодкіх напояў.

3. Збалансавана ўжывайце зялёны і чорны чай, каву, какаву, натуральныя сокі.

4. Не ешце шмат за адзін прысест. Сачыце за вагой.

5. Абавязкова штодня ўжывайце садавіну і гародніну.

6. Піце ваду.

7. Будзьце асцярожнымі з алкагольнымі напоямі (пры іх ужыванні сачыце за самаадчуваннем, заўсёды запівайце алкаголь вадой, майце на ўвазе, што алкаголь карысны для сасудаў, але не падабаецца сэрцу).

8. Не курыце!

9. Будзьце актыўнымі (рабіце зарадку, хадзіце пешшу, рабіце самамасаж).

10. Пазбягайце стрэсаў (вучыцеся расслабленню, рабіце тое, што вам падабаецца, не раскачвайце «энергетычныя вагі» — імкніцеся не страціць стан спакою).

11. Падтрымлівайце гарманічнае сэксуальнае жыццё.

12. Спіце не менш за 6—7 гадзін у суткі.

13. Захоўвайце цесныя сувязі са сваякамі і сябрамі. Асабліва з маладымі прадстаўнікамі.

14. Трэніруйце памяць і яснасць мыслення (напрыклад, штодня завучвайце па вершыку, разгадвайце рэбусы, красворды).

15. Памятайце: што не працуе, тое... адмірае.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Фота Віктара ТАЛОЧКІ, БЕЛТА.

АМЕРЫКАНСКІЯ І БЕЛАРУСКІЯ КАРДЫЯХІРУРГІ ПРАВОДЗЯЦЬ АПЕРАЦЫЮ ДЗІЦЯЦІ З ЦЯЖКІМ ПАРОКАМ СЭРЦА

Дзіцячы кардыяхірург з ЗША Вільям Новік і брыгада, якую ён узначальвае, зноў прыехалі ў Мінск. Гэта ўжо трынаццаты візіт. Медыкі прабудуць у беларускай сталіцы 7 дзён. За гэты час яны плануюць правесці 14 аперацый дзецям з цяжкім парокам сэрца — па дзве—тры аперацыі штодзень. Працуе брыгада ў Рэспубліканскім дзіцячым кардыялагічным цэнтры. Падчас папярэдніх візітаў замежныя спецыялісты правялі ўжо 396 аперацый.

З адкрытым сэрцам

МАЎЧАННЕ МІШЫ, АБО ХВАРОБА ДЗІЦЯЧАЙ ДУШЫ

У Рэспубліканскай клінічнай псіхіятрычнай бальніцы дзеці з рознымі «хваробамі душы» праходзяць грунтоўнае абследаванне і лечацца верай, надзеяй, любоўю...

Васьмігадовы Лёша каторыя суткі не ўстае з ложка, а пяцігадовы Міша зусім не размаўляе... Псіхічныя расстройствы ў дзяцей маюць рознае паходжанне і па-рознаму праяўляюцца, але кожны выпадак патрабуе вялікіх намаганняў для дасягнення хоць бы мінімальных станоўчых зрухаў.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

...Дзеці з няўдалых сем'яў могуць пакутаваць ад расстройства адаптацыі — не падпарадкоўваца агульнапрынятым правілам паводзінаў. Такія і сваё знаходжанне ў медустанове лічаць сапраўдным пазбаўленнем волі. Пілюлямі тут, зразумела, не заўсёды дапаможаш: патрабуецца, як кажуць псіхолагі, індывідуальны падыход, спецыяльная карэкцыйная работа. Псіхічныя захворванні з'яўляюцца не толькі ў дзяцей з «цяжкіх» сем'яў пітушных бацькоў. Прычына падобных парушэнняў можа хавацца і ў паталогіі галаўнога мозга, абумоўленай цяжарнасцю, якая працякала з ускладненнямі, або наступствамі перанесеных дзецьмі захворванняў — такіх, як менінгіт, эпілепсія і некаторыя іншыя. А можа і не быць ніякіх прыродных адхіленняў: проста дзіця не вытрымала нейкага напружання і стала ахвярай таго стану, калі навязлівыя думкі пачалі нараджаць навязлівыя дзеянні. Так, боязі выхаду да дошкі дзіця можа пазбаўляцца з дапамогай нейкіх рытуальных дзеянняў, сімвалічных малюнкаў. Гэткая своеасаблівая самаабарона. Як і заіканне, замыканне ў сабе, уцёкі з дому, уліванне ў дрэнную кампанію...

— У нас закрытае аддзяленне, куды з усёй рэспублікі паступаюць дзеці ва ўзросце ад 3 да 14 гадоў, — кажа загадчыца дзіцячага аддзялення Іна ТРАЦЦЯК. — Закрытае па той прычыне, што шпіталізуюцца тыя, у каго ёсць не проста праблема з псіхічным здароўем, але і парушэнне паводзінаў. Калі ў дзіцяці — звычайная маўленчая паталогія, то яму дастаткова дапамогі спецыялістаў Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра паталогіі слыху, голасу і маўлення. Мы ж займаемся складанымі выпадкамі, і на працягу прыкладна месяца павінны дасканала абследаваць дзіця, каб паставіць дакладны дыягназ, дакапацца да прычыны адхіленняў.

У сучасных дзяцей спецыялісты выявілі новы сіндром — дэфіцыту ўвагі і гіперактыўнасці. Такія нашчадкі, што называецца, кіруюць бацькамі, дый любымі дарослымі, паколькі яны — ярка выражаныя індывідуальнасці. Робяць тое, што хочацца ім, не могуць падпарадкоўвацца і хадзіць строем. У процілеглым выпадку агрэсіўна пратэстуюць. Псіхолагі дзіцячага садка, паліклінік, дзіцячага псіханеўралагічнага дыспансэра павінны ўстанавіць, што мае быць — асаблівасці характару ці парушэнні адаптацыі і паводзінаў, псіхапаталогія. Карэкцыя спатрэбіцца ў любым выпадку, але якога кшталту? Гэтаксама і прычыны, напрыклад, маўленчай паталогіі бываюць рознымі. Адсутнасць маўлення ўвогуле, не вымаўленне некаторых літар можа быць абумоўлена арганічнымі парушэннямі кары галаўнога мозга. Адным словам, мы павінны выявіць прычыну псіхічнага расстройства і пачаць яго карэкцыю. Дакладней, распачаць, паколькі гэта цяжкі, марудны і вельмі доўгі працэс...

...У закрытым аддзяленні ўсе дзверы (за выключэннем нагляднай палаты, у якой наогул няма дзвярэй — для кругласутачнага назірання) — зачыненыя. Гэта для бяспекі саміх жа пацыентаў, сярод якіх трапляюцца і схільныя да ўцёкаў. У адной з палат частка пацыентаў штосьці малюе, другая — глядзіць тэлевізар, праўда, як толькі на парозе ўсе заўважаюць Іну Генадзьеўну, кідаюць свае заняткі і задаюць «адно на ўсіх» пытанне:

— А колькі мне яшчэ тут быць?

— Пакуль поўнасцю не абследуешся...

— А я?..

— А ты наогул толькі паступіла...

— А я?..

— І ты ў нас нядаўна.

У суседнім пакоі — школьныя заняткі. Расклад урокаў, падручнікі, настаўнікі і амаль усе прадметы — за выключэннем фізкультуры, працы і замежных моў. Для дзяцей з рознымі формамі разумовай адсталасці заняткі ідуць паводле спецыяльных праграм. Для пацыентаў з не самымі складанымі паталогіямі вось ужо шмат гадоў (дакументальна — з 2004 года) дзейнічае праваслаўны клас, які вядуць сёстры Свята-Елісавецінскага манастыра Фаціння і Таццяна.

Невялікі, спецыяльна адведзены для іх асаблівай работы пакой дэманструе шмат абразоў і ўнікальных рэчаў, вырабленых самімі дзецьмі. Напрыклад, невялічкія вітражы на вокнах, загатоўкі для якіх прывезла з Масквы сястра Фаціння. Арыгінальныя «вясёлыя ноткі», птушкі, кветкі, сонейка радуюць вока і выпадковага госця. Рознакаляровы свет — амаль бездакорны.

— Мы навучаемся жыць без граху, паводле Божых запаведзяў, і, безумоўна, з малітвай, — тлумачыць сястра Таццяна, якая ў мінулым вяла сямейны клуб аздараўлення ў мінскім Палацы дзяцей і моладзі, педагог па адукацыі. — Вучым царкоўнаславянскую мову, вядзём агульны летапіс самых важных падзей, у якіх бралі ўдзел дзеці, акрамя таго, кожны піша сваю ўласную кнігу — успаміны, вельмі асабістае, цяжка перажытае... Спрабуем давесці да кожнага, як добра жыць у краіне дзяцінства без тытуню і алкаголю, вучым матэматыцы паводле ўнікальнай сістэмы, распрацаванай прыхільнікам здаровага ладу жыцця, марафонцам Мікалаем Лявонавым, абуджаем жаданне рабіць што-небудзь уласнымі рукамі. Зараз рыхтуем выставу мастацкіх работ «Святло дабрыні. Малыя вынікі вялікай працы»...

Падчас паступлення і далей, амаль штодня кожнага пацыента аглядае педыятр: такія дзеці маюць вялікую колькасць саматычных захворванняў. Лагапед Ганна ВІНІЧЭНКА абследуе маўленне і пры выяўленні парушэнняў правадзіць таксама амаль штодзённыя заняткі: «Найчасцей праблемы з маўленнем сустракаюцца сярод дзяцей-выхаванцаў дзіцячых дамоў, паколькі яны не атрымліваюць дастатковай увагі, а маўленчую паталогію можна не дапусціць ці перамагчы толькі падчас пастаянных заняткаў, самым лепшым варыянтам з якіх з'яўляецца кантактаванне з бацькамі. Па гэтай прычыне мы «займаемся» і дарослымі, тлумачым ім, якая паталогія мае быць у дзіцяці — проста лагапедычнае парушэнне ці лагапедычная паталогія на фоне разумовай адсталасці, вучым, як сябе паводзіць у тым ці іншым выпадку. Самае важнае, вядома ж, — не спадзявацца на ўрача, паколькі лепшыя лагапеды — гэта маці, тата і хатняя абстаноўка».

...Мішу — 5 гадоў. Ён, у адрозненне ад сваіх бацькоў, абсалютна не размаўляе. Хлопчыка паклалі ў аддзяленне разам з маці. Першае, што яна вымавіла, калі пабачыла бокс, у якім ёй з сынам давядзецца «пажыць», былі словы «дык тут жа так добра...». І страх у яе вачах знік. Да цяперашняга паступлення ў псіхіятрычную бальніцу хлопчыка вазілі ў адзін з раённых карэкцыйных цэнтраў, але зрухаў — ніякіх. Як кажуць спецыялісты бальніцы, у такіх дзяцей, як правіла, не назіраецца значнай дынамікі да паляпшэння, паколькі праблема можа заключацца ў інтэлектуальных асаблівасцях. Задача ўрачоў — «раскрыць» Мішына маўчанне: разумовая адсталасць ці аўтызм?

— Адна частка маёй работы — даследаванне і маўлення, і інтэлекту, — расказвае псіхолаг Наталля ЖЫВАЛКОЎСКАЯ. — Другая частка — карэкцыйная, якая можа быць індывідуальнай ці групавой, і без актыўнага ўдзелу бацькоў тут не абысціся. Паколькі прычынай таго ж аўтызму, паглыблення дзіцяці ў сябе, можа быць нейкая нядобрая сітуацыя ў сям'і. Эмацыянальныя расстройствы — часта вынік парушанага ўзаемадзеяння ў сям'і, калі дзіця не атрымлівае цеплыні і не адчувае бяспекі. У дадзеным выпадку мы не вядзём гаворку пра арганічныя парушэнні галаўнога мозга, якія, зразумела, не карэктуюцца...

...Пройдзе месяц, і Мішу, і іншых цяперашніх пацыентаў выпішуць. З дакладнымі дыягназамі, з далейшым назіраннем у псіханеўралагічных дыспансэрах па месцы жыхарства. Цікава, што хтосьці з былых пацыентаў бальніцы абавязкова забудзецца на тое, як чакаў свабоды. Сам патэлефануе ў аддзяленне або папросіць аб гэтым каго-небудзь з дарослых: маўляў, як там адчуваюць сябе выраблены ўласнымі рукамі птушкі, сонейка, ноткі? Як там справы — у амаль бездакорным свеце?..

Святлана БАРЫСЕНКА.

СКАЗАЦЬ ПЕРАГРУЗКАМ «СТОП!»

Хранічная стомленасць праяўляецца агульнай слабасцю, рассеянасцю, пагаршэннем памяці і апатыяй. Узнікае рэзкае зніжэнне працаздольнасці — разумовай і фізічнай, перапады настрою, аслабленне імунітэту, парушэнне сну, частыя галаўныя болі. Усё гэта сведчыць аб працяглай стомленасці арганізма, што патрабуе перагляду падыходаў да ладу жыцця, працы і здароўя. Неабходна знізіць нагрузкі на арганізм, змяніць рацыён харчавання, падоўгу хадзіць пешшу і спаць, не зацыклівацца на негатыве, пазітыўна ставіцца да жыцця і не забываць пра бяскрыўдныя задавальненні.

Раённая дэмаграфія

ПРАДУМАНЫЯ РОДЫ, або Калі колькасць пераходзіць у якасць

Жыхарка Століна, 26-гадовая Святлана — на шостым месяцы цяжарнасці. На дваіх з мужам Паўлам у іх цяпер адна задача — чакаць з'яўлення на свет здаровага малога. Першага, але не апошняга: маладая сям'я мае на мэце падарыць свету яшчэ мінімум дваіх. Як кажуць, дапамагай Бог...

У цэлым па Століне і Столінскім раёне з колькасцю дзетанараджэнняў сітуацыя надта добрая, дакладней, лепшая ў Брэсцкай вобласці і ці не ў краіне. З «якасцю», праўда, не так гладка. Паводле статыстыкі, у Столінскім раёне каля 60 працэнтаў жанчын рэпрадуктыўнага ўзросту (18—40 гадоў) і больш як 80 працэнтаў цяжарных маюць тую ці іншую паталогію. Ужо толькі па адной гэтай прычыне нараджэнне здаровых дзяцей становіцца рэдкасцю: амаль 90 працэнтаў нованароджаных маюць II ці III групу здароўя.

Намеснік галоўнага ўрача па дзяцінстве і рододапамозе Століншкай цэнтральнай раённай бальніцы Раіса МІСЮРА дадае, што на ўліку па цяжарнасці і родах цяпер знаходзяцца 26 дзяўчат ва ўзросце да 18 гадоў і 3 — да 16. Гэтыя будучыя матулі, як і многія іншыя іх равесніцы ды равеснікі, што пражываюць на Століншчыне, маюць пэўныя праблемы са здароўем, а значыць, у іх малавата шанцаў нарадзіць здаровае пакаленне.

Спецыялісты перакананыя, што маладое насельніцтва рэгіёна вылучаецца нізкім узроўнем ведаў і навыкаў па захаванні рэпрадуктыўнага здароўя, у тым ліку не вытрымлівае правілаў бяспечнага пражывання на забруджанай радыенуклідамі тэрыторыі. Паляпшэнню сітуацыі могуць паспрыяць некалькі простых рэчаў: укараненне практыкі падрыхтоўкі да цяжарнасці і родаў, абследаванне і лячэнне маладых пар да моманту запланаванай цяжарнасці, нарэшце, фарміраванне ў падлеткаў адказных паводзінаў адносна ўласнага здароўя.

Алена Русакова, урач-педыятр, кандыдат медыцынскіх навук, аўтар шэрагу падручнікаў па педыятрыі перакананая, што ў новага пакалення абавязкова трэба фарміраваць усвядомленыя рэпрадуктыўныя паводзіны. «Варта падкрэсліць, што Сусветная арганізацыя аховы здароўя залічвае права падлетка аб веданні метадаў кантрацэпцыі ў фундаментальныя правы чалавека», — кажа яна.

А вось і агульная, а значыць, характэрная для ўсіх рэгіёнаў Беларусі, сітуацыя з «дзіцячай» сэксуальнасцю. Сярэдні ўзрост пачатку палавога жыцця ў нас — 14 гадоў. Кожная 13-я жыхарка рэспублікі робіць гэта ва ўзросце да 14 гадоў, кожная 5-я — да 16-ці, большасць — з 18 да 21 года. Сем працэнтаў ад агульнай колькасці родаў прыпадае на непаўналетніх. А ў такіх выпадках медыкі фіксуюць і цяжкае працяканне самой цяжарнасці, і невыношванні, і ўскладненні ў родах, і нараджэнне хворых дзяцей або дзяцей з нізкай вагой.

Згодна з апытаннямі, праведзенымі сярод школьнай, вучнёўскай і студэнцкай моладзі педуніверсітэтам імя М. Танка, 70 працэнтаў падлеткаў, якія маюць сэксуальны вопыт, не шкадуюць аб раннім палавым жыцці. Усяго 2 працэнты дзяўчат і юнакоў лічаць, што сэксуальныя адносіны дапушчальныя толькі ў шлюбе. Сэкс на адну ноч дапускаюць 33 працэнты апытаных, а 41 працэнт рабіў гэта. У выпадку, калі сустрэчы маладога чалавека з дзяўчынай скончыліся перарываннем цяжарнасці, сэксуальныя адносіны мелі працяг, паводле прызнанняў рэспандэнтаў, толькі ў 5 працэнтаў пар.

Нягледзячы на агульную тэндэнцыю зніжэння абортаў у краіне (у 2002 годзе гэта было каля 90 тысяч выпадкаў, у 2006-м — каля 60 тысяч) ва ўзросце 15—19 гадоў такой станоўчай тэндэнцыі не назіраецца. На гэту ўзроставую групу прыпадае каля 10 працэнтаў абортаў (на ўзрост 19—25 гадоў — 25 працэнтаў). Больш за тое, 67 працэнтаў маладых жанчын з-за позняга звароту да ўрача прыбягаюць да звычайнага аборту, а да больш ашчадных вакуум-аспірацый — 32. Сярод жанчын больш сталага ўзросту гэтыя паказчыкі процілеглыя.

Практыка сведчыць: падлеткі не ведаюць, што аборт заўсёды з'яўляецца аперацыяй, якая пагаршае здароўе жанчыны, і што гэта адзіная ў свеце аперацыя, якая праводзіцца ўсляпую. Палова выпадкаў жаночай бясплоднасці тлумачыцца менавіта праведзенымі абортамі. Што да мужчынскай нездольнасці да зачацця, то тут на першы план выходзяць інфекцыі, якія перадаюцца палавым шляхам, часцей за ўсё, ганарэя, перанесеная ў маладым узросце. На сёння у нашай краіне 15—18 працэнтаў шлюбаў адносяцца да ліку бясплодных, а ў ЗША, напрыклад, створана спецыяльная асацыяцыя па лячэнні мужчынскай і жаночай бясплоднасці.

Згодна з рэкамендацыямі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, для кардынальнага вырашэння праблемы абортаў паказчык выкарыстання кантрацэпцыі павінен складаць не менш за 70 працэнтаў. Сярод беларускіх жанчын ва ўзросце пасля 30 гадоў гэты паказчык па рэспубліцы вагаецца ад 50 да 60 працэнтаў, а ў маладых дзяўчат не дацягвае нават да 20. Асноўнымі метадамі кантрацэпцыі для апошніх з'яўляюцца каляндарны метад і перарваны палавы акт. Першы ў прынцыпе не падыходзіць падлеткам з неўстаноўленым менструальным цыклам, а другі проста лічыцца адным з самых ненадзейных. Дзяўчаты-падлеткі, як правіла, не інфармаваныя аб неадкладнай кантрацэпцыі, а праблема незапланаванай цяжарнасці ў раннім узросце — гэта яшчэ і праблема дзявочых суіцыдаў.

— Свае сэксуальныя праблемы падлеткі абмяркоўваюць з сябрамі ці каханымі, — тлумачыць Алена Русакова. — На «долю» медыкаў і настаўнікаў прыпадае ў лепшым выпадку 5 працэнтаў такіх размоў. Значыць, дзеці не бачаць у нас спецыялістаў, здольных дапамагчы ім ў складанай жыццёвай сітуацыі...

Па ўсім бачна, наспеў час... навучання па-новаму і медыкаў, і настаўнікаў. А гэта стане магчымым у межах праекта «Здаровая сям'я», які будзе рэалізоўвацца ў 9 населеных пунктах Століншчыны да ліпеня 2009 года пры тэхнічнай падтрымцы Праграмы развіцця ААН і Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці.

Кіраўнік праекта Вікторыя ДРАБЫШЭЎСКАЯ кажа, што ў бліжэйшы час для будучых медыкаў і настаўнікаў будуць распрацаваны сучасныя метадычныя матэрыялы па асвятленні практычных пытанняў забеспячэння радыяцыйнай бяспекі насельніцтва, здаровага мацярынства, бацькоўства і дзяцінства. Адпаведны факультатыў з'явіцца ў Пінскім медыцынскім каледжы і Гомельскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце, а ў Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі — спецкурс. Больш за тое, ужо цяпер групавыя і індывідуальныя заняткі для гэткіх «цяжкіх» падлеткаў ажыццяўляе кансультатыўна-інфармацыйны цэнтр «Дыялог», размешчаны на базе Столінскай цэнтральнай раённай бальніцы. Перажыць складаныя жыццёвыя сітуацыі, знайсці адказы на самыя што ні на ёсць сэксуальныя і многія іншыя пытанні падлеткам дапамогуць псіхолаг і нарколаг.

У межах памянёнага вышэй праекта плануецца забяспечыць работу Цэнтра здароўя маці і дзіцяці, правесці скрынінг-дыягностыку ўтрымання радыенуклідаў у грудным малацэ, а ў кожным з 9 населеных пунктаў наладзіць «Кірмашы здароўя». Двойчы ў месяц цяжарныя жанчыны і маладыя маці атрымаюць магчымасць наведваць тэматычныя заняткі...

— У нашай вёсцы пражывае 1244 чалавекі, і пакуль людзі не з'язджаюць ад нас, а наадварот, прыбываюць, — расказвае Васіль КОЗЕЛ, загадчык фельчарска-акушэрскай амбулаторыі, што ў вёсцы Церабяжоў. — На ўліку па цяжарнасці і родах — 19 жанчын! 16 дзяцей — ва ўзросце да года. З лістапада ў нас працаваў гурток «Здаровая сям'я», і вось як працяг — яшчэ адна ініцыятыва ПРААН — Цэнтр здароўя маці і дзіцяці. Я перакананы, што гэта вельмі важна для вясковых жанчын, пазбаўленых да гэтага часу магчымасці рыхтавацца да родаў і наогул атрымліваць адказы на хвалюючыя пытанні. Дарэчы, зусім нядаўна я вучыў правільным паводзінам у родах адну нашу цяжарную. Гэта было літаральна за тыдзень да азначанай падзеі, але і гэтага хапіла, каб яна пасля сказала, што за выключэннем схватак родавы працэс мінуў амаль незаўважна...

...26-гадовая Ларыса, жыхарка вёскі Ніжні Церабяжоў, прыехала ў Століншую раённую бальніцу, каб стаць на ўлік па цяжарнасці. Праўда, тутэйшы гінеколаг сказала, што намер... адмяняецца. Ларыса — не цяжарная. На гэты раз. У яе з 30-гадовым мужам Сяргеем ужо ёсць дзве дзяўчынкі, але шлюбная пара не супраць з'яўлення на свет трэцяга дзіцяці. «Мы пастараемся», — сціпла кажа Ларыса... Як кажуць у такіх сітуацыях, дапамагай Бог...

Святлана БАРЫСЕНКА,
Століншкі раён.

Сямейны псіхолаг Святлана Анішчанкава

СУПЕРГЕРОЙ

Насуперак агульнапрынятым уяўленням, той, хто імкнецца быць першым, перакананы, што ён — апошні. За гэтым імкненнем хаваецца несвядомы недахоп самапавагі.

Дасканаласць грамадства аддае перавагу паспяховым. Лепшы вучань у класе — прыклад для пераймання. Лепшы работнік — аб'ект для прэміравання. Экраны тэлевізараў запоўнены фільмамі пра самых моцных, прыгожых, паспяховых і таму — шчаслівых людзей-супергерояў. Яны дасціпныя, стройныя, упэўненыя ў сабе і... падобныя адно на аднаго як клоны. Гатовы рэцэпт шчасця навязлівы і цяжкадасягальны. Паглядзіць дзяўчынка-падлетак чарговы фільм з эфектнай бландзінкай у галоўнай ролі і зразумее, што ёй не выпадае ездзіць на белым «мерседэсе». Засмуціцца і, магчыма, пойдзе па жыцці з негатыўнай установай на сябе і ўвесь свет. Або будзе марыць аб «сіліконавых грудзях», каб увесь свет заваяваць. З маленства нашы дзеці ўключаюцца ў гонку за лідэрства, і грамадства іх стымулюе, падштурхоўваючы да неапраўданых подзвігаў, перамог і страт. Цана часам аказваецца вельмі дарагая.

На жаль, звыклая форма педагагічнага ўздзеяння праз параўнанне, пакладзеная ў аснову нашай школы, толькі ўскладняе шалёную гонку. Хто ў дзяцінстве не зайздросціў выдатнікам, якія ўсім падабаліся, якіх хвалілі і ставілі ў прыклад? Хтосьці з імі хацеў кантактаваць для зручнасці, хтосьці ненавідзеў, таму што было крыўдна, але дружыць з выдатнікамі жаданне ўзнікала не ў многіх. Рэдка хто бачыў у «гонары класа» проста чалавека, бо ён — недасягальны. З дзяцінства нас акружаюць цяжкасці, пераадолець якія пад сілу не ўсім. Адны ўпарта і пераможна рухаюцца наперад, астатнія з захапленнем глядзяць на супердзей. І амаль ніхто не заўважае, што ўпэўненая хада «супер-героя» хавае гранічнае ўнутранае напружанне, а палкі погляд — панічны страх паражэння. Замест сяброў вакол «героя» заўсёды прыхільнікі, якія тайна хочуць быць на яго падобнымі. Яны і не падазраюць, што менавіта дзякуючы ім і трымаецца «супергерой». Іх захапленне дае магчымасць у чарговы раз перакананца ў тым, што пераадолена яшчэ адна перашкода. Застаючыся сам-насам з сабой, «супергерой» чахне, губляецца ў сумненнях, страхах, нудзе і адзіноце. Родныя і блізкія дзесьці далёка ззаду нясуць сваё бярэмя жыццёвых турбот, не разумеючы, што яму яшчэ трэба. Самазадаволенасць — рэдкі госць у жыцці «супергероя». Прывыкшы з дзяцінства рваць наперад, ён не задумваўся над пытаннямі «навошта?», «чаму?» і «ці трэба?». Але, на жаль, атрымаўшы пэўную праграму ад бацькоў — іх багаж нерэалізаваных жаданняў і амбіцый, бяжыць, баіцца спыніцца, таму што не хоча і не ўмее прайграваць.

Знаходзячыся ў палоне сваёй падсвядомасці, стварыўшы з дапамогай бацькоў ілюзорны свет, у якім заўсёды вайна, «супергерой» дзень і ноч змагаецца з самім сабой, кідаючы да ног прыдуманай перамогі каханне, дружбу, радасць звычайнага быцця і магчымасць быць проста чалавекам, які мае права на памылкі. Памылкі, дзякуючы якім, чалавек ведае, як далей жыць і тварыць. Гэтага пазбаўлены «супер-герой». З дзяцінства знаходзячыся ва ўмовах сляпой бацькоўскай любові або не поўнай адсутнасці, знаходзячыся пад прэсінгам аўтарытарнага выхавання, «супер-герой» імкнецца задаволіць чаканні бацькоў дзеля любові. Яшчэ адна добрая адзнака, перамога ў чарговым конкурсе прыносяць жаданы вынік — прыцягваюць увагу.

«Вось які малайчына мой сын, увесь у мяне, я ў дзяцінстве таксама...» — гэтыя словы бацькоў — праграма для далейшых дзеянняў, пахвала сябе праз дзіця, чарговая порцыя пацвярджэння неіснуючай значнасці, падтрымка нізкай бацькоўскай самаацэнкі.

Расце чалавек, урыўкамі атрымліваючы захапленне і ацэнкі, цаной неверагодных намаганняў спрабуе паспець усюды першым. Сябры бягуць у кіно, «супергерой» сядзіць дома, вучыць урокі, каб ні ў якім разе не дапусціць слабых адказаў, сярэдніх балаў... Паступова чалавек заганяе сябе ў вакуум адзіноты, рэдка хто можа адпавядаць патрабаванням, якія прад'яўляе «супергерой» сабе і навакольным. Прыхільнікі і блізкія людзі сыходзяць у пошуках цеплыні і звычайнага, рэальнага жыцця. Работа не радуе, ніхто ўжо не захапляецца яго дасягненнямі. Народжаны бацькамі-эгаістамі, «супергерой» перажывае няўдачы больш балюча, чым «звычайныя» людзі. Ламаецца — хутчэй. Дапамагчы яму можна, толькі, калі даць зразумець, што не абавязкова быць лепшымі, каб атрымаць прызнанне і любоў. Ён павінен перакананца, што каштоўнасць яго ў ім самім, і не важна, чаго ён дасягнуў у грамадстве.

Эгаісту цяжка даецца навука любові. Але ў кожным чалавечым сэрцы ёсць свабоднае месца, яно непакоіць, і пакуль не будзе запоўнена любоўю, радасці і задавальнення ад жыцця не знайсці. Прыз, да якога імкнецца нясчасны «супергерой», — любоў. Ён шукае яе з дзяцінства, імкнецца ўсёй душой, але іронія ў тым, што любоў, сапраўдная, бескарыслівая, выяўляецца ў простых словах: «Я люблю цябе такім, які ты ёсць!».

Любы «супергерой» у глыбіні душы марыць, каб у ім убачылі звычайнага чалавека, якім ён хоча стаць, але яшчэ пакуль не ўмее.

АХОВА СТАРАСЦІ

Драгічынскія трагедыі, калі ахвярамі злачынцаў сталі пенсіянеры, прымусілі задумацца пра бяспеку састарэлых людзей, асабліва ў сельскай мясцовасці. Што трэба рабіць, каб бабулі і дзядулі не трапілі ў пастку махляроў, як абараніць пенсіянераў ад злачынцаў — сваім досведам у працы па бяспецы састарэлых дзеліцца міліцыя Магілёўскай вобласці.

Жыхарцы вёскі Дашкаўка Магілёўскага раёна Лідзіі Фёдараўне Бурцавай ужо 86 гадоў. Яна нарадзілася ў гэтых мясцінах і, як гаворыць жанчына, «усё сваё жыццё аддала за Радзіму».

Цяпер яна жыве адна ў невялікай кватэры, дзе гучна іграе радыё. Па нядбалай вясковай традыцыі дзверы на замок не зачынены. Гаспадыня сядзіць ля вялікага акна і спакойна чытае газеты.

— У мяне ёсць тэлефон, і навокал людзі жывуць, — тлумачыць Лідзія Фёдараўна сваю бестурботнасць, але прызнаецца: «А здарэцца, што і страшна...»

Бабулі давялося летась самой лавіць зладзея. Праўда, той чалавек не скраў нічога, але ўрон зрабіў. Было гэта на ўскраіне той жа самай Дашкаўкі, толькі ў вясковай хаце, якая выкарыстоўваецца як лецішча.

Фота Ірыны САВОСІНАЙ.

Аднойчы Лідзія Фёдараўна прыйшла праведаць дом, а там «з мясам» выдрана шыба. Суседзі пабаяліся ісці з ёй, і старая рашылася сама абараняць маёмасць. Адчыніла дзверы і ўбачыла ў пакоі на канапе п'янага мужчыну сярэдняга ўзросту.

— Ён яшчэ, прабачце, і не праспаўся, — узгадвае тую гісторыю Бурцава. — Я з ім стала размаўляць па-добраму, каб не ўзлавацца і не ўдарыў. І ён сказаў: «Мне тут давялося пераначаваць, не было дзе». Сам ён не памятаў, як трапіў у хату. Не здолеў знайсці свой пінжак. Я папрасіла яго паставіць шыбу на месца і сыходзіць. Пасля патэлефанавала ўчастковаму...

Той мужык адправіўся ў вясковую краму, выпіў яшчэ ды заснуў у нежылой пабудове паблізу. Там яго і затрымаў міліцыянер.

80-гадовая Ганна Антонаўна Сахарава, у адрозненне ад аднавяскоўкі, зачыняе цяпер усе дзверы на замок. Так адбіўся на яе жыцці леташні выпадак на вуліцы Малое Зарэчча.

— Гэта было перад Іванам Купалам: я пайшла пасвіць коз, — расказвае бабуля. — Калі вярнулася, не адразу ўбачыла, што адчынены дзверы ў спальню, непарадак з буфетам і шафай. А я напярэдадні павінна была атрымаць пенсію. Праўда, дад анучамі быў толькі маленькі кашалёк, дзе было няшмат грошай, але і іх не стала. Не далічылася я і некаторых харчоў. Але самае галоўнае, што ў спецыяльнай скрынцы не знайшла свае медалі — 9 франтавых і юбілейных узнагарод.

Пасля Ганна Антонаўна ўбачыла і жоўтую палоску на шкле: зладзеі праніклі ў дом праз акно, паставілі на падваконне кветкі — як і было, і ўцяклі праз дзверы.

Міліцыя даволі хутка адшукала злачынцаў. Імі аказаліся цыгане: у акно лазіла жанчына, а на вуліцы пільнавала дзяўчынка. Вярнулі ўладальніцы і грошы, і медалі.

— Я іх ніколі не насіла, — са слязьмі прызналася старая. — Але ж гэта памяць пра вайну. Ёсць медаль «За перамогу над Германіяй». Хоць я зусім маладая была, але прайшла ад Смаленска да Эльбы... Дзякуй міліцыянерам, што вярнулі мне ўсё.

Мясцовы ўчастковы інспектар капітан міліцыі Васіль Лагуноўскі жыве ў Дашкаўцы, на гэтым участку працуе больш за 8 гадоў. Клопат пра старых, гаворыць Лагуноўскі, гэта надзённая справа: паводле статыстыкі, 40 працэнтаў вясковага насельніцтва — гэта пенсіянеры.

— У нас ёсць клуб састарэлых людзей, які стварыла сацыяльная служба Магілёўскага раёна, — расказвае Васіль. — Там выступаем перад бабулямі і дзядулямі і распавядаем, як засцерагчыся ад злачынных замахаў. Гэта значыць: не пускаць чужых людзей у хаты — асабліва калі яны грукаюць у дзверы ўначы, а таксама нікому не расказваць, нават па вялікім сакрэце добрым людзям, пра свае грошы і каштоўнасці ў схованках.

Увогуле састарэлыя вяскоўцы па-філасофску ставяцца да дробных крадзяжоў: маўляў, «Бог верне» альбо «чорт яго бяры». Калі губляюцца не вельмі важныя рэчы, нават і не заяўляюць у міліцыю.

Напрыклад, часам з падворкаў знікаюць металічныя пасудзіны: бідоны, чыгункі, відэльцы-лыжкі і гэтак далей. Гэта, хутчэй за ўсё, мясцовыя п'яніцы ў пошуках сродкаў на яшчэ адну пляшку збіраюць з падворкаў усе металічныя рэчы, якія «дрэнна ляжаць». Аднак калі ў старых крадуць грошы, адкладзеныя, як яны кажуць, «на смерць» альбо памятныя каштоўнасці, — гэта ўжо цэлая трагедыя. І тут міліцыянеры робяць усё магчымае, каб адшукаць зладзеяў і вярнуць скрадзенае.

— Дзяржава павінна паклапаціцца пра заслужаных людзей, якія працавалі на яе і абаранялі, — упэўнены намеснік начальніка УУС Магілёўскага аблвыканкама палкоўнік міліцыі Сяргей Іваноў. — Сёння яны старыя, фізічна слабыя і не могуць даць адпор злачынцам, дбаць пра сваю бяспеку. Таму абарона старых — гэта наш абавязак.

Не схаваць той страшны факт, што старыя часам церпяць ад сваіх жа вялікаўзроставых дзяцей ды ўнукаў: здараецца, што ў свае 30—40 гадоў гэтыя шалапутныя нашчадкі нідзе не працуюць, п'юць горкую і жывуць на пенсіі бацькоў. Праўда, такіх выпадкаў, зазначыў участковы Васіль Лагуноўскі, апошнім часам у той жа Дашкаўцы не было.

Нядаўна ў Мсціслаўскім раёне адбыўся жудасны выпадак. У вёсцы Андраны знікла 70-гадовая бабуля. Усхваляваныя сваякі звярнуліся ў міліцыю, і ў той жа дзень цела бабулі было знойдзена ў яе хаце ў склепе. Аказалася, што напярэдадні да жанчыны ў госці прыехаў з Расіі 24-гадовы ўнук, які не меў пэўнага месца жыхарства. Гаспадыня якраз атрымала пенсію і набыла спіртныя напоі. Застолле завяршылася сваркай, у час якой унук задушыў бабулю поясам ад халата. Малады чалавек схаваў труп у склепе і з'ехаў, аднак яго хутка адшукалі і затрымалі. У забойстве ён прызнаўся.

Бабулі і дзядулі сёння лічацца даволі заможнымі людзьмі ў вёсцы: пенсія прыходзіць дзень у дзень, сума для вясковага жыхара немалая. Ціхія п'яніцы звычайна ходзяць падпрацоўваць да пенсіянераў, у якіх не стае сілаў на апрацоўку агарода, распілоўку дроў і рамонт агароджы. У людзей-злачынцаў узнікае думка не зарабіць у старых грошы, а адабраць іх.

— Старыя баяцца класці грошы ў банк — яшчэ не зажылі душэўныя раны ад знікнення грошай, якія збіралі ўсё жыццё, пры краху савецкай сістэмы, — кажа Іваноў. — І часцей за ўсё бабулі нясуць грошы не ў банк, а робяць дома «супер-схованкі», якія вядомы ўсім зладзеям: пад матрац, у бялізне, пад шафай і гэтак далей. Знайсці элементарна, а аказаць фізічнае супраціўленне злачынцу гэтыя людзі не здолеюць. І тут яшчэ важна самім задумацца пра сваё дабро і хоць бы не хаваць ключы ад дома пад дыванком на парозе альбо ў гаршку для кветак.

Ёсць і іншая акалічнасць бяспекі старых. Бабуля, якая выбрабляе і прадае самагон, увайшла ў фальклор, але насамрэч гэта даволі небяспечная справа. Бо па пляшку прыходзяць не толькі сціплыя аматары танных і «экалагічна чыстых» вясковых напояў, але і такія людзі, якія ўжо няма чаго страчваць у жыцці, акрамя апошняй чаркі.

Факты, калі пенсіянеры ў імкненні зарабіць лішнюю капейчыну набываюць віно і гаргелку і прадаюць пасля закрыцця крамы, ужо далёка не адзінкавыя. Яны звычайна маюць на кожнай бутэльцы некалькі соцень рублёў, да тысячы. І не столькі тых прыбыткаў, колькі небяспекі быць абрабаваным, а то яшчэ і горш. Сяргей Іваноў расказаў, што летась пенсіянера, які гандляваў алкаголем, нават забілі. Таму міліцыя просіць пенсіянераў засцерагчыся ад бізнэсу такога сумніўнага кшталту.

Старыя людзі — лёгкія ахвяры для махляроў. Яны дрэнна бачаць і не арыентуюцца ў цэнах на тыя ж лекі альбо на прыборы для лячэння. Здараліся такія выпадкі, калі бабулям прадавалі тавары ўтрая даражэй. Напрыклад, нейкія кітайскія апараты для прафілактыкі рэўматызму.

Людзі, якія выглядалі прыстойна і знешне з махлярамі не мелі нічога агульнага, тлумачылі, што яны прыехалі з вобласці, па дзяржаўнай праграме. Ды абяцалі састарэлым жанчынам, што пасля карыстання апаратам яны «будуць бегаць нібыта маладухі». Бабулі радасна набывалі рэчы «са скідкамі» і моцна радаваліся да таго часу, пакуль не хваліліся новай і карыснай пакупкай дзецям з горада альбо паштальёну.

Шмат зламыснікаў прыходзяць да старых пад выглядам адказных работнікаў — не важна якіх службаў.

— Напрыклад, прыходзяць людзі і кажуць, што яны з сацыяльнай службы і робяць абмен грошай для пенсіянераў, — тлумачыць на прыкладзе палкоўнік міліцыі. — Што ж, ёсць і такія, што вераць. Калі вас пераконваюць аддаць ці абмяняць грошы ці іншыя рэчы, абавязкова патэлефануйце ў міліцыю. Проста, каб спытаць: а ці сапраўды ёсць абмен ці дзяржаўная праграма продажу лячэбных апаратаў. Як правіла, махляры тут жа пабягуць з вашай хаты!

— Мне здаецца, што тут мае месца асаблівы сельскі менталітэт, — лічыць Сяргей Іваноў. — Людзі ў беларускіх вёсках — без хітрыкаў, меней вераць у чалавечае зло.

Між тым, намеснік начальніка абласнога УУС гаворыць, што бяспека старых — гэта не вузкамедыцэйская праблема. Тут задача ставіцца шырэй. За жыццём састарэлых людзей павінны сачыць (і робяць гэта) сацыяльная служба, мясцовыя ўлады, спецыялісты МНС, участковыя інспектары міліцыі, грамадскія актывісты.

— І пры любых праблемах і сумненнях я яшчэ раз раю старым набіраць нумар міліцыі, — падкрэслівае Іваноў. — Не заўсёды ўчастковы інспектар можа адказаць на тэлефанаванне ці тэрмінова пад'ехаць да пенсіянера за дзесятак кіламетраў. Таму першая дапамога — гэта 102. Паводле статыстыкі, летась у Магілёўскай вобласці супраць састарэлых людзей учынены 1395 злачынстваў, альбо каля 6 працэнтаў ад агульнай колькасці. Можа, гэта і не так шмат, але...

— Справа ў тым, што насельніцтва нашай вобласці і краіны ўвогуле старэе, пенсіянераў становіцца ўсё больш, — тлумачыць сітуацыю Сяргей Іваноў. — Таму, паводле прагнозаў, гэтыя лічбы могуць павялічыцца. І каб гэтага не дапусціць, трэба абараняць старых. На сёння сітуацыю мы кантралюем.

Ілона ІВАНОВА.

Магілёўскі раён — Магілёў.

ТВАЕ ПРАВЫ
Інфармацыя. Парады. Дапамога.
№ 1 (5)

ВАМ АДКАЗВАЕ ЮРЫСТ

Алена ДЗЕВОЙНА

РУБРЫКУ ВЯДЗЕ

НЕНАРМАВАНЫ РАБОЧЫ ДЗЕНЬ — ШТО ГЭТА?

Растлумачце, калі ласка, што такое ненармаваны рабочы дзень. Можа, гэта маецца на ўвазе перапрацоўка рабочых часоў у дзень? Я працую ў дарожна-будаўнічай арганізацыі. Работа ў нас здзельная, але ў сезон з вясны да зімы нам часта даводзіцца працаваць па 9, 10, 12 гадзін у дзень, асабліва на ўкладцы асфальтабетону, асфальтавым заводзе, а таксама і на лініях. Ці з'яўляецца гэта перапрацоўка часоў ненармаваным рабочым днём?

В. АРЛОЎ, *г. Орша*

Згодна з артыкулам 118[-1] Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (са змяненнямі, унесенымі Законам ад 20.07.2007 № 272-З) ненармаваны рабочы дзень — гэта асобы рэжым работы, у адпаведнасці з якім асобныя работнікі могуць пры неабходнасці эпізадычна па пісьмоваму ці вуснаму загаду (распараджэнню) наймальніка або па ўласнай ініцыятыве з ведама наймальніка ці ўпаўнаважанай службовай асобы наймальніка выконваць свае працоўныя абавязкі за межамі ўстаноўленай працягласці рабочага часу. Магчымая ў сувязі з гэтым перапрацоўка звыш нормы рабочага часу не з'яўляецца звышурочнай работай і кампенсуецца прадастаўленнем дадатковага водпуску за ненармаваны рабочы дзень.

Катэгорыі работнікаў, якім не ўстанаўліваецца ненармараваны рабочы дзень, вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважаным ім органам.

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 10.12.2007 № 1695 вызначана, што ненармаваны рабочы дзень не ўстанаўліваецца:

работнікам, якія ўказаны ў пунктах 1—4 часткі другой артыкула 115 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (гэта работнікі, якім працягласць штодзённай работы (змены) нармавана);

асобам, якім працуюць па сумяшчальніцтву;

работнікам, якім устаноўлены рэжым рабочага часу пры зменнай рабоце;

работнікам, якія заняты на рабоце няпоўны рабочы час, за выключэннем выпадкаў, калі працоўным дагаворам прадугледжана работа на ўмовах няпоўнага рабочага тыдня, але з поўным рабочым днём;

работнікам, якім устаноўлены суміраваны ўлік рабочага часу;

работнікам са здзельнай аплатай працы.

Паколькі, як вы пішаце, у вас здзельная аплата працы, ненармаваны рабочы дзень вам не можа быць устаноўлены.

Артыкулам 126 Працоўнага кодэкса прадугледжана, што ў арганізацыях, дзе па ўмовах вытворчасці (работы) немагчыма або эканамічна немэтазгодна захаванне ўстаноўленай для дадзенай катэгорыі работнікаў штодзённай або штотыднёвай працягласці рабочага часу, можа прымяняцца суміраваны ўлік рабочага часу.

Такі ўлік рабочага часу, напэўна, прымяняецца ў вашай арганізацыі.

Пры суміраваным уліку штотыднёвая працягласць рабочага часу можа быць больш або менш устаноўленай нормы працягласці рабочага часу за тыдзень. Пры гэтым штодзённая працягласць рабочага часу не можа перавышаць 12 гадзін.

Сума гадзін рабочага часу па графіку работ (зменнасці) за ўліковы перыяд не павінна перавышаць нормы гадзін за гэты перыяд, разлічанай у адпаведнасці з Кодэксам.

Уліковым перыядам пры суміраваным уліку рабочага часу прызнаецца перыяд, у межах якога павінна быць захавана ў сярэднім устаноўленая для гэтай катэгорыі работнікаў норма працягласці рабочага часу ў тыдзень.

Працягласць уліковага перыяду ўстанаўліваецца наймальнікам і не можа перавышаць аднаго каляндарнага года. Уліковы перыяд можа вызначацца каляндарнымі перыядамі (месяц, квартал), іншымі перыядамі.

Паколькі суміраваны ўлік рабочага часу, згодна з часткай шостай артыкула 126, уводзіцца наймальнікам па ўзгадненні з прафсаюзам, то вы можаце пацікавіцца ў прафсаюзе па месцы сваёй працы асаблівасцямі ўліку рабочага часу ў вашай арганізацыі.



Фота Вольгі ЛАСКІ.

Школа падаткаплацельшчыка

Права на падатковы вылік даецца калі вы «чаргавік»

Рэдакцыя працягвае адказваць на самыя актуальныя пытанні нашых чытачоў. Сёння чарговую кансультацыю нашаму выданню дае ***старшы дзяржаўны падатковы інспектар Міністэрства па падатках і зборах Павел СЛЕСАРАЎ.***

— Працую настаўнікам музычнай школы ў сталіцы на дзвюх працах. У школе, дзе я працую сумяшчальнікам, у пачатку года напісала заяву на спагнанне падатку ў памеры 20 працэнтаў. У гэтым месяцы бухгалтэрыя вылічыла больш як 50 працэнтаў заработнай платы, матывуючы тым, што я перавысіла суму ў 7 мільёнаў рублёў. Ці правільна падлічылі падаткі? Якія працэнтныя стаўкі падатку дзейнічаюць у маім выпадку?

Ірына Казінец, *г. Мінск.*

— У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб падаходным падатку з фізічных асобаў» у 2007 годзе даходы, якія атрымлівалі фізічныя асобы не па месцы асноўнай работы, абкладаліся падаткам па стаўцы 20 працэнтаў незалежна ад памеру даходу. Калі работнік меў жаданне, каб такія даходы абкладаліся па прагрэсіўнай шкале ставак даходу, то для гэтага неабходна было звярнуцца ў бухгалтэрыю з пісьмовай заявай. Максімальная стаўка падатку, якая вызначана нашым заканадаўствам, складае 30 працэнтаў і ўжываецца ў выпадку, калі памер даходу ў 2007 годзе перавысіў суму ў 33 839 964 рублёў. Стаўкі падаходнага падатку ў памеры 50 працэнтаў у Беларусі не існуе.

— У лістападзе 2007 года я купіў кватэру з прыцягненнем банкаўскага крэдыту ў «Беларусбанку». Ці маю я права атрымаць падатковы вылік за 2007 год, калі арганізацыя, у якой я працую, знаходзіцца ў Парку высокіх тэхналогій?

Мікалай Пятровіч, *г. Мінск.*

— Вы маеце права на маёмасны падатковы вылік за 2007 год, вызначаны артыкулам 15 Закона «Аб падаходным падатку з фізічных асобаў» пры ўмове, што набылі кватэру ў той час, калі стаялі на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.

ДАПАМОЖНЫЯ СРОДКІ: НОВЫЯ ПРАВІЛЫ

Як сведчыць статыстыка, зараз у Беларусі налічваецца 72,6 тысячы інвалідаў першай, 272,6 тысячы інвалідаў другой, 137,8 тысячы інвалідаў трэцяй груп, а таксама 27,6 тысячы дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да 18 гадоў. Прычым не сакрэт, што значная частка гэтых людзей маюць патрэбу ў дапаможных сродках. Аднак апошнім часам якраз наконт іх усё часцей узнікаюць пытанні. У каго з інвалідаў захавалася права на бясплатнае забеспячэнне сродкамі рэабілітацыі, куды звяртацца за крэслакаляскамі ці пратэзамі, і, нарэшце, якія ёсць варыянты ў тых, хто ранейшых ільгот ужо не мае? Каб адказаць на гэтыя пытанні, карэспандэнт «Звязды» сустрэўся з начальнікам аддзела рэабілітацыі і адаптацыі інвалідаў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рытай Валянцінаўнай СУШКО.

Зважай на пералікі

Перш-наперш трэба адзначыць: пасля ўпарадкавання льгот права на бясплатны выраб і рамонт зубных пратэзаў (за выключэннем пратэзаў з каштоўных металаў) і бясплатнае забеспячэнне сродкамі тэхнічнай рэабілітацыі захавалі Героі Беларусі, Героі Савецкага Саюза, Героі Сацыялістычнай Працы, поўныя кавалеры ордэнаў Айчыны, Славы, Працоўнай Славы, удзельнікі і інваліды Вялікай Айчыннай вайны, размінёры вызваленых тэрыторый у 1943—1945 гадах, узнагароджаныя ордэнамі і медалямі ў Вялікую Айчынную вайну працаўнікі тылу, работнікі на аборончых, транспартных і ваенных аб'ектах у франтавой ці прыфрантавой зоне, блакаднікі Ленінграда, непрацуючыя ваеннаслужачыя, што накіроўваліся ў Афганістан ці іншыя дзяржавы і атрымалі раненне, кантузію ці знявечанне падчас баявых дзеянняў, а таксама асобы (і ў тым ліку «запаснікі») з ліку ваеннаслужачых органаў унутраных спраў, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, органаў фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю, якія сталі інвалідамі ў выніку ранення, кантузіі, знявечання ці захворвання пры выкананні службовых абавязкаў.

Плюс да таго магчымасць бясплатна карыстацца зубапратэзаваннем і тэхнічнымі сродкамі рэабілітацыі маюць грамадзяне, што перанеслі прамянёвую хваробу ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, інваліды I і II груп, а таксама дзеці-інваліды ва ўзросце да 18 гадоў. Праўда, тут варта мець на ўвазе адзін нюанс.

— Канкрэтныя віды бясплатных сродкаў рэабілітацыі вызначаны спецыяльным пералікам для кожнай асобнай катэгорыі інвалідаў, адпаведна, ёсць дапаможныя сродкі, якія застаюцца «за межамі» пераліку і могуць прадастаўляцца толькі з частковай ці поўнай аплатай, — кажа Рыта Сушко. — І, да слова, даведацца аб тым, хто, на што і на якіх умовах тут мае права, лепш за ўсё на месцы — у раённым упраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароне.

Парушыў — не маеш

Адначасова ёсць сэнс звярнуць увагу на такі даволі істотны момант. Паводле слоў Рыты Сушко, з пералічаных катэгорый інвалідаў бясплатна ці са скідкай сродкі сацыяльнай рэабілітацыі атрымаюць не ўсе. Ільгот аўтаматычна пазбаўляюцца асобы, што атрымалі групу ў выніку алкагольнага, наркатычнага ці таксічнагаап'янення, наўмыснага пашкоджання ўласнага здароўя і супрацьпраўных дзеянняў.

Для пачатку ісці ў МРЭК

Галоўнай падставай для атрымання дапаможных сродкаў стане заключэнне медыка-рэабілітацыйнай ці ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі. Апроч гэтага заключэння ці індывідуальнай праграмы рэабілітацыі спатрэбяцца і іншыя дакументы — пасведчанне асобы, пацвярджэнне «прыналежнасці» да пэўнай катэгорыі, вас могуць папрасіць прынесці працоўную кніжку, а, калі гаворка ідзе аб дзіцяці, то і пасведчанне аб нараджэнні разам з пашпартам аднаго з бацькоў.

Пры гэтым, працягвае Рыта Сушко, дакументы для прадастаўлення слыхавых апаратаў, вочных пратэзаў, кантактных лінзаў, лупы, зубных пратэзаў, інсулінавых шпрыцаў, тэста-палоскі для вызначэння цукру ў крыві, глюкаметраў і стамійных прыстасаванняў трэба падаваць у раённыя ўпраўленні аховы здароўя, дакументы на спецыяльны кій для перамяшчэння хворых з парушэннямі функцый ніжніх канечнасцяў, на кій для сляпых і людзей са слабым зрокам, пратэзы верхніх і ніжніх канечнасцяў, артэзы верхніх, ніжніх канечнасцяў і тулава, экзапратэзы малочнай залозы, вырабы для лячэбнага пратэзавання дзяцей, спецпальчаткі, артапедычны абутак, артапедычныя абуткавыя вырабы і боцікі Дзікуля — у Беларускі пратэзна-артапедычны аднаўленчы цэнтр ці ў яго абласныя філіялы.

Што ж да астатніх сродкаў рэабілітацыі, то забеспячэнне імі робіцца праз раённыя ўпраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароне.

Трэцяя. Ці «лішняя»?

Асобная і па-сапраўднаму нялёгкая тэма — сродкі рэабілітацыі для інвалідаў III групы. З 17 снежня мінулага года ніякіх ільгот для гэтай катэгорыі тут няма. Разам з тым, заўважае Рыта Сушко, інваліды з даходамі менш за 100 працэнтаў бюджэту пражыткавага мінімуму (на сёння гэта каля 200 тыс. рублёў) атрымалі права на штомесячную, а інваліды з даходамі менш за 120 працэнтаў БПМ (каля 240 тыс. рублёў) — на аднаразовую адрасную сацыяльную дапамогу.

Да слова, звяртацца па аднаразовую падтрымку неабходна ў раённае ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. Непасрэдна памер выплат тут можа вагацца ад 50 да 500 працэнтаў зноўтакі бюджэту пражыткавага мінімуму. Прычым канкрэтная сума павінна шмат у чым залежаць якраз ад таго, ці мае інвалід патрэбу ў дапаможных сродках і, уласна кажучы, колькі гэтыя сродкі каштуюць.

— У выпадках, калі даход перавышае 100 ці 120 працэнтаў БПМ, трэба мець на ўвазе, што інвалід можа звярнуцца ў тое ж упраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па матэрыяльную падтрымку, — падкрэслівае Рыта Сушко. — І, апроч таго, нялішне зазначыць: рашэнні аб аказанні дадатковай дапамогі інвалідам могуць прымаць мясцовыя Саветы дэпутатаў, выканаўчыя і распарадчыя органы ўлады.

І яшчэ. Як нагадваюць у Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, змяненне сацыяльных ільгот адбылося менавіта з 17 снежня мінулага года. Адпаведна, усе заказы на сродкі рэабілітацыі ад інвалідаў III групы, што былі прынятыя да гэтай даты, павінны выконвацца па нормах ранейшага заканадаўства.

Сяргей ГРЫБ.

Пытальнік

Якія мясцовыя зборы дзейнічаюць у сталіцы

Чуў, што ў лютым у Мінску былі ўведзены дадатковыя падаткі і зборы на 2008 год. Патлумачце, аб чым ідзе гаворка?

Аляксей Бяляеў, *г. Мінск*

— Спецыялісты прэс-цэнтра Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь паведамілі рэдакцыі, што Мінскім гарадскім Саветам дэпутатаў прынята рашэнне № 102 ад 28 снежня 2007 года № 102 «Аб бюджэце горада Мінска на 2008 год».

Пунктам 4 гэтага рашэння сёлета на тэрыторыі горада Мінска ўведзены наступныя мясцовыя падаткі і зборы:

— падатак з продажу тавараў у рознічнай гандлёвай сетцы;

— падатак за паслугі;

— транспартны збор на абнаўленне і аднаўленне транспарту агульнага карыстання, які выкарыстоўваецца на маршрутах у гарадскім пасажырскім, прыгарадным і міжнародным аўтобусным руху;

— збор за ўтрыманне і развіццё інфраструктуры горада;

— збор за паркоўку (стаянку) у спецыяльна абсталяваных месцах;

— збор за валоданне сабакамі і (або) выкарыстанне іх у прадпрымальніцкай дзейнасці.

Рашэнне Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў № 102 дзейнічае з 1 студзеня 2008 года, за выключэннем пункта 4, які ўступіў у сілу з першых дзён лютага.

Даведкі, як і квітанцыі, павінны быць зразумелымі і поўнымі

— Я маю льготу па падаходным падатку (крэдыты на будаўніцтва жылля). У лістападзе 2007 года аплаціла запазычанасць па крэдытах і працэнтах за кастрычнік у інфакіёску ААТ «ААБ Беларусбанк». Аднак квітак, які быў выдадзены мне, тэрміналам не чытаецца. Звярнулася ў філіял банка, якому належыць інфакіёск, па даведку, што павінен пацвердзіць мой плацеж. Ці з'яўляецца такая даведка дакументам, які пацвярджае плацеж і ці не адмовяць у бухгалтэрыі па месцы працы пры прадастаўленні льготы па падаходным падатку, бо я не прадставіла арыгінал квітанцыі аб аплаце?

Вераніка Сержынская, *г. Мінск.*

— Калі ў прадстаўленай вамі даведцы, — паведамілі рэдакцыі ў прэс-цэнтра Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь, — утрымліваецца інфармацыя аб прозвішчы, імя па бацьку і імя плацельшчыка, аб даце і суме аплаты, назначэнні плацяжу і яго атрымальніку, то яна павінна быць прынята бухгалтэрыяй для атрымання маёмаснага падатковага выліку.

БЕЗ АЛЬТЭРНАТЫВЫ?

Тэма нашай сённяшняй дыскусіі — альтэрнатыўная служба. У самім паняцці закладзена сутнасць: служба, якая дае магчымасць выбару — альтэрнатыву. Альтэрнатыўная служба, такім чынам, замяняе воінскую: таксама здзяйсняецца на карысць грамадства і дзяржавы, толькі з'яўляецца пры гэтым грамадзянскай. Якія перспектывы з'яўлення альтэрнатыўнай службы ў Беларусі? Хто зможа скарыстаць такую магчымасць? Якім чынам павінна праходзіць альтэрнатыўная служба? Пра гэта і іншае разважаем з Віктарам ГУМІНСКІМ, намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі.

Першы блін — камяком?

— У снежні 2004 года ніжняя палата беларускага парламента зрабіла спробу разгледзець у першым чытанні законапраект аб альтэрнатыўнай службе, які быў унесены ў Палату прадстаўнікоў былым дэпутатам Уладзімірам Навасядам, — расказвае Віктар Аляксандравіч. — Аднак з-за таго, што сам дэпутат на той момант ужо не прысутнічаў у парламенце (ён не быў перавыбраны), мы не маглі разгледзець у поўным аб'ёме гэты законапраект паводле рэгламенту, ды і тыя заўвагі, што былі ўказаны распрацоўшчыку для ўнясення зменаў, абсалютна не былі ўлічаны. На падставе гэтага законапраект быў адхілены. Аднак тады зрабілі пратакольны запіс: «Рэкамендаваць Савету Міністраў паскорыць распрацоўку праекта Закона аб альтэрнатыўнай службе і ўнесці яго на разгляд у Палату прадстаўнікоў». Чаму? Таму што паняцце «альтэрнатыўная служба» зафіксавана ў Канстытуцыі Беларусі — артыкул 57 сведчыць: «Парадак праходжання воінскай службы, падставы і ўмовы вызвалення ад воінскай службы ці замена яе альтэрнатыўнай вызначаюцца законам». Значыць, такі закон мае права на існаванне і нават павінен быць у дзяржаве — гэта ж канстытуцыйная норма.

Што зараз?

Тым не менш, за некалькі гадоў, што прайшлі з «першай спробы», сітуацыя не змянілася. І ў сёлетніх планах Палаты прадстаўнікоў праца над такім законапраектам не зафіксавана. Чаму?

— Сапраўды, у планах працы парламента такі закон не пазначаны, — кажа Віктар Гумінскі, — і, на маю думку, вострай неабходнасці ў ім зараз насамрэч няма. Па-першае, мы далі магчымасць прызыўнікам служыць у рэзерве: атрымаць ваенна-ўліковую спецыяльнасць цяпер можна практычна без адрыву ад вытворчасці — на зборах па некалькі разоў на год. Па-другое, палепшыліся дысцыпліна і адкрытасць арміі, наогул павысіўся прэстыж воінскай службы. Калісьці ў спадчыну ад Савецкай Арміі да нас перайшлі нестатутныя адносіны, сёння ж мы практычна пазбавіліся гэтага — сустракаюцца літаральна адзінкавыя выпадкі. Сваякі могуць ацаніць умовы побыту маладых людзей, зрабіць нейкія заўвагі камандзіру часці, на што той абавязаны адрэагаваць. Ды і карэспандэнты рэгулярна наведваюць вайсковыя часці, ніякіх сакрэтаў тут няма. Праведзена карэнная рэарганізацыя ўзброеных сілаў: зроблена стаўка не на колькасць, а на якасць (зараз у Беларусі няма недахопу ў прызыўніках, таму праводзіцца сур'ёзны адбор па стане здароўя — як фізічнага, так і псіхалагічнага, па прафесійных якасцях), узровень баявой падрыхтоўкі істотна павысіўся, што накладвае адбітак на зацікаўленасць маладых людзей у службе. Усім гэтым мы знялі частку праблем і, нам здаецца, у маладых людзей цяпер менш прычын ухіляцца нейкім чынам ад службы ў арміі.

Хто можа стаць «альтэрнатыўшчыкам»?

Вось тут узнікае пытанне, на падставе чаго прызыўнікі могуць быць вызвалены ад воінскай павіннасці — аднаго толькі жадання, а дакладней, нежадання служыць у арміі, ці на падставе глыбокіх перакананняў пацыфісцкага толку, — рэлігійных ці этычных — якім пярэчыць нясенне воінскай службы?

— Гэта адзін з самых важных аспектаў патэнцыяльнага закона, — сцвярджае Віктар Аляксандравіч, — тут важна вывесці бездакорны механізм вызначэння канкрэтных катэгорый насельніцтва, якія могуць выкарыстаць прапанаваную магчымасць, і такіх умоў, якія б не спрыялі штучнаму выбару прызыўнікамі альтэрнатыўнай службы — абы лягчэй было. Калі ўсе ахвотнікі, каб палегчыць сабе жыццё, выправяцца на альтэрнатыўную службу, можа з'явіцца недахоп прызыўнога кантынгенту, а гэта ж ставіць пад пагрозу нацыянальную бяспеку! Трэба вызначацца і з тэрмінамі праходжання альтэрнатыўнай службы, на маю думку, яны павінны ў некалькі разоў перавышаць тэрміны воінскай службы.

Дзе і як павінны праходзіць службу «альтэрнатыўшчыкі»?

— Галоўнае, на што я хацеў бы звярнуць увагу: альтэрнатыўная грамадзянская служба не мае нічога дачынення да сістэмы абароны і нацыянальнай бяспекі. Пачынаючы ад законапраектнай дзейнасці і заканчваючы рэалізацыяй на месцах — гэта прэрагатыва сістэмы сацыяльнай абароны. Стварыць адпаведныя працоўныя месцы для «альтэрнатыўшчыкаў», забяспечыць іх жыллём, спецадзеннем, праездам да працы, харчаваннем — ды і ці мала арганізацыйных пытанняў узнікне, — задача мясцовых органаў выканаўчай і распарадчай улады. Ці гатовы яны ўзяць на сябе ўсе гэтыя абавязкі? Што да ўмоў праходжання альтэрнатыўнай службы, то гэта абавязкова павінны быць непрэстыжныя працы: з цяжка хворымі ў бальніцах і хоспісах, на гаспадарчых працах, прыродаахоўных мерапрыемствах і гэтак далей.

А як у іншых?

Пералічыць усе краіны, дзе ёсць магчымасць праходзіць альтэрнатыўную службу, куды цяжэй, чым тыя, дзе альтэрнатывы няма. Назавём толькі цікавыя адметнасці. У некаторых краінах існуюць спецыяльныя дзяржаўныя органы па кіраванні альтэрнатыўнай грамадзянскай службай — у Італіі, Швецыі, Партугаліі. У іншых — справамі альтэрнатыўшчыкаў займаюцца ў Міністэрстве абароны, тады альтэрнатыўная служба не толькі грамадзянская: магчыма яе праходжанне ў вайсковай часці без зброі. Ёсць краіны, дзе альтэрнатыўная служба выключна грамадзянская (сістэма аховы здароўя, сацыяльныя службы, грамадскія арганізацыі) — і курыруюць яе адпаведныя ведамствы. Не ва ўсіх краінах тэрміны воінскай і альтэрнатыўнай службы адрозніваюцца, гэта датычыцца, напрыклад, Швецыі. У некаторых краінах альтэрнатыўшчыкі могуць праходзіць службу не толькі на радзіме, але і за мяжой: такой магчымасцю карыстаюцца, напрыклад, немцы. Альтэрнатыўная служба практыкуецца і ў суседняй Расіі. Ці з'явіцца калісьці свае альтэрнатыўшчыкі ў нас? Гэта пытанне, як і многія іншыя, звязаныя з альтэрнатывай воінскай службе, застаецца адкрытым...

Народная энцыклапедыя

ДАРОГА З-ПАД ВЯНЦА

(Працяг. Пачатак у нумары за 7 — 8 лютага.)

Яны павінны былі толькі пакаштаваць зелле, прыгубіць чарку і тут жа выліць гарэлку цераз левае плячо. На жаль, сучасная наша моладзь толькі «чула звон», што пітво нельга піць, але што з ім рабіць, ведаюць не заўсёды. Яшчэ і яшчэ раз звяртаем увагу на тое, што ў адпаведнасці з народна-хрысціянскімі вераваннямі **правае плячо чалавека — гэта месца знаходжання Анёла-ахоўніка, а левае — супрацьстаячага яму д'ябла.** Таму зусім недаравальную памылку дапускаюць тыя, хто выконвае абрадавае дзеянне машынальна, не задумваючыся над яго зместам, і выліваюць пітво цераз правае плячо. Рабіць гэта трэба правай рукой і толькі цераз левае плячо — таму, хто спакушае на кепскія ўчынкі.

Затым бацька наліваў чаркі ў другі раз. Рытуальнае дзеянне паўтаралася цалкам, прычым кожны раз маладыя прамаўлялі пра сябе невялічкія па памерах замовы-абярэгі, напрыклад: *«Выліваю ўсю бяду, зло, паклёп».* **За трэцім разам** жаніх і нявеста павінны былі не проста выліць напой, а выкінуць свае чаркі цераз тое ж левае плячо. Прычым зрабіць гэта трэба было так, каб чаркі абавязкова разбіліся.

Біццё посуду — даволі пашыранае рытуальна-магічнае дзеянне, якое нашы продкі здзяйснялі падчас розных сямейна-родавых і каляндарных святаў. Гэты рытуал меў два семантычныя пласты і адпаведна два супрацьлеглыя па змесце тлумачэнні. З аднаго боку, разбіваючы посуд, удзельнікі цырыманіялу жадалі галоўным дзеючым асобам багацця, здароўя, шчасця, нараджэння дзяцей. З другога боку, разбіць посуд — гэта значыць «знішчыць» што-небудзь (хваробу, гора, бяду, іншыя няшчасці). У вясельным абрадзе практычна паўсюдна разбівалі той посуд, з якога маладыя прыгублівалі першае ў сваім сумесным жыцці пітво. Гэта быў знак таго, што двое маладых людзей прынцыпова змянілі свой сацыяльны статус, за якім неўзабаве адбудзецца змена і фізічнага стану. Гаршкі, чаркі, талеркі білі ў знак таго, што да вяселля дзяўчына была «цэлай», а пасля вяселля «разбілася». Зразумела, такое рытуальнае дзеянне маладыя выконвалі толькі ў тым выпадку, калі нявеста была цнатлівай.

● Паводле сведчання гістарычных крыніц, некалі біццё посуду было абавязковай складовай часткай царкоўнага чыну вянчання. У адпаведнасці з апісаннямі вяселляў рускіх цароў XV—XVI стст. на заканчэнні вянчання жаніх і нявеста выпівалі віно з аднаго келіха які затым малады разбіваў. Гэта быў выразны знак: гэта нявеста на ўсё жыццё мая і ніхто больш з ёю не падзеліць чару жыццёвага напою.

● Часцей за ўсё посуд білі пасля першай шлюбнай ночы. Госці падыходзілі да дзвярэй пакоя, у якім спалі маладыя, і разбівалі аб іх гліняны посуд, пры гэтым прыгаворвалі магічнае пажаданне-заклінанне: «Колькі чарапкоў, столькі хлапцоў маладым!»

● У асобных мясцінах посуд разбіваў сам жаніх пасля першай шлюбнай ночы. Маладыя пакідалі той пакой, дзе яны начавалі, і тут жа, каля дзвярэй ён разбіваў спецыяльна падрыхтаваную талерку, што павінна было засведчыць: нявеста — цнатлівая.

● Некалькі стагоддзяў запар існавала традыцыя біць посуд на другі або трэці дзень вяселля, калі маладая аказвалася «нячэснай». Дружына маладога адпраўлялася да бацькоў нявесты і ўчыняла там цэлы пагром: біла посуд, пераварочвала пасцелі, лавы, пры гэтым гаспадары не мелі права пярэчыць намерам нечаканых гасцей.

● У народнай медыцыне таксама выкарыстоўвалі біццё посуду. У гаршку варылі святаянскія зёлкі, паілі адварам хворага, а затым разбівалі гэты гаршчок прама над яго галавой, каб тым самым «спыніць» хваробу.

● Паўсюдна лічылі, калі посуд б'ецца ў прысутнасці чужых людзей, гэта прадказвала прыбытак, павелічэнне дабрабыту.

● У той жа час посуд, які разбіваўся на Каляды або на Новы год, прадказваў бяду.

● Няшчасце мог наклікаць трэснуты або надбіты посуд, таму яго ніколі не трымалі ў хаце, не кажучы ўжо пра тое, каб выкарыстоўваць у паўсядзённым жыцці і асабліва ў абрадавай практыцы.

● Лічылася, што беспрычынна (ні з таго, ні з сяго) посуд б'ецца ў хаце толькі ў тых выпадках, калі парушаліся правілы сямейна-бытавых паводзінаў: калі ў хаце нехта свістаў, калі сякеру паклалі на лаву або на прыпечак і г. д. Падобнае становішча ўспрымалася знакам хуткай хваробы некага з дамачадцаў.

Першы сямейны «падарунак»

Пасля таго, як спецыфічным рытуальным дзеяннем маладыя «адгналі ад сябе нячыстыя сілы» і «разбілі» свой дашлюбны статус (хлопец і дзяўчына, жаніх і нявеста), маці сустракала іх спецыяльна прыгатаваным караваем («хлебам-солю»), які ляжаў на ручніку.

Каравай, які трымала на руках маці, **сімвалізаваў адзінае цэлае** — сям'ю, якая нарадзілася ў гэты дзень. Давайце яшчэ раз нагадаем, што перад тым, як адправіцца да вянца, маладыя праходзілі пад «брамай неўміручасці», аркай, утворанай з абрадавага ручніка, у абодва канцы якога былі загорнуты **два боханы хлеба** (сімвал двух — на гэты момант — самастойных людзей). Да вянца яны ехалі паасобку. У храме або ЗАГСе іх аб'ядналі-павянчалі: **дзве долі злучылі ў адну.** З гэтага моманту хлопец і дзяўчына «страцілі» свой біялагічны ўзрост і пачалі адлік новага часу — **сумеснага сямейнага жыцця.**

Маладыя цалавалі каравай і прымалі яго ў свае рукі як першы, а таму і самы галоўны падарунак у сваім сямейным жыцці.

Аксана КАТОВІЧ,
Янка КРУК.
(Працяг будзе.)

МУЖ — НА ЖОНКУ, СЫН — НА БАЦЬКУ

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама, у вёсцы Повішні Ашмянскага раёна сын, абараняючы маці, забіў бацьку.

Падчас сваркі з жонкай мужчына 1961 года нараджэння пачаў замахвацца на яе сякерай, пагражаючы забойствам. За маці ўступіўся 14-гадовы сын. Ён выхапіў сякеру і нанёс бацьку некалькі ўдараў абухом па галаве. Траўмы аказаліся смяротнымі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

НІЗОК ЛЮДЗЬМІ ВЫСОК

Чаму ў адной вёсцы нарадзілася столькі знакамітасцяў?

Ва ўсім свеце турызм ад «пляжных» прапаноў усё больш схіляецца да пазнавальных, краязнаўчых варыянтаў. Прынамсі, такія туры з кожным годам набіраюць папулярнасць. Безумоўна, цікава паглядзець, да прыкладу, на легендарныя руіны Калізея ці загадкавыя егіпецкія піраміды. Аднак ці добра мы ведаем пра таямніцы роднага краю, якія, паверце, не менш прыцягальныя за замежныя дзівосы? Цяпер распрацоўваецца інавацыйны праект — развіццё турыстычных зонаў на аснове фальклорнай і этнаграфічнай спадчыны. Каб ацаніць усе перавагі такіх сапраўдных «падарожжаў па часе», я і накіраваўся ў адну з верагодных «кропак» захапляльных маршрутаў.

Жыццё па «ўставу»

На Уздзеншчыне надзвычай цікавыя мясціны. З аднаго боку, іх можна аднесці да цэнтральнага рэгіёна (па геаграфічным размяшчэнні), а з іншага — менавіта тут вытокі велічнага Нёмана і ў пэўным сэнсе можна лічыць, што пачынаецца Панямонне. Маляўнічае навакольле шмат у чым вызначае адметнасць рэгіёна і людзей, якія тут жывуць. Нездарма гэты край здаўна называюць «калыскай талентаў». Вядома, ці не кожны куток нашай краіны можа назваць сваіх знакамітасцяў, але не ў такой колькасці, як тут. Узгадваць пра вядомых беларусаў, якія нарадзіліся на ўздзенскай зямлі, можна вельмі доўга — гэта паэты, пісьменнікі, навукоўцы, урачы, настаўнікі… Усе яны заўсёды з вялікай удзячнасцю ўзгадваюць пра родныя мясціны і ніколі не губляюць з імі сувязі.

Ёсць на Уздзеншчыне такія вёскі, дзе «канцэнтрацыя» талентаў не толькі большая сярод іншых, а проста звышнатуральная. Сярод іх, бясспрэчна, Нізок, якая вядомая з XVI стагоддзя. Вёска ўзнікла падчас станаўлення фальваркава-паншчыннай гаспадаркі на Беларусі і (не здзіўляйцеся) адна з нямногіх дасюль захавала характэрныя рысы тых часоў. Уся справа ў тым, што тады ў Вялікім княстве Літоўскім была праведзена маштабная аграрная рэформа. Падчас пераўтварэнняў на аснове так званай «Уставы на валокі» (1557 г.) устаноўлена валочная памера. У выніку рэформы ліквідавана зямельная цераз палосіца, уніфікаваны селянскія падзелы і павіннасці. Актыўна развіваліся фальваркі — сядзібы, якія не толькі забяспечвалі ўласныя патрэбы ў разнастайнай прадукцыі, але і пастаўлялі яе на продаж. Панскія ўладанні пашырыліся за кошт сялянскіх «палосак», павялічыліся адработкі і грашовыя выплаты прыгонных. «Валочныя» вёскі мелі характэрную планіроўку: жыллё і гаспадарчыя пабудовы размешчаны на супрацьлеглых баках вуліцы. Дарэчы, такую адметнасць Нізок захоўвае дасюль. Зразумела, тут не знойдзеш чатырохсотгадовых хат, аднак будынкі пачатку мінулага стагоддзя, напэўна, адшукаюцца.

У XIX ст. Нізок у ліку больш чым 30 вёсак і 17 фальваркаў уваходзіў у склад маёнтка Халуі, які належаў Фадзею Завішу і яго сыну Івану. Усяго ва ўладанні пана было 726 цяглавых двароў, 47 агароднікаў (якія мелі толькі прысядзібныя надзелы) і 124 бабылі (якія не мелі ні зямлі, ні гаспадаркі). Па розных вёсках маёнтка сялянскія надзелы складалі ад 10 да 14 дзесяцін. У той час у Нізку было 53 дворы (з іх 9 бабыльскіх) з 370 жыхарамі. Цікава, што асабліва распаўсюджаным тады ў вёсцы было прозвішча Трус, якое мелі гаспадары 13 двароў — амаль чвэрць вёскі. Захаваліся звесткі пра селяніна Антонія Атраховіча — 34-гадовага ўдаўца, разам з якім жылі шасцёра пляменнікаў-сірот. Каня ў яго не было, а са свойскай жывёлы селянін трымаў 3 валоў, карову, 5 авечак і 2 свінні. Вялікая гаспадарка, якая дазваляла хіба толькі зводзіць канцы з канцамі. Толькі пры надта ўдалым раскладзе (калі быў вялікі ўраджай) селянін мог рэалізаваць частку ўраджаю. Звычайна прадаваўся маладняк авечак, буйная рагатая жывёла, свіны тлушч і сала, зрэдку — лён і палатно (яго звычайна ледзь хапала на ўласныя патрэбы — на пашыў адзення). Цікава, што кароў тады трымалі выключна для атрымання гною для ўгнаення палеткаў, малака ў дзень надойвалі па 4—5 літраў.

Слова ад Кандрата

У 1842 годзе ў Нізку пачала працаваць суконная фабрыка, прадукцыю з якой рэалізоўвалі ў Мінску, Гродне, Вільні і іншых гарадах ды мястэчках. У 1882-ім адкрылася царкоўна-прыходская школа. На той час у Нізку на 47 двароў налічвалася 547 жыхароў, а ў 1917 г. ужо было 118 двароў з больш чым 700 жыхарамі. Бадай што ў гэты час вёска мела самую вялікую колькасць насельніцтва за ўсю гісторыю свайго існавання. Пасля рэвалюцыі ў Нізку на базе царкоўна-прыходскай пачала працаваць працоўная школа першай ступені. У сярэдзіне 1920-х гадоў настаўнікі Антаніна Сарокіна і Тамаш Шыбко вучылі тут 92 хлопчыкаў і дзяўчынак. Магчыма, на адным з першых урокаў маленькія нізаўчане тады з цікавасцю слухалі легенду аб з'яўленні іх роднай вёскі, якую я пачуў ад загадчыцы тутэйшай бібліятэкі-музея Ліяны Тападзе:

— Спачатку гэта была невялічкая вёска і стаяла яна на ўзгорку. Падчас навальніц нярэдка маланкі білі прама ў хаты, было шмат пажараў. Святар падказаў людзям, што трэба будаваць жыллё ў іншым месцы, крыху ніжэй. Калі ў месцічаў пыталіся, дзе яны жывуць, то тыя адказвалі: «Вунь там — у нізку». Адтуль і пайшла назва.

Ліяна ТАПАДЗЕ распавядае пра знакамітых землякоў.

«І павялося: Ніз, Нізок — бы той шаўковы паясок, ён і прыгожы, і трывалы…» Гэта радкі з верша, які Ліяна Тападзе склала аб паходжанні назвы знакамітай вёскі. Кажа, што ў гэтых мясцінах, мабыць, нейкая асаблівая аўра, якая быццам нараджае мастацтва. І сапраўды — Нізок можа ганарыцца многімі свайго землякамі. 5 сакавіка 1896 года тут з'явіўся на свет Кандрат Крапіва. Як ён сам пасля напіша ў аўтабіяграфіі: «Нарадзіўся я ў вёсцы Нізок Уздзенскай воласці Мінскай губерні Ігуменскага павета. У сям'і майго бацькі, Кандрата Міхайлавіча Атраховіча, гэта была выдатная падзея: нарадзіўся наследнік. Спадчына, праўда, была не такая вялікая. Яна складалася з шасці дзесяцін прыдатнай і непрыдатнай зямлі ды таго бог ведае якога набытку, што на гэтай зямлі можна было нажыць». Будучы класік беларускай літаратуры першую школу настаўніцай пачатковых класаў сорак гадоў, пасля была тут буфетчыцай, а таксама… галоўным качагарам. Другая тутэйшая настаўніца Антаніна Тарасаўна Барталевіч у вёсцы апынулася ў 1952-ім. Узгадвае, што спачатку займалася па хатах, адначасова ўсёй талакой школу будавалі, бо старую спалілі ў вайну. Цяжка было, але неяк весела, нават яшчэ дзесяць гадоў таму Нізок звіней ад дзіцячых галасоў.

Як расказаў мне старшыня Уздзенскага сельскага Савета Леанід Дубовік, цяпер у Нізку крыху больш чым сотня двароў і 211 жыхароў, з якіх каля 90 — пенсіянеры. Аднак і дзяцей няшмат — усяго 15. Таму, мабыць, і закрылі тут школу, затое пачаў працаваць дом сацыяльных паслуг — таксама прымета часу. Яшчэ ёсць крама і фельчарска-акушэрскі пункт. Вось, напэўна, і ўсе цяперашнія адметнасці. Між тым, пры спрыяльным «раскладзе» Нізок мае ўсе шанцы на будучыню. Перш за ўсё дзякуючы тутэйшым знакамітасцям. Варта толькі прыкласці пэўныя намаганні. Зразумела, без дапамогі тут не абысціся — як заўважыў Леанід Дубовік, у Міністэрства культуры з прапановамі звярталася пляменніца Кандрата Крапівы, аднак адказ месцічаў зусім не парадаваў.

…Як расказвала Алена Валожына, некалькі гадоў таму пабывала яна ў Ізраілі (там дачка жыве). Прыгожа — побач Міжземнае мора, цёпла, садавіны шмат. Аднак у гасцях добра, а на радзіме ўсё ж лепш. Як напісаў некалі Паўлюк Трус:

Ой вёска, вёска пры гасцінцы!
Пад ціхі гоман вербалоз,
Яшчэ з гадоў свайго дзяцінства
Я пакахаў цябе да слёз!

Лепш, напэўна, і не скажаш…

Мікалай ЛІТВІНАЎ,
Фота аўтара.
Уздзенскі раён.

таратурна-мастацкі альманах «Нізокскае жыццё» за 1922 год, які паэт складаў разам з Іосіфам Герасімовічам. Між іншым, цяпер стары сшытак — сапраўдны рарытэт і ацэньваецца даволі дорага. Па ім мы можам уявіць Нізок 1920-ых гадоў: падзеі, людзей, іх думкі і спадзяванні. Сам Паўлюк ужо праз год, у 1923-ім пайшоў у дарослае жыццё, калі скончыў Уздзенскую сямігодку і паступіў у Беларускі педагагічны тэхнікум у Мінску. Пасля працаваў у рэдакцыі «Палескай праўды», вучыўся на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні педагагічнага факультэта БДУ. Ужо ў той час у самага маладога паэта было чаму павучыцца. Памятаеце:

Падаюць сняжынкі —
Дыяменты-росы,
Падаюць бялюткі
за маім акном.
Расчасалі вішні
Шоўкавыя косы
І ўранілі долу
снегавы вянок…

Напэўна, няшмат адшукаеш у беларускай лірыцы такіх радкоў. Паўлюк Трус памёр ад брушнога тыфу летам 1929-га і назаўжды застаўся 25-гадовым. «Ён быў выдатным талентам, рос бурна і моцна, ужо дайшоў да сваёй спеласці, ужо быў на грані свайго вялікага росквіту, ужо раскрываўся ва ўсёй сваёй шырыні», — напіша пасля Кузьма Чорны.

У Нізку нарадзіліся артыст Анатоль Трус (больш за паўстагоддзя ён адпрацаваў у Віцебскім тэатры імя Я. Коласа), празаік Лідзія Арабей, а таксама мастак Уладзімір Ткачоў. У гэтай вёсцы карані кампазітара Паўла Шыдлоўскага. «Тут шмат здатных людзей, — кажа былая настаўніца тутэйшай школы Алена Валожына. — Разумныя нейкія нізаўчане». Алена Фамінічна разам з бацькамі прыехала ў Нізок у 1931-ым, тут пайшла ў пяты клас. Дарэчы, адпрацавала ў мясцовай школе настаўніцай пачатковых класаў сорак гадоў, пасля была тут буфетчыцай, а таксама… галоўным качагарам. Другая тутэйшая настаўніца Антаніна Тарасаўна Барталевіч у вёсцы апынулася ў 1952-ім. Узгадвае, што спачатку займалася па хатах, адначасова ўсёй талакой школу будавалі, бо старую спалілі ў вайну. Цяжка было, але неяк весела, нават яшчэ дзесяць гадоў таму Нізок звіней ад дзіцячых галасоў.

Як расказаў мне старшыня Уздзенскага сельскага Савета Леанід Дубовік, цяпер у Нізку крыху больш чым сотня двароў і 211 жыхароў, з якіх каля 90 — пенсіянеры. Аднак і дзяцей няшмат — усяго 15. Таму, мабыць, і закрылі тут школу, затое пачаў працаваць дом сацыяльных паслуг — таксама прымета часу. Яшчэ ёсць крама і фельчарска-акушэрскі пункт. Вось, напэўна, і ўсе цяперашнія адметнасці. Між тым, пры спрыяльным «раскладзе» Нізок мае ўсе шанцы на будучыню. Перш за ўсё дзякуючы тутэйшым знакамітасцям. Варта толькі прыкласці пэўныя намаганні. Зразумела, без дапамогі тут не абысціся — як заўважыў Леанід Дубовік, у Міністэрства культуры з прапановамі звярталася пляменніца Кандрата Крапівы, аднак адказ месцічаў зусім не парадаваў.

…Як расказвала Алена Валожына, некалькі гадоў таму пабывала яна ў Ізраілі (там дачка жыве). Прыгожа — побач Міжземнае мора, цёпла, садавіны шмат. Аднак у гасцях добра, а на радзіме ўсё ж лепш. Як напісаў некалі Паўлюк Трус:

Ой вёска, вёска пры гасцінцы!
Пад ціхі гоман вербалоз,
Яшчэ з гадоў свайго дзяцінства
Я пакахаў цябе да слёз!

Лепш, напэўна, і не скажаш…

Мікалай ЛІТВІНАЎ,
Фота аўтара.
Уздзенскі раён.

Падрабязнасці

Уцякач-асуджаны чатыры месяцы жыў у «бліндажы» ў самым цэнтры Гомеля

Аб гэтым мы паведамлялі ўжо ва ўчарашнім нумары. Па шматлікіх просьбах чытачоў — падрабязнасці.

Якім чынам натрапіў на «бліндаж» 30-гадовы ўраджэнец Буда-Кашалёўскага раёна Сяргей Падольскі, зараз выяўляюць следчыя органы, якім ён дае паказанні ў сувязі з уцёкамі з папраўчай установы адкрытага тыпу № 17, дзе ён адбываў пакаранне за ўчыненае злачынства. Сёння, як паведамляе намеснік начальніка ўпраўлення дэпартамента выканання пакаранняў Міністэрства ўнутраных спраў па Гомельскай вобласці Сяргей Тарасенка, вядома, што зламыснік Сяргей Падольскі мае сярэднюю спецыяльную адукацыю, што ў яго тры судзімасці за адно і тое ж — крадзеж, што ён не жанаты.

Чацвёрты крадзеж ён учыніў у індывідуальнага прадпрымальніка, куды вышэйпамянёная папраўчая ўстанова ўладкавала яго на работу, за што на яго была заведзена чарговая крымінальная справа. Вось тады ён і вырашыў збегчы і не вярнуўся ў інтэрнат для такіх жа, як сам, дзе пражываў і знаходзіўся на кантролі. Праз дзесяць дзён яго аб'явілі ў рэспубліканскі вышук, бо нідзе ён выяўлены не быў. Па атрыманай жа інфармацыі яго бачылі ў Гомелі, але знайсці не ўдавалася да шостага лютага. Дарэчы, міліцыя тое месца, дзе знаходзіцца бліндаж, «прачэсвала» двойчы і ўсё — безвынікова: вельмі здорава ён быў замаскіраваны.

І калі, нарэшце, ён быў выяўлены, то супрацоўнікі яе здзівіліся таму камфорту, у якім уцякач жыў больш як чатыры месяцы. У бліндажы мелася электраасвятленне, працаваў тэлевізар, ложак быў абсталяваны выключальнікам з убудаваным святлодыёдам. Асуджаны наладзіў душ з 20-літровай каністры, умывальнік. Тут меўся поўны набор посуду, пральны парашок, электраплітка і выглядзе падэшваў ад электрапрасаў, запасы харчавання і г.д. Любімай газетай злодзея-ўцекача была «Віртуальныя радасці», а кнігай — «Небяспечны маскарад» Джарджэт Хейер.

Пры затрыманні Сяргей Падольскі супраціўлення міліцыі не аказаў. Яго чакае новая лава падсудных.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Беларусь прапанавала ўвесці мараторый на закон «Карта паляка»

Беларусь прапанавала ўвесці мараторый на прымяненне закона «Карта паляка» ў дачыненні да беларускіх грамадзян. Аб гэтым было заяўлена на беларуска-польскіх кансультацыях у Міністэрстве замежных спраў Беларусі, паведаміў прэс-сакратар МЗС Андрэй Папоў.

Паводле яго слоў, беларускі бок выказаў сур'ёзную заклапочанасць у сувязі з тым, што гэты закон, які прама закранае інтарэсы некаторых катэгорый грамадзян Рэспублікі Беларусь, быў прыняты ў Польшчы без якіх-небудзь папярэдніх кансультацый з нашай дзяржавай. Пры гэтым, падкрэсліў Андрэй Папоў, прапановы аб правядзенні такіх кансультацый неаднаразова выказваліся беларускім бокам.

Рэспубліка Беларусь асобна акцэнтавала ўвагу польскага боку на тым, што рэалізацыя закона ў яго цяперашняй рэдакцыі можа сур'ёзна дэстабілізаваць міжнацыянальныя адносіны ў нашай краіне, выклікаць напружанасць у беларускім грамадстве, парушыць яго стабільнасць і спарадзіць недавер паміж беларускімі грамадзянамі розных нацыянальнасцяў. Для пераводу дыялогу ў канструктыўнае рэчышча беларускі бок прапанаваў польскім калегам выйсці з сумесным зваротам у кампетэнтныя міжнародныя структуры, уключаючы Венецыянскую камісію Савета Еўропы, з просьбай аб правядзенні незалежнай юрыдычнай экспертызы закона «Карта паляка» на яго адпаведнасць міжнародным нормам. Да атрымання такога заключэння Беларусь прапанавала ўвесці мараторый на прымяненне закона. Беларускі бок запрасіў Польшчу да прадаўжэння дыялогу па гэтым пытанні і выказаў надзею, што польскі бок прыме выказаныя прапановы.

На кансультацыях беларускі бок завастрыў таксама ўвагу польскіх калег на праблемах, з якімі сутыкаюцца грамадзяне нашай краіны пры звяртанні за візамі ў консульскія ўстановы Польшчы пасля яе ўступлення ў зону дзеяння Шэнгенскага пагаднення. Гэта датычыцца і невыканання ўзгодненых тэрмінаў візавых заявак, наяўнасці адмоў у выдачы візаў, чэргаў каля консульскіх устаноў Польшчы. Бакі абмяняліся праектамі пагадненняў аб спрошчаным парадку перасячэння мяжы жыхарамі прыгранічных раёнаў дзвюх краін, што палегчыць трансгранічнае супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Польшчай, паведаміў Андрэй Папоў.

БЕЛТА.

«ГРЫПОЗНАЯ ХВАЛЯ» ЗАЧАПІЛА ВІЦЕБШЧЫНУ

Паводле інфармацыі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, на сёння эпідэміяй грыпу ахоплены ў краіне ўжо 30 адміністрацыйных тэрыторый і 7 кантрольных гарадоў. Пераважная колькасць «грыпуючых» раёнаў размяшчаюцца на тэрыторыі Гродзенскай і Мінскай абласцей. На Брэстчыне «грыпуюць» жыхары Брэсцкага, Драгічынскага і Іванцэвіцкага раёнаў, на Магілёўшчыне — Бялыніцкага, Асіповіцкага і Чэрыкаўскага раёнаў, а на Віцебшчыне — Чашніцкага і Пастаўскага. З абласных цэнтраў эпідэмія грыпу аб'яўлена толькі ў Мінску, Гродне і Брэсце. Як бачна, Віцебшчыну «грыпозная хваля» ўжо зачапіла, а вось Гомельшчына пакуль трымаецца. У сувязі з хваробай больш як 30 працэнтаў навучэнцаў вучэбны працэс быў спынены ў 24 установах адукацыі, у тым ліку ў школах Першамайскага і Цэнтральнага раёнаў сталіцы.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Казкі для дарослых

ЖАНОЧАЯ «ЎЛАСНАСЦЬ»

…Сядзім разам з сяброўкай, п'ём каву «ўпрыкуску» з маленькімі кавалачкамі карычневага цукру — ён менш шкодны, а ад расстройства дапамагае не горш, чым звычайны.

Віка сёння расстроеная, гэта факт — скрыначка з цукрам спусташаецца на вачах.

— Уяўляеш, — скардзіцца яна, — муж захапіўся сайтам «Аднакласнікі», гадзінамі сядзіць ля камп'ютара… Я неяк дзеля цікавасці зазірнула на яго «старонку» — ну так, на ўсякі выпадак, каб быць у курсе… А там — куча жаночых фатаздымкаў, некаторыя практычна «топлес». Пытаюся — хто гэта? Адказвае — аднакласніцы… Не, ну ты такое бачыла? Яшчэ і абураецца: маўляў, зараз усе «прасунутыя» людзі сядзяць у «Аднакласніках», вышукваюць старых знаёмых, адкрываюць іх нанова… Здаліся мне гэтыя яго «адкрыцці»! Раней хоць тэлевізар разам глядзелі, а цяпер і гэтага няма. Я яму ўчора ўмову выставіла: або я, або яны… Як думаеш, спрацуе?

Ну што тут скажаш? Выстаўляць мужчыне ўмовы і прымушаць рабіць выбар — увогуле гіблы нумар, асабліва калі няма стопрацэнтнай упэўненасці, што ён зробіць яго правільна і перавага застанецца за вамі. Зразумейце мяне правільна, я — не за канкрэтнага мужчыну, я — супраць уласніцтва і замаху на асабістую прастору ўвогуле. У рэшце рэшт, муж — таксама чалавек і таксама мае права на маленькі пакойчык з надпісам «чужым уваход забаронены». Ён жа не абураецца, калі вы гадзінамі абмяркоўваеце з сяброўкай «апошнія навіны», хоць у глыбіні душы і падазрае, што восемдзесят працэнтаў гэтых навін датычыцца зносінаў з іншымі мужчынамі.

Я ўвогуле ўсё часцей прыходжу да высновы, што большая частка моцных і трывалых шлюбаў у нас пабудавана менавіта на дыктатуры. Прычым дыктатуры жаночай. Няважна, як яна праяўляецца: у выглядзе канкрэтных, яўных забарон і жыцця «па секундамеру» — з істэрычнымі допытамі, абнюхваннем кашуль і рэвізіяй кішэняў, ці як вытанчаная гульня на нервах — з выдатна зрэжысаванымі «сардэчнымі прыступамі» і «страчваннем прытомнасці». Мэта адна: поўнае і канчатковае падпарадкаванне «свайго» мужчыны. Крок улева, крок управа — расстрэл, падскок на месцы расцэньваецца як спроба паляцець… Часам, каб вывесці мужа на «чыстую ваду» і ўлічыць ва ўсіх існуючых і неіснуючых грахах, жанчына так хітра расстаўляе сеткі, што ён пападаецца на раз-два, не паспеўшы нават як след «нашкодзіць»… Вось пасля гэтага і пачынаецца сапраўднае пекла.

Як гэта ні дзіўна, мужчыны ў большасці сваёй істоты наіўныя і даверлівыя, як дзеці, і часам шчыра адгукаюцца на каварныя прапановы сваіх благаверных «паплакацца ў камізэльку» і «выкласці ўсё начысцюю» — маўляў, тады «за гэта нічога не будзе». Асабіста мой жыццёвы вопыт падказвае, што ўсё адбываецца якраз з дакладнасцю наадварот. Ні адзін дыктатар не даруе здрады — ён за гэта помсціць, прычым помсціць бязлітасна і бессэнсоўна.

Людзі нараджаюцца свабоднымі. Жывуць свабоднымі. Да шлюбу. Потым на іх надзяваюць нябачныя, але вельмі адчувальныя ланцугі, прыплятаючы сюды ні ў чым не вінаватага Гіменея. Я, безумоўна, за адказнасць. Але і за давер. Ну, нельга сілком прымусіць мужчыну сядзець каля вашых каструль і патэльняў ці назіраць, як вы накручваеце валасы на бігудзі… Лепш ён у гэты час «сходзіць» у Інтэрнэт і перадасць прывітанне аднакласніку. Ці аднакласніцы. Той загарэлай бландзінцы са здымка… Безумоўна, яму прыемная яе ўвага. Яна ж не бачыць ні яго лысіны, ні піўнога жывоціка, ні «трэнікаў» з пухірамі на каленках. Яна арыентуецца толькі на яго здымак (дзесяцігадовай даўнасці) на экране. І для яе ён — па-ранейшаму той самы Пеця—Саша—Дзіма, гумарыст і завадзіла, які па-майстэрску гуляў у валейбол, сачыняў прыкольныя пародыі на аднакласнікаў і адным сваім позіркам прымушаў дзявочыя сэрцы біцца часцей… Дарэчы, вельмі верагодна, што і сама яна важыць зусім не 53 кілаграмы, таму наўрад ці пажадае расчароўваць вашу каштоўную «палавіну» асабістай сустрэчай, і далей бясконцыя перапіскі справа не пойдзе. А калі нават яго аднакласніца і сапраўды ўся з сябе супермадэль… Што перашкаджае і вам заняцца сабой? Ну, хоць бы перастаць паглынаць булачкі, седзячы перад тэлевізарам, і пачаць выконваць просценькія фізічныя практыкаванні?

Магчыма, наступная выснова вас не супакоіць, але людзі па натуры сваёй — істоты палігамныя. Прычым, і мужчыны, і жанчыны. Безумоўна, многім хацелася б, захоўваючы ўласную палігамнасць, бачыць у якасці спадарожніка жыцця толькі манагамны варыянт (інакш кажучы, аднажонца, ды яшчэ і без «шкодных» думак). Але так не бывае. І калі ва ўсё гэта пастаянна ўдумвацца і на гэтым, як цяпер кажуць, замарочвацца, можна проста звар'яцець.

Адна разумная жанчына-псіхолаг некалі сказала: чым мацней ты будзеш нацягваць «ланцуг», на якім «навязаны» твой мужчына, тым далей ён адляціць, калі вырвецца. Ад дыктату таксама можна рана ці позна стаміцца, тым больш ад хатняга. Прыкладаў, калі ўзорна-паказальныя бацькі сямействаў раптам з'язджаюць з катушак і пускаюцца ў адзіночнае плаванне, колькі заўгодна…

Людміла, мая былая суседка па пад'ездзе, у вольны час любіла пагартаць запісную кніжку мужа, спадзеючыся знайсці там «кампрамат» у выглядзе незнаёмых жаночых імёнаў і нумароў тэлефонаў. Рабіла яна гэта віртуозна, падчас наведвання мужам туалета ці ваннага пакою, паколькі іншай магчымасці не было — кніжка заўсёды ляжала ў яго партфелі. І, як кажуць, за што баролася, на тое і напаролася: аднойчы ўбачыла незнаёмыя ініцыялы — П.С., (якія, зразумела, адразу падаліся падазронымі), а побач з імі нумар тэлефона. Ледзь дачакаўшыся, пакуль муж зноў скрыецца ў запаветнай кабінцы, Людміла кінулася да тэлефона. Але па нумары ніхто не адказаў. Упэўненая, што тэлефануе палюбоўніцы мужа, жанчына круціла і круціла дыск. Толькі замест доўгачаканага «алё» з трубкі даносіліся доўгія гудкі. Бліжэй да апоўначы, даведзеная да адчаю сваімі ж хваравітымі фантазіямі і да глыбіні душы абураная тым, што нехта асмеліўся паквапіцца на яе «ўласнасць», Людміла вырашыла пайсці ў наступленне. Прыціснуўшы мужа да сценкі (у прамым і пераносным сэнсе), яна толькі што не абцугамі спрабавала выцягнуць з яго імя. Муж не здаваўся — бажыўся, што ўяўлення не мае, каму належаць гэтыя праклятыя «П.С.». Праз некалькі гадзін допытаў ён проста не вытрымаў — скокнуў з балкона, балазе, гэта быў першы паверх… Толькі раніцай, гадзін у восем, на тым канцы провада знялі трубку. Зусім не загадкавы, а раздражнёны жаночы голас паведаміў Людміле, што яна патэлефанавала ў пашпартную службу (што, відавочна, і азначала «П.С.»). Інцыдэнт быў вычарпаны праз хвіліну, а вось муж да Людмілы вярнуўся не так хутка…

Дарэчы, тая мая знаёмая, псіхолаг, ніколі, ні разу ў жыцці не задала свайму спадарожніку жыцця пытання «дзе ты быў?», кіруючыся мудрым правілам: не хочаш пачуць хлусню, ні аб чым не пытайся. Самае цікавае, што менавіта муж пачынаў нервавацца з-за гэтай яе «абыякавасці» і хутчэй спяшаўся расказаць аб тым, як прайшоў дзень… Магчыма, крыху хлусіў. «Але ж, — гаварыла яна, — рабіў ён гэта, каб зберагчы **мой** спакой і **нашы** адносіны. У рэшце рэшт, усё іншае не так ужо і важна».

Мудрасці гэтай жанчыны можна толькі пазайздросціць…

Наталля УЛАДЗІМІРАВА.

КВАТЭРЫ ТАННЕЮЦЬ…

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

Калі попыт на такое жыллё яшчэ пэўны час будзе заставацца на мінімальным узроўні, то патанненне «хрушчовак» будзе працягвацца і надалей.

Між іншым, уладальнікі невялікіх аднапакаёвак нават у дзевяціпавярховых дамах прамысловых раёнаў сталіцы таксама знізілі планку. Зараз такое жыллё прапануецца па кошце ў межах 1900 долараў за квадратны метр агульнай плошчы.

Разам з тым самая вялікая колькасць прапаноў прыпадае на стандартныя панельныя аднапакаёўкі, кошт якіх вагаецца ў межах 65—75 тысяч долараў.

Дарэчы, першая сур'ёзная хваля сёлетняга патаннення жыллёвай нерухомасці закран

ЧАМУ НЕ ХАПАЕ ДАКТАРОЎ У ВЁСЦЫ?

Той факт, што на Ганцаўшчыне ўсе дактары, у тым ліку і маладыя спецыялісты, забяспечаны жыллём, не мог не прыцягнуць увагі. Гэта лепшы паказчык у вобласці, хоць сам раён, у эканамічным плане, не ўваходзіць у лідзіруючую групу.

— Некалькі гадоў таму мы пачалі адчуваць адток урачоў з раёна, — патлумачыў старшыня райвыканкама Уладзімір Столяр, — і гэта прымусіла нас прыняць меры, каб змяніць сітуацыю ў лепшы бок. Здараецца, што цяпер вясковы ўрач нават можа выбраць сабе жыллё.

Кіраўнік раёна меў на ўвазе выпадак, калі ў в. Люсіна доктар засялілася ў адну кватэру, а затым перайшла ў другі катэдж, які прыйшоўся ёй больш па душы.

Наяўнасць жылля — дадатковы фактар, які прывязвае маладога спецыяліста да месца сваёй працы, але ён не заўсёды з'яўляецца вырашальным.

Дактары Аляксандр і Галіна МІНЦЫ.

Напрыклад, у в. Малькавічы працаваў урачом малады хлопец і хоць меў жыллё, але як толькі жонка атрымала дыплом, з'ехаў з ёю ў Брэст. Сёння тут гаспадарыць Іван Хала — учарашні выпускнік Гродзенскага медыцынскага ўніверсітэта. Ён разам з жонкай, таксама ўрачом, прыехаў у Малькавічы. Сям'я адразу атрымала дом.

— Мне давялося размаўляць са сваімі аднакурснікамі, якія працуюць у розных рэгіёнах Беларусі і аказалася, што толькі на Ганцаўшчыне адразу даюць жыллё, — паведаміў Іван Хала.

Сям'я пачала прыводзіць дом у парадак, укладваць у яго грошы. У раёне спадзяюцца, што на гэты раз дактары ў Малькавічах затрымаюцца назаўсёды, як гэта зрабіла сям'я ўрачоў Мінцоў у Хатынічах, што бліжэй да Івацэвіцкага раёна. Аляксандр Кузьміч — загадчык участковай бальніцы, а яго жонка ходзіць у падначаленых, але гэта па дакументах, бо Галіна Іванаўна часта можа замяніць мужа — адным словам, сямейны падрад, ды яшчэ і шматпрофільны. Гэта афіцыйна: муж — тэрапеўт, а жонка — дзіцячы ўрач. Іншым разам прыходзіцца і рану зашыць. Аднойчы Галіна Іванаўна хлопцу на галаву наклала 16 швоў. Усю ноч не спала і ў прыцемках пабегла праведаць, аказалася, дарма хвалявалася — пацярпелы нацягнуў на галаву шапку і падаўся на работу.

Сёння ў Хатынічах пражывае 2600 чалавек. Штогод тут нараджаецца прыкладна 30—35 дзяцей, а за 28 гадоў працы праз рукі Галіны Мінец прайшло іх каля тысячы, бо яна не толькі лечыць дзяцей, але і прымае роды. Таму і ведае доктар усіх маладых і малых у Хатынічах па імені.

Здараліся і неардынарныя выпадкі. Аднойчы прымала роды ў цемры, бо ў хаце абрэзалі правады за даўгі. Машына фарамі свяціла ў акно — і ўсё абышлося.

А адна жанчына адцягвала роды да апошняга і не дайшла да бальніцы. Галіна Іванаўна выйшла насустрач, а тая ляжыць на снезе — пачаліся схваткі. Затое дзіця назаўсёды стала для вёскі Снегавіком.

У Мінцоў дзве дачкі — старэйшая працуе доктарам у вёсцы ў Ляхавіцкім раёне, а малодшая яшчэ будзе ўрачом — вучыцца ва ўніверсітэце. Адным словам, каму як не гэтай сям'і ведаць усе тонкасці жыцця і работы вясковага доктара. Дык чаму ж Аляксандр і Галіна Мінец засталіся ў Хатынічах, сярод лесу і балота?

— Адноўчы мне муж вырашыў паказаць, што такое сапраўднае Палессе, — расказала Галіна Іванаўна пра адзін эпізод са свайго жыцця, — бо я Палесся добра і не бачыла — мы родам з Гродзеншчыны. Ад райцэнтра праедзеш па асфальце ці такім жа чынам у суседнюю вёску, а тут ляснымі дарогамі праз увесь Ляхавіцкі раён. Хатынічы пасля той паездкі здаліся раем. Тут усё ёсць — толькі жыць!

Сапраўды, у Хатынічах магазіны, бібліятэка, Дом быту, усе паслугі «пад рукой», а ўчастковая бальніца, быццам «лялька» — паўмільярда ўклалі ў яе. Далёка не ў кожным багатым раёне ёсць у вёсцы такая бальніца, дык чаму б не працаваць. Аляксандр Кузьміч выказаў сваю думку:

— Каб працаваць у вёсцы дактарам, трэба, найперш, вызначыцца — знайсці сваё месца на зямлі. І тады ўсё будзе проста. А маладыя хочуць мець усё і адразу. Дом, машыну, добрыя грошы, усе радасці быту, а так не бывае. Спачатку трэба папрацаваць, «засвяціцца», паказаць, на што ты здольны, а затым на нешта прэтэндаваць. Малады, яшчэ не зусім вопытны чалавек, не хоча і 10 хвілін лішніх папрацаваць — мой час закончыўся, альбо за кожную хвіліну плаці. Сённяшняе пакаленне надта прагматычнае. А ў вёсцы толькі ў нядзелю выхадны, але і ён, бывае, спакойна не пройдзе, ды што там нядзеля, калі сярод ночы здараецца разбудзяць — чалавеку кепска.

— Работа не ў цяжкасць. Іншым разам прыйдзеш у хату — дзіця крычыць у калысцы, а маці няма. Вось і пойдзеш шукаць па суседзях малако і соску. У дактары трэба ісці, калі ёсць прызванне, а ў вясковага доктара — жыццё неспакойнае і рабочы дзень у яго ненармаваны. Тут не скінеш халат і не скажаш: «Маё дзяжурства закончылася і бывайце здаровы». Субота — рабочы дзень, а ў нядзелю таксама лепш быць на месцы і нікуды не выязджаць з вёскі. А маладым сумна, ім патрэбны забавы, каб было ўсё пад рукой і шмат вольнага часу. А які час можа быць, калі ты пайшоў на свой хлеб і маеш сям'ю?! — падтрымала размову Галіна Іванаўна.

Але бывае і водпуск. Летам, калі людзям няма часу хварэць, а трэба збірацца чарніцы, бальніцу на месяц зачыняюць і адзін з дактароў ідзе ў водпуск. На стацыянары вісіць замок, але вяскоўцы прыходзяць са сваімі балячкамі і тут шыльду на дзверы не павесіш: «Усе пайшлі ў водпуск!».

І хоць у вясковага доктара зарплата і больш высокая, чым у гарадскога, але ў першага і клопату значна больш. А гэта маладых часта і палохае.

З мясцовымі жыхарамі ў дактароў Мінцоў паразуменне, магчыма, людзі ў Хатынічах спакойныя і непераборлівыя, але бываюць і пакрыўджаныя. Напрыклад, прыйшоў на прыём чалавек нападпітку ці не атрымаў бальнічнага — прад'яўляе прэтэнзіі. Але ў Хатыніцкай бальніцы ўрачы стараюцца з людзьмі быць у добрых адносінах.

У Хатынічах да бальніцы ўсе прывыклі і многія нават не разумеюць, як ім пашчасціла, што можна прыйсці на прыём да доктара, які паслухае, выпіша лякарства ці нават пакладзе пад кропельніцу. І нікому ў галаву не можа прыйсці, што ў горадзе на кропельніцу трэба і ў чарзе пастаяць пэўны час, калі не за свае грошы. А захварэла дзіця, то яго праведае Галіна Іванаўна, яна ж гэтаму малому і пупавіну перавязала.

Вясковы доктар — гэта чалавек асобага складу, выбраннік лёсу. І толькі такія, як Мінцы, застаюцца ў вёсцы, бо на ўсё жыццё выбралі свой шлях і не прыкідвалі, якім ён будзе.

Бывае, што з вёскі доктар пераходзіць і ў райцэнтр. Вось калі Аляксандр Рабешка пакінуў Люсіна, то жыхары ўзялі і напісалі яму пісьмо-падзяку, а гэта прыемна не менш, чым атрымаць падзяку ад начальства. Рабешка перайшоў у Ганцавічы і тут жа атрымаў кватэру. Такое вось стаўленне да дактароў у раёне. Але тым не менш урачоў не хапае.

— У нас штат запоўнены толькі на 60 працэнтаў, нам патрэбна яшчэ прыкладна 20 урачоў, — сказаў галоўны ўрач райбальніцы Вячаслаў Саковіч. — Нашы дактары працуюць на паўтары стаўкі і мы, па магчымасці, стараемся маладым спецыялістам яшчэ даплачваць. На сёння іх у нас дзесяць чалавек і ўсе забяспечаны жыллём.

Калі пад вечар вяртаўся праз тры раёны дамоў, прыкмеціў, што толькі ў Ганцавіцкім над ворывам стаяла парнасць, і гэта ў лютым! Які сюрпрыз на гэты раз падрыхтавала прырода раёну? А раптам небывалы ўраджай? Будзем спадзявацца.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.
Ганцавіцкі раён.

Экслібрыс «Звязды»

Аповед аб беларускім казачніку

Днямі ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва адбылася прэзентацыя кнігі «Мікола Селяшчук. Гучанне музыкі нябёсаў», якая была выдадзена ў заснаванай у 2005 г. выдавецтвам «Мастацкая літаратура» серыі «Мастакі Беларусі». Выпуск быў ажыццёўлены пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Кніга прысвячаецца вядомаму жывапісцу, майстру кніжнай графікі, лаўрэату Дзяржаўнай прэміі Беларусі Мікалаю Селешчуку. Мастак нарадзіўся ў 1946-м, памёр у 1996-м. Трагічная смерць у Італіі надала яго асобе адценне загадкавасці. Усяго сорак дзён мастак не дажыў да пяцідзесяцігоддзя, якое збіраўся адзначыць першай вялікай персанальнай выстаўкай, так і не выдаў ужо падрыхтаваны да друку альбом твораў. Першая кніга аб яго творчасці выйшла праз дзесяць гадоў пасля яго смерці. У ёй чытач знойдзе ўспаміны сяброў і калег, эсэ, дзённікі мастака, фатаздымкі і рэпрадукцыі работ.

Выданне кнігі стала лагічным працягам юбілейнай выстаўкі, якую наладзіў увосень 2007 г. Нацыянальны мастацкі музей да 60-годдзя М. Селешчука. Пра гэта гаварыла ў сваім уступным слове мастацтвазнаўца, складальнік кнігі Наталля Шаранговіч: «Мікола быў такой шматграннай фігурай, што ніводнае адзінкавае сведчанне не магло б паказаць яго шматаблічнасць і знакавасць для нашай культуры. Маімі суразмоўцамі былі тыя, хто вучыўся з Міколам Селешчуком, хто разам рабіў першыя крокі ў творчым асяродку, сябраваў з мастаком, датыкнуўся да дзівосных якасцяў яго натуры. Нельга было абысціся без развагаў мастацтвазнаўцаў і крытыкаў, якія ў розныя гады засведчылі цікавасць даследчыкаў да творчасці майстры. Вялікая ўдача, што знайшліся дзённікавыя запісы Селешчука, пры ўсёй фрагментарнасці развагаў, яны засведчылі цвёрдасць яго прынцыпаў і перакананняў. На старонках гучаць галасы аднакурснікаў і сяброў мастака, яго настаўнікаў і калег, журналістаў, літаратараў, дзеячаў культуры — Г. Вашчанкі, Л. Шчамялёва, Т. Бондар, Р. Баравіковай, В. Славука, У. Савіча, У. Слабодчыкава, А. Кашапарава, Я. Коктыша...

Кніга не была б такой поўнай і цікавай, калі б над яе візуальным вобразам не папрацаваў мастак Андрэй Савіч, які прааналізаваў сістэму жывапісу М. Селешчука і ўлічыў пры афармленні кнігі асаблівасці яго творчага светапогляду, густы і прыярытэты творцы.

Людміла ПАШКОЎСКАЯ.

ЗАЛАТЫ МЕДАЛЬ ЗА САЦЫЯЛЬНУЮ АДКАЗНАСЦЬ

Трэці год запар ЗП «Брыціш-Амерыкан Табака Трэйдынг Компані» атрымлівае залаты медаль у намінацыі «Сацыяльна адказны брэнд».

Гэта намінацыя прафесійнага конкурсу «Брэнд года» садзейнічае папулярызацыі канцэпцыі сацыяльнай адказнасці бізнэсу сярод прадпрыемстваў рэспублікі. Трое з іх былі ўдастоены залатых медалёў, астатнім удзельнікам былі ўручаны ганаровыя дыпломы. Сярод найбольш значных сацыяльных інвестыцый «Брыціш-Амерыкан Табака», рэалізаваных у 2007 годзе, — партнёрства з Нацыянальным мастацкім музеем, Мінгарвыканкамам, дзейнасць у межах Каліцыі па папярэджванні курэння сярод непаўналетніх, падтрымка арганізацый, якія аказваюць дапамогу сацыяльна неабароненым слаям насельніцтва, правядзенне экалагічных акцый.

Святлана БАРЫСЕНКА.

36,6°

Задавальненне прыходзіць не адразу

Нягледзячы на тое, што ў аснове палавой схільнасці і ў мужчын, і ў жанчын ляжаць адны і тыя ж механізмы, заснаваныя на дзеянні палавых гармонаў, сэксуальныя паводзіны і само стаўленне да сэксу ў абодвух полаў абсалютна рознае. Гэтаму ёсць і біялагічнае, і псіхалагічнае растлумачэнне.

У мужчын выпрацоўваецца значна больш мужчынскіх палавых гармонаў, якія і адказваюць за сілу палавой цягі. Таму жанчыны (і самкі ў прыродзе) больш стрыманыя і спакойныя ў сэксуальных адносінах. У той жа час выхаванне спрыяе таму, што аблічча актыўнага мужчыны і пасіўнай жанчыны сталі ўзорамі для паводзінаў. З ранняга дзяцінства менавіта такія мадэлі з'яўляюцца ўзорамі для пераймання. Парадокс заключаецца ў тым, што дзяўчынкі ўступаюць у перыяд палавога выспявання раней за хлопчыкаў, хлопчыкі ж значна хутчэй пачынаюць адчуваць сэксуальныя заклікі, а не проста рамантычную закаханасць. Тым не менш, хоць дзяўчаты пачынаюць палавое жыццё раней за юнакоў, мужчыны перажываюць аргазм з першай эякуляцыі, і далей — пры кожнай, а жанчыны — не заўсёды, а тое і ніколі ў жыцці. Біёлагі лічаць, што жаночаму полу прырода прынцыпова не дала перажыванне аргазму, а толькі ўзбуджэнне, таму што самка настолькі важная для працягу роду, што не мае права «страціць галаву» нават у моманты страсці. Тая ж кошка ў любы момант блізкасці можа стрэсці з сябе партнёра і пабегчы за мышшу, а кот у прынцыпе не заўважае, што робіцца навокал. Можна сказаць, што сярод жанчын, якія нарадзіліся да 1920 года, перажывалі аргазм пастаянна ці часта ў 3 разы менш, чым сярод народжаных пасля 1950 года. Такім чынам, за два пакаленні пачуццёвасць жанчын стала ўтрая большай. Акрамя таго, у 2—3 разы выраслa колькасць жанчын, якія з задавальненнем успрымаюць ласкі і актыўна на іх адказваюць, у тым ліку і тыя, якія практычна не ўспрымаліся бабулямі.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Прысмакі, цацкі і дзіцячы смех...

У рамках Года здароўя Беларускі саюз жанчын арганізаваў дабрачынную акцыю ў Рэспубліканскай псіханеўралагічнай бальніцы.

Падарункі прывезлі ў другое дзіцячае аддзяленне, якое разлічана на 40 ложкаў. У бальніцу паступаюць малыя з чатырох да чатырнаццаці гадоў з усёй рэспублікі для абследавання і лячэння. Дзеткі ў аддзяленні знаходзяцца да трыццаці дзён пад наглядам урачоў, педагогаў, настаўнікаў-лагапедаў, псіхатэрапеўтаў і псіхолагаў.

— Сёлета гэта першая акцыя нашай арганізацыі, — гаворыць Рэгіна Давідовіч, намеснік старшыні Беларускага саюза жанчын.— Дзецям мы прывезлі сокі, прысмакі і мяккія цацкі, а артысты тэатра лялек паказалі дзецям спектакль. Мы ўвогуле плануем наведаць многа дзіцячых ўстаноў аховы здароўя, асабліва тыя, у якіх дзеткі маюць патрэбу ў душэўнай цеплыні. Дзецям, якія знаходзяцца далёка ад сваіх родных мясцін, такія маленькія святы проста неабходны, лічаць супрацоўнікі бальніцы. І сапраўды, добры спектакль ад прыгодах Вені-Пуха прынёс у гэтае аддзяленне дзіцячыя ўсмешкі і адчуванне радасці — і гэта, напэўна, дапаможа хворым дзецям хутчэй паправіцца.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ДАЛЁКАЯ ІНДАНЕЗІЯ ХОЧА З НАМІ ГАНДЛЯВАЦЬ

Учора завяршыла работу першае пасяджэнне міжурадавай беларуска-інданезійскай камісіі па гандлёвым, эканамічным, навуковым і тэхнічным супрацоўніцтве. Дэлегацыі краін узначальваюць намеснікі міністраў замежных спраў.

Вынікам перамоў стане актывізацыя двухбаковага гандлю і пашырэнне наменклатуры тавараабароту. Пакуль мы прадавалі ў Інданезію толькі калійныя ўгнаенні і шыны, адтуль везлі каўчук, тытунёвую сыравіну, камп'ютара.

Леанід ТУГАРЫН.

Утерянный бланк страхового полиса Белгосстраха по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу серии БЛ № 0430218 **считать недействительным.**

ИЗВЕЩЕНИЕ

о проведении открытого аукциона на право заключения договора аренды земельного участка в г. Логойске

Арендодатель — Логойский районный исполнительный комитет
Организатор аукциона — КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Целевое назначение земельного участка	Площадь земельного участка	Срок аренды земельного участка	Характеристика расположенных на участке сооружений и инженерных коммуникаций	Начальная цена права заключения договора аренды земельного участка
1	г. Логойск, ул. Заводская	623250100001001659	для строительства станции технического обслуживания автомобилей	0,5000 га	20 лет	земельный участок свободен от застройки	48 805 000 руб.

Аукцион состоится 11.03.2008 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 321. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Аукцион проводится со следующими условиями: победитель аукциона обязан оформить материалы предварительного согласования места размещения земельных участков для строительства инженерных коммуникаций к объекту строительства, оплатить стоимость предмета аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении победителю аукциона земельного участка и возместить стоимость документации, подготовленной для проведения аукциона. Договор аренды земельного участка заключается с победителем аукциона в течение 2-х рабочих дней после оплаты стоимости предмета аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документацией и земельным участком. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 10.03.2008 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости». УНП 690324015.

POST factum

У АМСТЭРДАМЕ ЗАКРЫЮЦЬ БАРДЭЛІ?

Карэнная рэканструкцыя сёння пагражае большай палове «дамоў цярпімасці» знакамітага «квартала чырвоных ліхтароў», размешчанага ў цэнтры горада.

Згодна з «Планам 1012», распрацаваным мясцовай мэрыяй, на яго месцы павінны з'явіцца мастацкія галерэі і атэлье, рэстараны і іншыя падобныя ўстановы. Мяркуецца, што рэалізацыя гэтай праграмы дазволіць знізіць узровень злачыннасці ў квартале, дапаможа ў барацьбе супраць наркабізнэсу і гандлю людзьмі.

Днямі супрацоўніцы і наведвальнікі бардэляў Амстэрдама, а таксама спачуваючыя ім мясцовыя жыхары правялі маніфестацыю пратэсту, на якой выказаліся супраць планаў гарадскіх уладаў. Паводле інфармацыі PIA «Навіны», удзельнікі акцыі прайшлі маршам па набярэжных і вуліцах квартала, а потым наладзілі мітынг на цэнтральнай плошчы Амстэрдама. Маніфестанты заявілі, што падзяляюць заклапочанасць мэрыі наконт паляпшэння крымінагеннай абстаноўкі, аднак лічаць, што плануемае закрыццё трох чвэрцяў бардэляў — занадта суровая мера. Пасля прамоў у абарону традыцыйнага квартала прысутныя адстаялі хвіліну маўчання.

Усяго ў дэмастрацыі ўзялі ўдзел некалькі соцень чалавек. Наконт сутыкнення маніфестантаў з паліцыяй нічога не паведамлялася.

БРЫТАНЦЫ ЗАСТАЛІСЯ БЕЗ «БЛІННАГА» ЗАБЕГУ

Адзінаццаць гадоў таму жыхары горада Рыптан (графства Йорк) аднавілі старую традыцыю раз у год бегаць навыперадкі па маставой з патэльняй бліноў, на бягу падкідваць блінкі ўверх і лавіць на патэльню. У гарадзе зноў загучаў «блінны» звон, які роўна ў 11 гадзін раніцы абвяшчаў пачатак гэтага захапляльнага спаборніцтва.

Аднак сёлета арганізатары мерапрыемства заявілі, што «блінны» забег праводзіцца не будзе. Паводле слоў свяшчэнніка Рыптана Кейт Джукс, ёсць шэраг прычын, з-за якіх прыйшлося адмяніць спаборніцтва. Сярод іх — пытанне бяспекі і здароўя ўдзельнікаў. Страхавыя кампаніі патрабуюць ад арганізатараў загадзя вызначаць ступень магчымай рызыкі. Галоўная прычына незапакоенасці — брукаваная вуліца, на якой удзельнікі могуць спатыкнуцца і ўпасці.

ШЛЮБНЫЯ ЛАНЦУГІ

Брытанская юрыдычная фірма Seddons правяла апытанне 2 тысяч мужчын і жанчын, якія знаходзяцца ў шлюбе. Яно паказала, што 59 працэнтаў апытаных жонак зараз жа развяліся б са сваімі «паловамі», калі б не баяліся без іх апынуцца ў беднасці. Акрамя таго, высветлілася, што 12 працэнтаў згодны застацца ў нешчаслівым шлюбе дзеля бесклапотнага жыцця. Амаль 30 працэнтаў заявілі, што засталіся б у шлюбе, які надакучыў, абы толькі пазбавіцца ад патрасенняў. Яшчэ 37 працэнтаў засталіся б дзеля дзяцей.

Як паведаміла агенцтва ФактNews, 42 працэнты рэспандэнтаў баяцца, што пасля разводу яны страцяць дом, 30 працэнтаў — што застануцца ні з чым; 30 працэнтаў мужчын баяцца, што пасля разводу не змогуць займацца выхаваннем дзецей. 12 працэнтаў удзельнікаў заявілі, што ў іх шлюбе няма кахання, а 35 працэнтаў мяркуюць, што іх шлюб стане такім у самы бліжэйшы час. 56 працэнтаў прызналіся, што яны не цалкам шчаслівыя ў шлюбе. Прыкладна столькі задумваюцца аб разводзе. Палова ўдзельнікаў апытання згодна звярнуцца ў псіхалагічную кансультацыю да таго, як накіравацца ў суд. А 20 працэнтаў лічаць, што гэта таго не варта. Чвэрць рэспандэнтаў не разводзяцца толькі з-за неабходнасці несці юрыдычныя расходы.

ДОБРАГА ЧАЛАВЕКА ЗАЎСЁДЫ БОЛЬШ. НА ЖАЛЬ

Камунікабельныя і дружалюбныя людзі значна часцей за нервовых пакутуюць ад залішняй вагі. Да такой высновы прыйшлі японскія спецыялісты пасля праведзенага маштабнага даследавання.

Паводле інфармацыі PIA «Навіны», у даследаванні ўзялі ўдзел больш за 30 тысяч японцаў ва ўзросце ад 40 да 64 гадоў, якія пражываюць на паўночным усходзе краіны. Спецыялісты вывучалі сувязь росту і вагі чалавека з яго псіхалагічным тыпам.

Высветлілася, што людзі з індэксам масы цела BMI (Body Mass Index) больш за 25, які часта выкарыстоўваюць як паказчык тучнасці, звычайна вылучаюцца адкрытым характарам. З улікам іншых фактараў (напрыклад, курэння) мужчыны-экстраверты ў 1,73 раза больш схільны да паўнаты, чым інтраверты. У жанчын гэтае суаднясенне 1,53. У той жа час людзі, якія церпяць ад рэгулярных нервовых перажыванняў, у два разы часцей, чым ураўнаважаныя, маюць BMI 18,5.

Індэкс BMI вымярае суаднясенне вагі цела і росту, і вызначаецца дзяленнем вагі цела на велічыню яго росту ў квадраце. Індэкс да 20 адзінак указвае на дыстрафію, 20—24 — на нармальную вагу для дарослых, індэкс 25—26 — на атлусценне першай ступені, 27—29 — атлусценне другой ступені, 30—35 — атлусценне як хвароба. Пры індэксе 36 і вышэй узнікае пагроза для жыцця.

Вучоныя спадзяюцца, што вынікі іх даследавання дапамогуць справіцца з атлусценнем і паўнатой.

СПРЭЧКА — НА ЗДАРОЎЕ!

Час ад часу спрачацца са сваім партнёрам — не так і дрэнна, гэта нават падаўжае вам жыццё.

Паводле папярэдніх даных даследавання амерыканскай Школы аховы здароўя і кафедры псіхалогіі Мічыганскага ўніверсітэта, партнёрам не варта хаваць сваё раздражненне, калі яны хочуць пазбегнуць заўчаснай смерці. Як паведамляе газета El Pais, вынікі даследавання паказалі: калі адзін альбо абодва партнёры не хаваюць пачуццяў, у другую і трэцюю — пары, дзе адзін з партнёраў выказвае негатыўныя эмоцыі, а другі іх падаўляе, у чацвёртую — сем'і, дзе абодва яе члены не рэагуюць на крытыку партнёра. У 26 сем'ях, дзе муж і жонка хавалі свой негатыў, было зарэгістравана 13 смярцей. У астатніх 166 сем'ях — 41 смерць.

Калі абодва партнёры падаўляюць сваё раздражненне падчас нападак і несправядлівай крытыкі з боку «палавіны», верагоднасць заўчаснай смерці павышаецца ў два разы ў параўнанні з астатнімі тыпамі сем'яў — такую несуцяшальную выснову зрабілі вучоныя. «Калі чалавек падаўляе гнеў і хавае раздражненне, не імкнецца вырашыць праблему, вось тады праблемы і ўзнікаюць», — сцвярджае кіраўнік даследаванняў, прафесар Мічыганскага ўніверсітэта Эрнэст Харберг. Ён заўважыў, што размова ў першую чаргу ідзе пра неапраўданую крытыку і неспраўядлівыя абвінавачванні партнёра. Адэкватная і «за справу» крытыка не выклікае ў яе ахвяры крыўды і гневу.

ПАЦАЛУНАК — АД КАРЫЕСУ

Глыбокі пацалунак з пранікненнем языка папярэджвае карыес. Ён стымуляе ўтварэнне слiны, якая, дзякуючы ўтрыманню ў ёй кальцыю і фосфару, абараняе зубы. Масаж дзяснаў, які адбываецца падчас пацалунку, папярэджвае парадантоз.

Шчыры страсны пацалунак выклікае напружванне 30 мышцаў твару. Скура разгладжваецца, становіцца больш пругкай, лепш забяспечваецца крывёй. Падчас пацалунку расходуецца 12 калорый. Вучоныя падлічылі, што тры пацалункі ў дзень (па 20 секунд кожны) пазбавяць вас ад цэлага кілаграма лішняй вагі.

Пацалунак мае і абязбольвальнае дзеянне (дзякуй гармону эндарфіну). Чым больш страсці ў пацалунку, тым больш эндарфіну выпрацоўваецца арганізмам.

Самае галоўнае: пацалунак — гэта экспрэс-аналіз на генетычную сумяшчальнасць. Мозг імгненна праводзіць хімічны аналіз слiны і прымае рашэнне — падыходзіць вам партнёр ці не.

З медыцынскага пункту гледжання працягласць пацалунку павінна складаць не менш як 3 хвіліны. Пры гэтым варта часцей глядзець адно аднаму ў вочы і датыкацца языкамі.

Забытае? Новае? Вечнае!

НАВОШТА ДАРЫЦЬ НА ВЯСЕЛЛІ НОЖ?

Соф'я Парфір'еўна з Мінска задае пытанне: «Дзяўчыне на вяселлі падарылі нажы. Жыццё ў іх з мужам не склалася — пажылі толькі год. Нажы гэтыя ў яе ёсць і цяпер. Што з імі рабіць?»

У разгалінаванай, але дакладна ўпарадкаванай сістэме правілаў, прадпісанняў, рэгламентацый і забаронаў існуе вялікая колькасць нарматыўна-этыкетных палажэнняў, якія датычацца побытавых рэчаў вяскоўца. Прычым часцей за ўсё яны маюць характар дакладна сфармуляванай забароны, сутнасць якой не падлягае абмеркаванню: так трэба — і ўсё тут! Напрыклад, **не пазычай суседу нічога ў вялікае свята, асабліва солі і агню** (запалак). На шматлікіх сустрэчах нам задаюць пытанне: «А што рабіць, калі мая суседка пастаянна прыходзіць у нядзелю і што-небудзь просіць?» Па-першае, **ніколі ў такім выпадку не давайце тое, што папрасілі, з рук у рукі** — пакладзіце на стол і паназірайце за паводзінамі суседкі: калі скопіць, падзякуе і пабяжыць, ведайце — нічога кепскага яна вам зрабіць не хацела, проста гаспадыня яна крыху не арганізаваная. Калі ж пачне выкручвацца і рабіць так, каб вы перадалі рэч з рук у рукі — ганіце з хаты і больш на парог не пускайце. Па-другое, сёння ўжо многія ведаюць, як засцерагчы свой падворак ад няпрошаных гасцей.

Падчас падарожжаў па Беларусі мы не адзін раз сутыкаліся з той сітуацыяй, калі людзі давалі папіць вады, але толькі не з таго — сямейнага — кубачка, які стаяў каля вядра. І гэта правільна.

Да шэрагу прадметаў, якія патрабуюць да сябе асаблівага стаўлення, адносяцца шматлікія прадметы хатняга ўжытку і побытавагаспадарчага карыстання. Іх не тое што не пазычалі, а нават імкнуліся хаваць ад чужых вачэй. Да шэрагу аналагічных рэчаў адносіцца і нож.

Але перш чым распавесці падрабязную гаворку пра гэты незвычайны прадмет нашага побыту, трэба зрабіць адну вельмі важную заўвагу. Прастора сялянскай хаты дакладна дзялілася на жаночую і мужчынскую палавіны. Частка хаты, якая месцілася з левага боку ад уяўнай асявой лініі, што злучала парог і чырвоны кут, была замацавана за жанчынай, Вестай, якая падтрымлівала ў хаце ачаг (сёння зона печы). Правая палавіна — зона мужчынскага ўладарання. Адпаведным чынам падзяляліся і прадметы хатняга побыту і гаспадарчыя прылады працы. Дзіўна тое, што мужчынскі пачатак сімвалізавалі вострыя, колючыя, рэжучыя прадметы, якія нагадвалі мужчынскі дзетародны орган: сякера, нож, іголка, малаток, брусок, што касу менціць і г.д. Разам з тым шэраг рэчаў сімвалізавалі жаночы пачатак, нагадваючы жаночае ўлонне: дзяжа, даёнка, збан, міса, ложка, серп, шпілька, падкова. Даволі часта гэтыя рэчы ўтваралі «сямейную пару»: ключ і замок, прамы нож і загнуты серп, прамая іголка і загнутая шпілька, прамы крук і загнутая завеса, дышаль і дуга, аглоблі і хамут і г.д.

Магчыма, гэта функцыянальнае, семантычнае і знакавае размежаванне «парных» прадметаў хоць у нейкай ступені дапаможа зразумець прычыну таго, чаму нажы нельга дарыць сваім родным і блізкім, а тым больш, як сказана ў лісце «нявесце на вяселлі».

Абрадавыя сітуацыі, у якіх нож з'яўляецца галоўным атрыбутам, даволі шматлікія і разнастайныя. Але пры гэтым складваецца ўражанне, што ўсе яго шматпланавыя кантэксты зводзяцца **да дзвюх асноўных функцый — перасцерагаць, абараняць і дзяліць, адразаць, адлучаць.** Узгадаем некалькі сітуацыйных прыкладаў.

Зусім нечакана нож аказаўся самым запатрабаваным прадметам у першы год жыцця нованароджанага. Каб не сурочылі малако парадзіхі, у той час, як яна карміла дзіця, жанчына абавязкова падкладвала пад сябе нож. Да моманту хрэсьбін нож засцерагаў нехрышчонае дзіця, каб яго не «падмянілі» нячыстая сіла. У той час, калі па вёсцы неслі нябожчыка, маці клала нож у калыску дзіцяці вастрыём да вуліцы. Калі ж немаўля пужалася, то яго «мерылі» нажом. У гэты час ён быццам бы ўцягваў — убіраў у сябе спуд.

Самым цесным чынам нож звязаны з хатняй зонай продкаў — парогам. Напрыклад, калі карова згубілася ў лесе, гаспадыня брала нож і тройчы абводзіла ім па перыметры дзвярэй, а затым павінна была ўтыркнуць яго ў парог. Лічылася, што ні адзін драпежны звер не кране карову пасля гэтага. Адпраўляліся да царквы хрысціць цераз нож, які клалі на парозе, каб па дарозе да дзіцяці не прычапіліся «прызоры».

Вядомы прадпісанні, што бытавалі ў народным асяроддзі, якія забаранялі карыстацца нажом у той ці іншай сітуацыі. У першы дзень выгану жывёлы ў поле, на Юр'я, пастух выконваў шэраг рытуальных дзеянняў, скіраваных на перасцярогу статка ад воўчых зубоў. Таму ў гэты дзень яму забаранялася браць з сабой нож. 2 верасня царква адзначае дзень Івана Галавасека, таму, каб у сям'і не здарылася бяда і сярод родзічаў не было вар'ятаў, у гэты дзень нельга было не толькі нічога рэзаць нажом, але нават і браць яго ў рукі.

У той жа час нож выконваў сваю галоўную ролю як прадмет, які дзяліў цэлае на часткі. Гэта побытавая функцыя асэнсавана ў традыцыйнай культуры па-свойму і стала падставай для ўзнікнення пэўных абмежаванняў і патрабаванняў. Так, набываць нож павінен толькі гаспадар; відаць, таму і наразаць хлеб таксама павінен мужчына. Калі ж у Купальскі дзень знахар збіраў святаянскія зёлкі, то зразаць іх трэба было толькі спецыяльным нажом, але ні ў якім разе ні тым, якім карысталася сям'я.

Функцыя дзяльбы, адлучэння, адмежавання нарадзіла шэраг забаронаў, звязаных з паводзінамі людзей за сталом:

- лічылася, што той, хто есць з нажа, будзе нястрыманым, злым, «вострым на язык», ад яго адхінуцца людзі;
- забаранялася пакідаць нож на стале і асабліва ўтыркнутым у хлеб: гэта прывядзе да таго, што дамачадцы будуць пастаянна сварыцца між сабой;
- менавіта таму забаранялася класці нож на стале паміж мужам і жонкай.

Зусім нядаўна ў Кіраўскім раёне адна гаспадыня расказала нам пра тое, якое цікавае абрадавае дзеянне выканала яе маці на другі дзень вяселля, калі маладыя збіраліся ад'язджаць да маладога. Маці паклала на стол новы боханок хлеба, адрэзала акраец і сказала: «Глядзі, дачушка, як гэтую гарбушку назад не прыкле

ЛЕЎ З-ПАД КОСАВА І ЛЕТАМ ПА СОЛІ НА САНКАХ...

Летась палацава-паркавы ансамбль у Косаве наведалі 12 тысяч 231 чалавек, з якіх 649 замежных грамадзян, а платныя паслугі былі аказаныя на суму 10 мільёнаў 698 тысяч рублёў.

Музей-сядзіба Тадэвуша Касцюшкі і палац Пуслоўскіх, больш вядомы як Косаўскі замак, сапраўды прыцягваюць наведвальнікаў. Прычым акрамя нашых суграмадзян у мястэчка, якое знаходзіцца за дванаццаць кіламетраў ад Іванцэвічаў, едуць замежныя турысты — з Польшчы, Літвы, Францыі, Швейцарыі, Італіі, Даніі, Германіі, Аўстраліі, Бразіліі і далёкай Амерыкі. Месцы тут маляўнічыя: прыгожыя вадаёмы ды гістарычныя помнікі даюць адчуванне невыпадковасці ўсяго, што адбываецца з чалавекам, які прыйшоў у гэты свет. Каб зразумець гэта, варта даведацца хоць бы пра аднаго — Тадэвуша Касцюшку, які паходзіў з гэтых месцаў. Музей-сядзіба Т. Касцюшкі разам з палацам Пуслоўскіх складаюць Косаўскі палацава-паркавы ансамбль.

Палац Пуслоўскіх і сядзіба Тадэвуша Касцюшкі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Цэнтр яго — музей-сядзіба Т. Касцюшкі: дом, у якім 4 лютага 1746 г. (паводле меркавання некаторых навукоўцаў) нарадзіўся Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка-Сяхновіцкі — сын беларускай зямлі, які ў далейшым стаў нацыянальным героем Польшчы, ЗША, ганаровым грамадзянінам Францыі. Сядзіба пабудаваная ў XVII—XVIII стагоддзях. У час Другой сусветнай вайны яна згарэла, а праз 60 гадоў адноўлена на старым падмурку, з «родным» склепам, знойдзеным падчас археалагічных раскопак у 2003 г. Урачыстае адкрыццё сядзібы адбылося 23 верасня 2004 г.

У музеі пяць пакояў мемарыяльнай часткі (сенцы, кухня, пакой маці, працоўны кабінет, гасцёўня), гістарычны пакой і склеп, адчыненыя для наведвальнікаў, якія маюць магчымасць уявіць нават абстаноўку дома XIX стагоддзя — такая мэбля магла быць у сям'і Тадэвуша Касцюшкі. У гістарычным пакоі знаходзяцца матэрыялы, якія былі знойдзены падчас археалагічных раскопак у 2003 г. на месцы былой сядзібы: герб і радавое дрэва роду Касцюшкаў, косы касінераў (зброя сялян-паўстанцаў), кандэлябры XIX стагоддзя і іншыя.

Але ўражанне пра мыццё, якое было тут амаль дзвесце гадоў таму, будзе не поўным, калі не паглядзець на славуты Косаўскі замак — архітэктурны помнік сярэдзіны XIX стагоддзя. Ён быў пабудаваны па ініцыятыве Вандаліна Пуслоўскага — прамысловага магната, які валодаў спіртзаводам, шклозаводам, цагельным заводам і суконнымі мануфактурамі. Узводзіць палац пачалі ў 1838 г. Цэгла прывозілася з-за мяжы, кожная цагліна была абгорнутая ў асобную паперку, а ў раствор для будаўніцтва былі дабаўлены яйкі птушак і кроў жывёл. Палац пабудаваны ў стылі неаготыкі: у ім 12 зубчастых вежаў, кожная з якіх сімвалізуе месяц года, 365 маленькіх вежаў, што адпавядае дням года, стрэльчатыя вокны і байніцы. Замак быў абнесены амаль 3-метровай каменнай сцяной, а ўваход быў праз адну з дзвюх брам. Акрамя гэтага, вакол замка быў закладзены парк у некалькі дзесяткаў гектараў, у які былі завезены з-за мяжы сотні экзатычных дрэў і кустоў.

У замку было 132 пакоі, прычым усе — непаўторныя. Над кожным працаваў цэлы калектыў. У белым пакоі падлога была з двайнога шкла, а пад ёй плавалі сотні экзатычных рыбак — тут правілі балі. У рожовым і блакітным пакоях ішлі прыгатаванні да балю адпаведна жанчын і мужчын, у чорным — гулялі ў карты, сцены ў ім былі з чорнага мармуру. А яшчэ ж былі срэбны, залаты, шкляны, люстэркавы і іншыя пакоі...

Замак сіметрычны і мае два крылы: у адным з іх размяшчалася мастацкая галерэя і бібліятэка, якая налічвала каля 10 000 рэдкіх кніг. У другім размяшчаліся спальныя пакоі. Нягледзячы на шыкоўнае ўбранне ў палацы і шматлікую колькасць слуг, граф Пуслоўскі, як паведамляе адна з легендаў, вартаўнікоў не трымаў. Замест іх уначы па калідорах гуляў леў, які жыў у зімовым садзе на другім паверсе.

Але ёсць і іншыя легенды, якія вельмі інтрыгуюць. Адна з іх — пра тое, што сцяна, якая месцілася злева ад цэнтральнага ўвахода, была ў свой час мэтычнай. Калі да яе дакраналіся, яна іграла, і музыка раздавалася ва ўсіх 132 пакоях палаца. Ёсць меркаванне, што ад Косаўскага да Ружанскага замка праходзіў падземны ход працягласцю каля 25 км, па якім на карэце любіла катацца графіня Пуслоўская.

Вандалін Пуслоўскі быў настолькі багаты, што для сваёй жонкі наладжваў летнія катанні на санках. Тэрасы засціляліся вялізнымі белымі палотнішчамі, пасыпаліся вялікай колькасцю солі і па ёй, як па снезе зімой, на санках каталася графіня Пуслоўская. Забавы і капрызы багатых выглядаюць дзіўна ў любыя часы...

Палац стаў спадчынай сына В. Пуслоўскага Ляона, які жыў у асноўным за мяжой. Але не вельмі ён дбаў пра сваю беларускую спадчыну — любіў гуляць у карты і ў адзін момант прайграў вялікую суму грошай, змушаны быў прадаць палац за бясцэнак. Гэта адбылося напрыканцы XIX стагоддзя. З гэтага часу пастаяннага гаспадара тут не было, палац належаў купцу Аляксандраву, князям Трубяцкім, іншым знакамітым асобам. Пакуль не пачаліся войны. У час Першай сусветнай вайны палац быў разрабаваны і часткова разбураны. У «польскія часы» тут размяшчаліся ўправа і сельскагаспадарчая школа, дзе вучылі на аграномаў, садаводаў і пчалаводаў. А ў 1944 годзе ён згарэў разам з часткай парку.

Палац Пуслоўскіх захаваўся часткова. Сёння ад яго засталіся толькі сцены і сутарэнні. І хочацца спадзявацца, што ў хуткім часе пачнуцца работы па яго аднаўленні ў гасцінічна-турысцкі комплекс, як гэта было запланавана.

Ніна АШУРКЕВІЧ,
галоўны захавальнік музея-сядзібы Т. Касцюшкі.

Працяг тэмы

«...КАБ ПІСАЛІ НА РОДНАЙ МОВЕ»

Нашы чытачы па-ранейшаму цікавяцца паэзіяй. Такую выснову можна зрабіць на падставе лістоў, якія прыйшлі на адрас рэдакцыі пасля публікацыі «Паэты, якія ўзварухнулі свет» (4 студзеня 2008 г.). Чарговы зварот да Анталогіі беларускіх паэтаў, якую склаў Віктар Ярац, як і чакалася, даў магчымасць паразважаць пра сутнасць паэзіі і яе шлях да сваіх сённяшніх чытачоў. А таксама пра тое, на што здольнае шчырае слова, незалежна ад таго, на якой мове яно гучыць. Разам з тым нашы чытачы неабыякава паставіліся да каментарыяў Анталогіі рэдактара часопіса «Маладосць» Раісы Баравіковай, паставілі ў сваю чаргу пытанні: каго можна лічыць сапраўдным паэтам і як ім можна стаць. Сёння мы змяшчаем падборку лістоў, у якіх людзі выказалі свае меркаванні. І вельмі хацелі, каб гэтая тэма не абмяжоўвалася адной публікацыяй у нашай газеце.

Лярыса ЦІМОШЫК.

«На мой погляд, ці трэба было ўвогуле складаць спіс са 100 паэтаў? Бо калі ў першай дваццатцы ўзровень майстэрства прыкладна аднолькавы, за выключэннем трох першых класікаў, то розніца паміж 5-ай дваццаткай і першай істотная, што ўскосна і пацвярджае сам складальнік спіса. А ўвогуле, любая творчасць правяраецца часам. І вельмі часта, каго не прызнавалі пры жыцці, нашчадкі ўзносілі да вышыняў нябесных, а хто пры жыцці быў фаварытам, сыходзілі ў нябыт. Не зусім я згодны і з Раісай Андрэеўнай (пры ўсёй маёй глыбокай павазе). Бо напісаць дзесятак добрых вершаў можна, а вось пісаць на вельмі высокім узроўні дзесятак гадоў не кожнаму пад сілу.

А цяпер я хачу выказацца наконт сучасных паэтаў. Чытаючы ў газетах артыкулы пісьменнікаў і крытыкаў, я іх падзяляю на дзве часткі. У адных літаратары скардзяцца, што іх кнігі ніхто не чытае, а ў іншых, што піша ледзь ці не палова насельніцтва. Вакол адны графаманы і рыфмаплёты. Парадокс?! Аказваецца, не ўсё так ужо і дрэнна, аказваецца, наш народ у большасці сваёй — творчы. А вось літаратарам варта было б зірнуць на сябе збоку. На мой погляд, у літаратурных колах існуе звычайная дзедаўшчына (аб гэтым пісалі артыкулы ў «ЛіМ» паэты з перыферыі). Што дазволена адным, тое недапушчальна для іншых. Не трэба прыкладваць намаганняў, каб знайсці прыклады. Іх сотні. Члены Саюза пісьменнікаў схільныя да пераймання, дапускаюць такія ляпы, што прымушаюць чырванець нават першакласнікаў.

Мне, напрыклад, падабаецца творчасць Баравіковай, Сыса, Рублеўскай, Шніпа. У вас можа ўзнікнуць пытанне. А ці мае права крытыкаваць гэты таварыш? Так, маю. Як чытач, як чалавек з багатым жыццёвым вопытам. Пісьменнікі ж выдаюць свае кнігі для таго, каб данесці да чытача сваё бачанне свету і сустрэць разуменне з яго боку. А калі яны гавораць, што пішуць для сябе, для душы, у імя высокай паэзіі, на толькі ім зразумелай мове, то няхай выдаюць кнігі ў адным экзэмпляры і не плачуць, што іх творчасць не карыстаецца поспехам. Але мне здаецца, што яны хітруюць».

Павел СТАНЕВІЧ, *г. Орша.*

«Развагі вядомай пісьменніцы Раісы Андрэеўны Баравіковай, якія праходзяць чырвонай лініяй праз артыкул Ларысы Цімошык «Паэты, якія ўзварухнулі свет», змешчаны ў першым нумары газеты «Звязда» ад 4 студзеня 2008 года, маюць, на маю думку, супярэчнасць: «...пісаць што-небудзь спрабуюць многія людзі. З аднаго боку, гэта гаворыць пра тое, наколькі прыцягальная паэзія. А з другога — замінае сапраўднай, вялікай паэзіі. (?!) Таму што зніжаюцца густы, размываецца этыка прыгожага слова. Ідзе нейкі падмен сапраўдных каштоўнасцяў». (?)

Вы прапаноўваеце задумацца: «А ці варта чалавеку пісаць і нейкім чынам прыніжаць сябе і паэзію, калі ён не можа гэта рабіць годна? Можа лепш весці нейкія жыццёвыя дзённікі?». Тады дазвольце спытаць: ці магчыма навучыцца пісаць не пішучы? Як адшукаць «свой шлях у літаратуру»? Ці з першага радка Барадулін стаў народным? Ці адразу Вы, Раіса Андрэеўна, дасягнулі майстэрства? (Вашы творы — высокай жаноцкасці — вельмі паважаю.) Відаць, толькі ўпартай працай далося ўсё гэта і Яго Вялікасцю — Талентам. Таму, маё меркаванне, калі людзі хочуць пісаць — няхай пішуць, працуюць, праяўляюць свой талент. Вядома ж — у межах разумнага.

І — апошняе. У кожнага вялікага паэта ёсць свой ТВОР, які, па майстэрству, іншаму паэту пераадолець — НЕ ДАДЗЕНА, бо гэта паслана звыш. Таму выстройваць паэтаў «па вазе», прабачце, неяк не стасуецца з маім асабістым уяўленнем аб Паэзіі. Калі яно ёсць святое, то больш «свяцейшым» быць не можа. Але, хто ведае, куды мы коцімся? Можа і сапраўды Рыгор Барадулін мае рацыю:

...Час усё скапыціў наўкол.
Свет цямнець навучыўся ў медзі.
І прыходзіць канец бяседзе.
Дзякуй Госпаду за дазвол!»

У кожнага свой густ, спрачацца — безвынікова. Сапраўды, «які талент — такія і «краса і сіла» твора. У паэзіі — галоўнае, каб твор кранаў самыя глыбінныя стрункі душы, каб ад гэтага святлеў і ачышчаўся свет.

З павагай
Аляксандр МАТОШКА,
в. Янкавічы, Расонскі раён.

«Добра, што ёсць энтузіясты, якія неабыякавыя да беларускай літаратуры. А ў наш век, век тэхналагічнага развіцця, не варта забываць аб духоўным, і трэба пярыць беларускіх паэтаў, г.зн. рэкламаваць. Толькі мне не вельмі зразумела, ці адносяцца да беларускіх паэтаў тыя, хто піша на рускай мове. У спісах ста паэтаў яны напэўна не прадстаўлены. А яны ж грамадзяне Беларусі, і іх вершы не трэба перакладаць для рускага чытача. Ды і напэўна ёсць сярод іх такія, якія маглі б годна прадстаўляць Беларусь у гэтым спісе».

З павагай да вас і да вашай газеты Станіслаў ПАВЯЛЕЦКІ,
г. Орша.

«Піша вам беларуска, якая прыехала пагасцяваць да сваякоў з Расіі. Перабіраючы газеты, убачыла загаловак «Паэты, якія ўзварухнулі свет». Мяне вельмі ўразілі адносіны да народных творцаў. Яны і такія, і сякія, і пішуць з памылкамі, і не прафесійна і гэтак далей. Можа, хто з іх і хоча праславіцца, але слова народа — слова Божае. А тыя паэты, якія адрываюцца ад народа, для каго пішуць? Таму іх народ гэты і не разумее. Слухаю радыё. Дзе тыя цудоўныя радкі ў тэкстах, якія пісалі тыя ж Багдановіч, Вялюгін, Броўка, Бураўкін? Дзе новыя Ясеніны, Пушкіны, Купалы, Коласы? Можа, яны пішуць не тое і не так, як патрэбна? Вось назаўтра ад'язджаю са сваёй роднай, маленькай вёсачкі з-пад Оршы ў Расію, а душа засталася ў Беларусі. І мне вельмі хочацца, каб на маёй Радзіме станавілася ўсё больш творчых людзей, каб яны ў першыя часы хоць і з памылкамі, а ўсё ж пісалі на роднай мове».

Алена САСНОЎСКАЯ,
г. Смаленск.

ХРАМ, У ЯКІМ НЕ АБВАЛЬВАЕЦЦА ТЫНКОЎКА

Напачатку ў былой Русіноўскай сярэдняй школе быў створаны літаратурна-этнаграфічны музей. А неўзабаве на яго аснове ўзнік раённы Цэнтр рамёстваў. Пры сельскіх клубах некаторых вёсак Баранавіцкага раёна адкрыліся філіялы, і сёння Цэнтр рамёстваў з'яўляецца духоўным асяродкам раёна. Ды ўвогуле такіх цэнтраў, дзе была б так шырока прадстаўлена культурна-этнаграфічная спадчына беларусаў, у краіне адзінкі.

Тое, што ўдалося стварыць дырэктару Цэнтра Міхасю Бернату, уражвае. Фактычна ён адзін сабраў для музея гэтыя экспанаты, многія з якіх унікальныя. Напрыклад, дзе сёння можна знайсці воз, які меў бы драўляныя восі ці агромністую драўляную барану, зробленую без ніводнага цвіка і дроту? Але ж каштоўнасць музея не толькі ў старадаўніх прадметах побыту, але і раскрыцці духоўных памкненняў нашага народа, яго барацьбе за волю і нацыянальную годнасць. У экспазіцыі можна ўбачыць «Хрысціянскую думку», «Самапомач», «Плён», «Альманах таварыства Беларускіх школаў» — часопісы 30-х гадоў мінулага стагоддзя. Не забыты і паўстанцы 1863 года і ўсе знакамітыя людзі мінулага. Тыя, чый лёс быў звязаны з гэтым рэгіёнам.

— Гэта не проста музей — гэта Храм памяці, гістарычнага вопыту народа, — растлумачыў М. Бернат, паказаўшы на кузню, вятрак...

— Міхаіл Іосіфавіч, як я зразумеў, у нашым Храме тынкоўка не абвальваецца?

— Безумоўна, усё гэта толькі падмурак, на якім той Храм узводзіцца. Хацелася б, каб чалавек, які ступіў на тэрыторыю нашага Цэнтра, адчуў сябе часцінкай свайго народа.

Але сабраць экспанаты сёння справа нялёгкая. Найперш таму, што старых рэчаў ужо мала, ды і плаціць грошы трэба за ўсё.

Першы ветраны млын М. Бернат прывёз з Залюбіч — з вёскі свайго раёна. Толькі нядоўга той вятрак пастаяў каля музея. Нехта ўзяў ды спаліў яго. Некалі на раёне быў 41 вятрак і сярод іх у в. Паланэчка знаходзіўся ўнікальны — турбінны, 1819 года. Але той, радзівілаўскі, знішчылі. Спачатку знялі з ветрака цынкавую бляху, а затым час і людзі давяршылі справу.

Вось таму па другі вятрак давялося ехаць у суседні раён. А там старшыня калгаса задарма адразу аддаваць не хацеў. Але ж знайсці такую прамысловую архітэктуру, як млын — гэта яшчэ паўсправы, бо неабходна разабраць яго, перавезці і сабраць нанава, а гэта, зноў жа, грошы і рабочая сіла.

І як сказаў мой суразмоўца, на гэтыя ветракі ён патраціў каля 2 тысяч «зялёных» са сваёй кішэні.

У любым выпадку, сёння за ўсё трэба плаціць і пажадана наяўнымі. Ды і любы экспанат прасцей купіць, перадаўшы «жывыя» грошы з рук у рукі, а не афармляючы нейкія там паперы на куплю-продаж.

Каб стварыць экспазіцыю музея, неабходна мець энцыклапедычныя веды па гісторыі, этнаграфіі, культуры народа, і ў гэтым плане М. Бернат паказаў сябе чалавекам, з якім заўсёды цікава пагаварыць і адкрыць для сябе штосьці новае. Адночы здарылася, што на пасаду дырэктара Цэнтра рамёстваў назначылі новага чалавека, але праз паўгода ў раёне адумаліся і Бернат вярнуўся на сваё рабочае месца.

Цэнтру рамёстваў усяго дзесяць гадоў і калі яго параўнаць з Баранавіцкім краязнаўчым музеем, які існуе ўжо больш за паўвека, то апошні нібыта і выйграе колькасцю экспанатаў, але там усё раскладзена па перыядах, усё афіцыйна правільна, а душы няма: тут ляжыць костка маманта, а там прадукцыя мясцовага мясакамбіната — тыповы тагачасны падыход. А калі ў музеі чутная родная мова, то ўзнікае атмасфера даверу, і ўсе гэтыя экспанаты ўжо маюць дачыненне да цябе.

Зразумела, што любая экспазіцыя павінна хваляваць чалавека, выклікаць у яго пэўныя пачуцці і эмоцыі. На маю думку, арганізатарам раённага Цэнтра рамёстваў гэтага дасягнуць удалося. У кожнага чалавека павінен быць свой Храм, які яму найбольш блізкі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Запрашальнік

Суцэльная рамантыка...

Дзень Святога Валянціна, які з лёгкай рукі дзеячаў шоўбізнэсу і ў нас называецца Днём усіх закаханых, адзначыцца цэлай серыяй музычных імпрэзаў, прычым у самых розных накірунках — ад папулярнай музыкі да начной дыскатэкі. Публіцы прапануецца выбар на любы густ — і шэраг сюрпрызаў.

...ад Іскуі Абалян

Аўтарскі праект спявачкі «Каханне кіруе светам» ужо можна назваць традыцыйным — сёлета ён пройдзе ў другі раз і, гэтаксама як летась, будзе прадстаўлены ў двух фарматах. Спачатку, 13 лютага, у Палацы Рэспублікі ў зборным канцэрце выступяць папулярныя беларускія артысты, потым, 14 лютага, гэты канцэрт пакажа ў тэлеверсіі канал СТБ.

Ад удзелу ў святочнай праграме не адмовіўся ніводны запрошаны артыст — і гэта таксама добры знак. Аляксандр Ціхановіч, Ядвіга Паплаўская, Гюнеш, Тарыел Майсурадзе, Герман, Ганна Шаркунова, Аляксей Хлястоў, Іна Афанасьева, Ларыса Грыбалёва, Пётр Елфімаў, Галіна Шышкова, Віктар Пшанічны, Паліна Смолава, Саша Нема, Вольга Вронская, «Харлі», «Да Вінчы», Аляксандр Патліс, Вольга Плотнікава, нарэшце, сама Іскуі Абалян — многія з гэтых артыстаў аб'яднаюцца ў рамантычна-музычныя дуэты, адны ўжо знаёмыя публіцы, другія — нечаканыя. Напрыклад, чакаецца «дуэт» спявачкі і харэографа, спявачкі і акцёра-міма. Гэтаксама, калі эпідэмія грыпу не ўнясе свае карэктывы, будзе прадоўжана леташняя задума з дзіцячым дуэтам, прычым адной яго палавінкай, як мяркуецца, выступіць Ксюша Каліна — дачка Іскуі Абалян і прадзюсара Андрэя Каліны.

«Мне здаецца, што гэта дата — цудоўная нагода зрабіць падарункі не толькі каханым, але і ўвогуле ўсім блізкім людзям, — разважае прадзюсар СТБ Павел Каранеўскі. — Я, напрыклад, у якасці падарунка рэкамендую тэлегледачам гэты канцэрт. І абяцаю, што на працягу года ў нас будзе яшчэ некалькі цікавых праектаў як з папулярнымі, так і з альтэрнатыўнымі артыстамі. Няхай яны будуць праходзіць не часта, але затое — ад шчырага сэрца».

Агульная тэатралізавана-музычная праграма (нават з элементамі паэзіі) зможа больш як 20 песень і разлічаная прыкладна на 2 гадзіны. Усіх сюрпрызаў арганізатары не раскрываюць, прызнаюцца толькі, што канцэрт пачнецца... з канца.

...ад «Крамбамбулі»

Сваю праграму, якая будзе прэзентаваная 14 лютага ў сталічным «West World Club», гурт назваў проста, без лішняй мудрагелістасці — «Рамантычны канцэрт. Любімыя і новыя песні». Як абяцаецца, падчас выступлення прагучаць не толькі лепшыя хіты і свежыя навінкі, але таксама некалькі старанна падрыхтаваных сюрпрызаў — «дуэтаў з вядомымі дзяўчынкамі», як прадставіў іх Лявон Вольскі.

Так, плануецца, што разам з «Крамбамбуляй» рамантычныя кампазіцыі праспяваюць актрысы Святлана Зелянкоўская (тэатр імя Я. Купалы) і Ганна Хітрык (тэатр імя Я. Купалы, гурт «Детидетей»), рок-вакалісткі Руся («Indiga») і Вольга Самусік («Тарпач», «Zygimont Vaza»), фолк-выканаўца і радыёвядучая Маша Яр.

Асобным падарункам меламанам стане кампазіцыя «Грапа, к'янці і марціні», якую ўпершыню за 4 гады гурт выканае разам з опернай спявачкай Нінай Цішко. Гэты дуэт лідар калектыву называе «без перабольшвання легендарным», і збіраецца пры першым зручным выпадку абавязкова запісаць яго.

...ад Ірыны Дарафеевай

Напярэдадні аднаго з самых рамантычных святаў заслужаная артыстка Беларусі, нягледзячы на шчыльны гастрольны графік, зробіць асобны падарунак жыхарам сталіцы — прадставіць у КЗ «Мінск» сваю новую канцэртную праграму «Хачу быць марай».

Улічваючы просьбы, якія паступаюць ад слухачоў на тых ці іншых выступленнях, спявачка ўключыла ў святочны канцэрт большасць праверaных хітоў, у тым ліку, напрыклад, «Вышыта сарочка», «Дзяўчына на беразе», «Адлятай» і г.д. Цалкам магчыма, што прагучаць таксама і новыя песні, якія Ірына запісала напрыканцы мінулага года ў Маскве, на студыі Кіма Брэйтбурга, які з нядаўняга часу прадстаўляе інтарэсы артысткі на расійскай тэрыторыі — кампазіцыі «Нямногa прыгожых слоў», «Анёл мой», «Я мала ведаю пра каханне» і «Маленькая зіма» (аўтарам слоў да апошняй песні, заўважым, выступіў вядомы паэт Карэн Кавалеран).

Увогуле, калі прыгадаць працаздольнасць артысткі (за 2007 год Ірына Дарафеева паспела запісаць больш як тры дзесяткі новых песень, выпусціць аднаіменны альбом «Хачу быць марай» і прадоўжыць традыцыйны гастрольны тур па гарадах Беларусі «Пад мірным небам»), становіцца зразумела, што як мінімум адна праблема пры арганізацыі канцэрта не стаіць — праблема «ўкамплектаванасці» песнямі. Іх хопіць не толькі на Мінск, але і на Брэст з Баранавічамі, дзе Дарафеева выступіць 14 і 15 лютага адпаведна.

...ад лепшых дыджэяў

Акурат 14 лютага ў Футбольным манежы будуць абвешчаны вынікі галасавання за лепшага дыджэя Беларусі-2007. Ушанаванне і ўзнагароджанне пераможцаў пройдзе ў фармаце фестывалю танцавальнай музыкі «Night-LoveDance».

Арганізатары вялізнага танцавальнага шоў, якое прадоўжыцца да 6-й раніцы, запрасілі да ўдзелу ў ім як беларусаў, так і замежных гасцей. Настрой на танцпляцоўцы гасцям фестывалю будуць забяспечваць папулярныя сучасныя праекты: маскоўскі дуэт «MAO Music», малады, але ўжо раскручаны мінскі электра-хаус праект «Hanz&Gruber», гурты «Клёндайк», «CherryVata», і праект Таццяны Гарошка «Tanin Jazz». Гэтаксама на сцэне з'явіцца некалькі пачаткоўцаў — і адзін з пераможцаў цырыманіі «Лепшы дыджэй Беларусі-2007», якому трэба будзе на справе пацвердзіць свой тытул.

Агульная магутнасць гуку каля 200 кВт, 5 лазераў, два вялізныя экраны, 15-метровы светладыёдны экран і адмысловыя перформансы... Аматары ацэняць.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Анэля Тулупава, мая бабуля...

Мяне завуць Валерыя Саротнік. Вучуся на перакладчыка ў лінгвістычным універсітэце, пішу і перакладаю вершы і прозу.

Два гады таму брала ўдзел у конкурсе апавяданняў «ЗВЯЗДЫ» і заняла першае месца. І тады я нават не здагадвалася, што аднойчы падзялюся з вамі не сваім чарговым аповедам, а творам маёй бабулі. Для нашай сям'і 2008 год — юбілейны. Але юбілейны ў сумным сэнсе: першага лютага семдзесят гадоў споўнілася б Анэлі Тулупавай, пісьменніцы і паэтцы. І хочацца, каб яе не забывалі. Як стараемся не забываць яе мы — каб не рваўся ланцужок, што пачынаецца яшчэ з прадзеда, ланцужок гісторыі. ...Камусь з нас пашчасціла, мабыць, неяк залезці ў стары бабульчын куфар і разглядваць старамодныя ўпрыгажэнні, сукенкі, хусткі. Мне ж выпала даставаць з бабулінага куфара апавяданні, якія, нібыта пацеркі, сабраны з жывых гісторый, з асколкаў чалавечых лёсаў, з маленькіх, жыццёвых замалёвак — усё, пачынаючы з першых. Пра вясковую бальнічку, пра дзіўнага ўрача-рэнтгенолага, пра ганарлівую дзяўчыну, якая марыла стаць артысткай, але... Многія з гэтых твораў маюць нешта аўтабіяграфічнае. І нарэшце, вось адно з такіх пацерак-апавяданняў Анэлі Тулупавай.

Валерыя САРОТНІК.

Анэля ТУЛУПАВА

МАЛАДЗЯН

...Вось і падшэфная вёска. Нас, шэфаў, размяркоўвае па хатах Лазар Канцавейка — вёрткі, невялікага росту чалавек. Ён смяшыць усіх, вітаецца спачатку з дзяўчатамі, потым няспешна «ручкаецца» з мужчынамі, з кожным паасобку, паспяваючы яшчэ паспрачацца з некім. І, нарэшце, заяўляе:

— Што з вамі балакаць! Не перасакочаш. Пайшлі. Па хатах развяду.

Мы ідзём па вёсцы за Лазарам, а следам — басаногае «войска» вясковай дзятвы з піскам і смехам бяжыць па вуліцы, цвялячы Лазара:

— Маладзян! Маладзян! Ма-ладзян!

Я іду амаль побач з Лазарам і мне добра бачна, як ён нервуецца, чуючы гэтыя, відаць, даўно абрыдлыя яму, крыкі. Яно і нам ніякавата, усё-ткі мужчына ў гадах...Я таўхаю лінатыпіста Рыгора, той паварочваецца да дзятвы і паказвае свой здаравенны кулак. «Войска» спыняецца і заціхае...

— Вы, сакатухі, — кідае нам цераз плячо Канцавейка, — да Лявоніхі пойдзеце. Вось яе хата, пад шыферам. Сёння адпачывайце...

Праз хвіліну мы стаім каля веснічак, няўцямна разглядваючы на іх аб'яву: «ЗЛЫ ПЕВЕНЬ».

Я бяру ў рукі дубец і рашуча таўхаю веснічкі. Яны адчыняюцца. Каля гародчыка, дзе квітнеюць жоўтыя вяргіні, стаіць высокая мажная кабеціна з кошыкам лебяды ў руках, і разглядае нас.

— Мы з горада. Памагаць калгасу, — тлумачу я цётцы. — Дзядзька Лазар да вас на кватэру паслаў.

— Жывіце, — міласціва дазваляе старая.

— А певень? — баязліва выцягвае шыю мая сяброўка, аглядаючы двор.

— У супе, — неахвотна тлумачыць жанчына, — надакучыла мне гэтая шыльда. Людзі смяюцца. А ўсё — Лазар Канцавейка з Пірачыч. Загадаў, каб паперу начапіла. Певень неяк яго па двары ганяў...

Пакуль мы ўладкоўваемся, а Лявоніха спраўляе сваю няхітрую гаспадарку, у хату без стуку, неяк бокам уваходзіць старэнькая хударлявая бабуля і гучна вітаецца з гаспадыняй.

— Садзіся з намі абедаць, Глушка, — запрашае яе Лявоніха.

І пакуль мы ласуемся ўзварам, у старых пачынаецца размова — спачатку пра тое, што ў вёсцы няма каму працаваць, і людзей з горада ад спраў адрываюць. Потым — пра тое, што ў Лявоніхі гуркі не ўрадзілі. І, нарэшце, пераходзіць на нейкіх жукоў. А калі Лявоніха просіць у суседкі пазычыць мех гуркоў, каб засаліць, тая, недачуўшы, жахаецца:

— Саліць жукоў?!

Даслухаць размову не давялося — абліваючыся ўзварам, мы абедзве пырхнулі з-за стала. Толькі на вуліцы, ля вяргіняў, насмяяліся ўволю...

...Тры дні, як мы ў вёсцы. Здымаем яблыкі. Маладзяна бачылі адзін раз, здалёк, і ўжо пачалі забываць смешныя байкі пра яго. Але неяк вечарам Лявоніха напомніла нам пра Канцавейку. Было гэта так.

Мы збіраліся на скокі, на вуліцы ўжо чакалі хлопцы. Лявоніха працаздзіла малако, наліла нам па кубку, і крыкнула ў адчыненае акно:

— Ідзіце ў клуб, ухажоры! Сёння ж суд, а не скокі, маладзяна судзіць будуць.

— Прынамсі, — раптам сказала Рая, мая сяброўка, — чаму Канцавейку маладзянам клічуць?

— Сакрэту тут аніякага, — адказала старая, — вы прыбірайцеся, а я вам раскажу.

— Неяк мяне дачка з зяцем на рыбалку выцягнулі. Зяць крыху адышоўся, дачка непадалёк ад мяне рыбаліць, а я вогнішча расклала, бульбы напякла, юшкі нават варыла. Потым змерзла, улезла ў зяцевы джынсы, на галаву — картуз яго, на нос — чорныя акуляры ад дыму і камароў.

Гляджу, клыпае лугам Канцавейка. Цёпленькі-цёпленькі. Вітаецца, з п'яну мяне за хлапца прыняўшы. «Здароў, маладзян, — адказваю.» «І табе, малец, ужо ў вушы ўвялі? — абураецца». «Які я маладзян? Я Лазар. Канцавейка. З Пірачыч... Па мне, Пірачычы Пірачычамі застануцца. Жменя хацін, гарбузы на стрэхах, у копанцы — гусі, бабы ў гародчыках... Я табе так скажу, малец, яно і ў бабы душа цёплая. Толькі вось язык у бабы — халодны, нібы пуза ў лігашкі. А ўсё таму, што рот без шнуркоў... Была б тут мая Прося, скакалі б мы з табой, быццам бурбалкі ў кацялку. Баба, ведаеш, якое стварэнне! Ты ёй — кось-кось, а яна — хамут на цябе і пугай па спіне. Твая, бач, як вытанцоўвае ля вуды. Я хоць ад вучонасці не трашчу, а бабу наскрозь бачу. Вазьмі маю Просю. Трэцяя яна ў мяне. Не паспела кінуць другая, гэтая вакол мяне вакол заюном заюшылася. І ўсё меціць, каб шыю абшчапіць. Учэпіцца і звоніць, ну чыста парожы гляк. Прыляпла шаройкай, ні выплюнуць, ні пракаўтнуць. Здаўся я, малец. Прыцемкам гайсану цераз плот, нібы маладзян які, а назад, калі пеўні заталосяць. А яна сваё мікіціла. Паўсотні ледзь не размяняла, пяткі ад старасці рэпаюцца, а яна мяне ў сельсавет задумала весці. Прычапілася, перапісвай на сваё прозвішча. «Якія мы з табой маладыя, — кажу. — Людзі засмяюць!» А яна ўсё сваё. Зазлаваў я тады, дый ляпнуў — будзеш, маўляў, скуголіць, да Параскі падамся. Бабу бабай запалохаць хацеў. А яны ж — гай, але — як? «Кыш, — крычу, — вароны!» А яны мяне пад пахі — і ў сельсавет. З той пары ў маладзянах хаджу. Ад сораму сюды пераехаў, і тут празналі...» Вось так, — скончыла Лявоніха.

— А... Просю сваю ён не кінуў? — спыталі мы.

— Дзе там! Яна яму малое прывяла.

— Вось дык маладзян! — ухваліла Канцавейку Рая.

...Людзей у калгасным клубе — не прасунуцца. Адчынены дзверы і вокны, страшэнная задуха, але людзі цярпліва сядзяць і чакаюць суда над Лазарам.

За сталом, накрытым чырвоным абрусам — жанчына гадоў сарака і мужчына няпэўнага ўзросту са стомленым тварам і пакутлівымі вачамі. Ён раз-пораз выцірае лысіну хусцінай, ды глытае маленькімі глыткамі ваду са шклянкі.

— Хвядос! — крычаць з залы, — можа бутэльку прынесці?

Хвядос у адказ нясмела ўсміхаецца, бачна, што прапанова гэтая яму больш даспадобы, чым таварыскі суд. Пашаптаўшыся з жанчынай, Хвядос узнімаецца:

— Суд параіўся, — ціха гаворыць ён, — параіўся, і...

— Уключы свой мікрафон! — здзекуецца той жа голас.

— А ты стань на маё месца, — зазлавaў Хвядос. — Лазар Канцавейка, лезь на сцэну.

Лазара прасіць доўга не трэба. Ён тут як тут, скочыў на сцэну, і — А тут каля канторы, — не звярнула ўвагі на кпіны жанчына, — якраз супроць акон тувалет быў.

— Адны дзверы на дзве кабіны, — дадаў Лазар.

— Неяк пад вечар, — пайшоў па патрэбе старшыня калгаса, а Лазарка як сцярог таго часу, знайшоў бугая і прывёў

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



Цёплае пісьмо

ПРЫТУЛІЦЦА ДУШОЙ

У рэдакцыю «Звязды» прыйшло пісьмо з вёскі Лаўрышава Навагрудскага раёна ад прыхаджан храма Успення Прасвятой Багародзіцы. Пісьмо-падзяка, спярша архіпастыру — архіепіскапу Навагрудскаму і Лідскаму Гурыю, за тое, што накіраваў у прыход добрага святара, потым — пастару — іерэю Аляксію Лаўніку, які служыць у прыходзе вось ужо больш за год.



«І як святар, і як чалавек, айцец Аляксій вельмі ўважлівы, добры, спагадлівы, просты ў зносінах, бескарыслівы, — гаворыцца ў пісьме. — Усе прыходжане душой прыхінаюцца да яго. Мы дзякуем Богу, што да нас прыйшоў такі чалавек. Мір і супакой ён прынёс з сабой у прыход. Стараннямі айца Аляксія пры храме створаны цудоўны хор, які нядаўна на епархіяльным фестывалі духоўных песнапенняў у Дзятлаве заняў першае месца, а ў Слоніме — другое. Пасля свята Хрышчэння Гасподняга бацюшка наведаў кожны дом, пажадаў міру і дабра, асвяціў хрышчэнскай вадой нашы падворкі. Айцец Аляксій трымае цесную сувязь са Свята-Елісееўскім Лаўрышаўскім манастыром, дапамагае ў паломніцкім руху. Мы жадаем яму здароўя, даўгалецця. Хай верай і праўдай служыць ён Богу і людзям».

Свята-Успенскі храм у Лаўрышаве быў пабудаваны як манастырскі ў 1778 годзе з дрэва ў выглядзе карабля. Гэта было другое адраджэнне старажытнага Лаўрышаўскага манастыра, які першапачаткова знаходзіўся на некаторай адлегласці ад вёскі (там, дзе ён сёння і адраджаецца). Тады былі пабудаваны званіца і жылы корпус — невялікі мураваны будынак, у якім знаходзілася багатая бібліятэка і склад. Прыхадской царква стала ў 1836 годзе, пасля закрыцця манастыра. А на пачатку XX стагоддзя настаяцелем у ёй служыў свяшчэннапакутнік Сергій (Радакоўскі).

Добра, напэўна, калі ў людзей нашых ёсць нагода любавацца адзін адным. Калі пры думках пра некага сэрца напаўняецца ціхай радасцю. Тады разумееш, што рай магчымы і на зямлі — ён унутры нас.

Шчыра віншуем з 50-годдзем ***Галіну РАМЕЙКА*** *з в. Нача Ляхавіцкага раёна.*

Жадаем моцнага здароўя, душэўнага спакою, каб, нягледзячы ні на якія жыццёвыя цяжкасці, ты не страціла сваёй добрыні, узнёсласці і няўрымслівасці душы.

З павагай Бараноўскія, Жаўняровіч, Гаранавіцкія.

«Засвяціліся» лямпачкі

У пункце пропуску «Каменны Лог» беларускія памежнікі і мытнікі затрымалі легкавы аўтамабіль з буйной партыяй кантрабанды.

Паводле звестак прэс-цэнтра Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, грамадзянін Літвы спрабаваў незаконна ўвезці ў нашу краіну больш за 20 тысяч аўтамабільных лямпачак агульным коштам прыкладна 21 мільён рублёў.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Прадкажыце мне зімовае надвор'е,
Снежнае збаўленне абяцайце,
Каб схаваці цёмнае ліхое,
Каб нарэшце пасвятлела ў хаце.

Сярод цьмяных колераў
спрадвечных
Светлыя — схаваныя, як скарбы,
На адно хварэем невылечна —
Арганізму не хапае белай фарбы.

Белатою першапачынання
Агарнуў бы гэты лес збруднелы,
Каб пад снежным
вэлюмам вянчальным
Мілая вярбінка прыгажэла.

Той вярбе, што з восені трывае,
Пасцяліў бы белы сон пад ногі —
Белага нясцерпна не хапае,
Светлага, радзіннага, святога...

(Бясснежны люты 2008 года)

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Вадалеям лепш пазбягаць спрэчак, а Цяльцы павінны быць уважлівымі да дэталяў

ВАЕН. Не варта спяшацца з высновамі і тым больш — з рашэннямі, якой бы зразумелай ні здавалася сітуацыя. Прыслухайцеся да голасу інтуіцыі: яна падкажа правільнае рашэнне. Не ажыццяўляйце яго раней, чым у пятніцу. Тыдзень будзе ўдалы для пошуку работы і наладжвання дзелавых адносінаў.

ЦЯЛЕЦ. Ідэі, якія будуць наведваць вас на працягу ўсяго тыдня, варта адразу ж выпрабаваць на практыцы. Дэталі зараз набываюць першараднае значэнне — пастарайцеся надаць ім належную ўвагу. А вось у авантуры лепш не ўлазіць і ў інтрыгах не ўдзельнічаць — яны могуць павярнуцца супраць вас. Пажадана лагічна і коратка выказваць свае думкі, а калі не будзе атрымлівацца, лепш адкласці важную размову.

БЛІЗНЯТЫ. Першая палова тыдня будзе беднавата падзеямі, таму яна максімальна ўдалая для адпачынку. Самы час чымсьці сябе пацешыць. Занятак любімай справай толькі патроіць вашы сілы. У аўторак лепш не выказваць уголас сваіх меркаванняў тым, хто старэйшы за вас ці вышэй па становішчы. У другой палове тыдня не рэкамендуецца правакаваць канфлікты.

РАК. Падумайце пра будучыню. Не лішнім будзе прыслухацца да парад сяброў і калег, якім вы давяраеце. А вось грошы ў сумесны бізнэс цяпер укладаць непажадана — не самы лепшы момант. Пачынаючы з сярэдзіны тыдня графік работы можа стаць вельмі напружаным — пастарайцеся не вельмі стаміцца да гэтага часу. Займайцеся творчасцю, часцей сустракайцеся з сябрамі — вам неабходна здымаць нервовыя перагрузкі.

ЛЕЎ. Спрабуючы звярнуць горы на сваім шляху, вы можаце крыху не разлічыць і пераацаніць свае сілы. Больш цікаўцеся праблемамі калег і падначаленых — бо вашым поспехам можна толькі пазайздросціць, а людзі такія слабыя. Настае ўдалы час для тых, каму неабходна перайсці на новую работу. Пачынайце асвойваць новыя камп'ютарныя праграмы — гэта можа сур'ёзна дапамагчы ў прасоўванні па кар'ернай лесвіцы.

ДЗЕВА. У прадпрымальнікаў і начальнікаў магчымыя канфлікты з падначаленымі, якія адгукнуцца і ў аддаленай будучыні. Серада — дзень «дзэа вю»: здаецца, што ўсё гэта вы ўжо аднойчы перажывалі. Магчыма, дарэчы, і аднаўленне даўніх сувязяў. Усе справы, якія пачняце ў чацвер, удасца зрабіць асабліва добра. У пятніцу пастарайцеся не паддавацца ўнушэнню, ляноце і спакусам, пазбягайце праяўлення жывёльных інстынктаў.

ШАЛІ. У панядзелак лепш адкласці заключэнне здзелак і дагавораў, падпісанне важных дакументаў, уладжванне юрыдычных пытанняў. У гэты дзень трымайцеся далей ад усялякіх інтрыг і закулісной валтузні. У аўторак будзьце больш уважлівымі да навінаў і нават плётак. У пятніцу пастарайцеся не ўступаць у новыя канфлікты, адмоўцеся, па магчымасці, ад адказных выступленняў, удзелу ў нарадзе, нават звычайнага абмену думкамі з навакольнымі.

СКАРПІЁН. Важна не прапусціць момант, калі будзеце здольны прадэманстраваць свае таленты навакольным. У выпадку ўдалага выступлення аўтарытэт і папулярнасць значна ўзрастуць. Ваша асабістая прывабліваць, а таксама правільная перадача эмоцый вызначаць верагоднасць поспеху ў вырашэнні фінансавых праблем. У вас з'явіцца магчымасць разабрацца, хто сапраўды сябар, а хто проста прыяцель, — і адкрыццё можа здзівіць.

СТРАЛЕЦ. У панядзелак, пры жаданні, зможаце ажыццявіць усе задумы. У аўторак кожная рызыка ці авантура прывядзе да правалу ці расчаравання. Серада — дзень кампрамісаў, таму з начальствам лепш не канфліктаваць. Пастарайцеся зарэкамендаваць сябе добрасумленным работнікам. Праявіце цярплівасць у дачыненні да калег — вашы справы будуць складвацца вельмі паспяхова. Сканцэнтруйцеся на самых важных праблемах і не звяртайце ўвагі на дробязі.

КАЗЯРОГ. Узрасце нагрузка інтэлектуальнага характару, ад вас спатрэбіцца больш адказнасці. Панядзелак можа расчараваць у дзелавой сферы, але вас маральна падтрымаюць сяброўскія сустрэчы. У сярэдзіне тыдня магчыма паляпшэнне адносінаў з роднымі. Чацвер можа прынесці творчае натхненне і незвычайныя новыя ідэі. Субота будзе спрыяць і прыняццю канструктыўных рашэнняў, і актыўным дзеянням.

ВАДАЛЕЙ. Прыслухайцеся да таго, што гавораць іншыя — і атрымаеце важную ідэю, якая ў бліжэйшай будучыні пашырыць вашы магчымасці. Не адкладвайце выкарыстанне шанца, які вельмі дарэчы падвярнуўся, далей, чым да серады, інакш ён спліве ў іншыя рукі. У чацвер вас могуць уцягнуць у абсалютна бессэнсоўную спрэчку — пастарайцеся дастойна выйсці з гэтай сітуацыі.

РЫБЫ. Вашы планы і ідэі, нягледзячы на некалькі дзёрзкі характар, знойдуць на гэтым тыдні разуменне і падтрымку. Дазвольце раскрыцца сваім талентам і здольнасцям — больш упэўненасці ў асабістых сілах. На рабоце спатрэбіцца максімальна магчымая сабранасць. Вам проста неабходна мабілізавацца і працаваць больш, чым звычайна. І пастарайцеся, каб вас зусім не перагрузілі работай, інакш гэта можа негатыўна адбіцца на здароўі.

БЕЛАРУСКІЯ ПРЫВАТНЫЯ ГЕРБЫ

Парай

У чырвоным полі пяціпялёсткавая срэбная ружа з пяццю зялёнымі лісткамі.

Гербам ПАРАЙ карысталіся: Барысевіч, Беразінскі, Букоўскі, Бушынскі, Бярнацкі, Віткоўскі, Вяльчынскі, Вянгерскі, Галіцкі, Гедройц, Горскі, Градзецкі, Грыбоўскі, Дамброўскі/Дуброўскі, Завіша, Залатынскі, Зброжак, Елец, Каменскі, Кіневіч, Кучэўскі, Лагяўніцкі, Латкоўскі, Ліпінскі, Ліпніцкі, Лісоўскі, Лыскоўскі, Макоўскі, Мацкевіч, Міхалоўскі, Міцкевіч, Мокрскі, Мяжэвіч, Набароўскі, Навіцкі, Несялоўскі, Нехядовіч, Нефядовіч, Нясецкі, Няцецкі, Патоцкі, Піятроўскі, Пласкавіцкі, Прабароўскі, Расінскі, Рачкоўскі, Ромбульд, Розан, Рудніцкі, Сакалоўскі, Скальскі, Стралкоўскі, Сухецкі, Сухоцкі, Сялецкі, Трамбіцкі, Трынішэўскі, Тымінскі, Пажазінскі.

Пелеш

У чырвоным полі два мечы срэбныя з залатымі тронкамі, скрыжаваныя наўкос, лёзамі дагары.

Гербам ПЕЛЕШ карысталіся: Беласукня, Бянеўскі, Ельскі, Злоты, Кваснецкі, Кваснеўскі, Мацарскі, Пелеш, Петражыцкі, Сманеўскі.

Пнейня

У чырвоным полі дзве чорныя мядзвежыя лапы ўзнімаюць залаты яблык, працяты знізу дагары срэбнай стралой.

Гербам ПНЕЙНЯ карысталіся: Гродскі, Грынеўскі, Гяроўскі, Карвоўскі, Расткоўскі, Тайшэрскі.

Побаг

У блакітным полі срэбная падкова гакамі ўніз, на ёй залаты крыж кавалерскі.

Гербам ПОБАГ карысталіся: Альхімовіч, Альшэўскі, Андрайковіч, Андраневіч, Аўлановіч, Бельскі, Бруханскі, Брэзгін, Бужынскі, Буржынскі, Бяліцкі, Бяніслаўскі, Вадарадскі, Валентыновіч, Вольскі, Горвад, Грабоўскі, Гумоўскі, Гурскі, Дамброўскі/Дуброўскі, Дмахоўскі, Доўнар, Душкевіч, Душэўскі, Жаромскі, Жураўскі, Запольскі, Заянчкоўскі/Заячкоўскі, Заржэцкі/Зарэцкі, Захватовіч, Зянковіч, Ісаевіч, Кабылінскі, Крушынскі, Кутлеўскі, Кярсноўскі, Ланецкі, Лаўрыновіч, Мазуркевіч, Маліноўскі, Манстрым-Філіповіч, Мядзвецкі, Нерашынскі, Несцяровіч, Нячай, Падгурскі, Пакоўскі, Палевіч, Паневіч, Пуляноўскі, Рудкоўскі, Рымашэўскі, Рымінскі, Рынеўскі, Станіслаўскі, Станішэўскі, Суткоўскі, Сухадольскі, Сымановіч, Талочка, Тарайкоўскі, Федаровіч, Філімановіч, Філіповіч, Хадачынскі, Хамінскі, Чартовіч, Чыжэўскі, Шантыр, Шпігановіч, Шпігельскі, Шукшта, Шыдлоўскі, Шчасновіч, Шчуцкі, Элерт, Явароўскі, Якубовіч, Ямантовіч, Янушкоўскі.

Праўдзіч

У срэбным полі чырвоны мур блакіраваны, за ім залаты леў з залатым колам у лапах.

Гербам ПРАЎДЗІЧ карысталіся: Альшэўскі, Арцімовіч, Арцішэўскі, Бараноўскі, Бельскі, Браткоўскі, Брахоцкі, Валянскі, Владак, Воўчак, Вольскі, Высоцкі, Вышамірскі, Вяржбоўскі/Вярбоўскі, Галынскі, Граковіч, Грамніцкі, Гузельф, Дзванкоўскі, Дзердзяеўскі, Залескі, Зарэмба, Заянчкоўскі/Заячкоўскі, Зубоўскі, Ізбіцкі, Крушынскі, Кукленскі, Куксінскі, Кухарскі, Левандоўскі, Манькоўскі, Мольскі, Мурашка, Няміра, Пасяніцкі, Рымашэўскі, Савінскі, Сакалоўскі, Салагуб, Сарбеўскі, Сіцінскі, Слугоцкі, Стржалкоўскі/Стралкоўскі, Сямкоўскі, Трапша, Філіповіч, Цыбільскі, Шымакоўскі, Шыманоўскі, Яршэўскі.

Рубрыку вядзе Уладзімір КРУКОЎСКІ.

ОАО «Савушкин продукт» объявляет тендер

по строительству 18-этажного жилого дома, расположенного по г.п. № 97 ВМР-5 по улице Московской в городе Бресте.

В наличии имеется проектно-сметная документация. Общая стоимость жилого дома в ценах 1991 года составляет 7 625 055 рублей.

Тендерные предложения принимаются в срок до 10 марта 2008 г. по адресу: 224028, г. Брест, ул. Янки Купалы, 108, ОАО «Савушкин продукт».

Тел.: (0162) 47 06 16; (029) 636 58 40.
Факс: (0162) 47 06 13.

УНП 200030514.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.43	17.05	9.22
Віцебск —	7.37	16.51	9.14
Магілёў —	7.33	16.55	9.22
Гомель —	7.25	16.56	9.31
Гродна —	7.57	17.21	9.24
Брэст —	7.53	17.27	9.34

Месяц

Маладзік.
Месяц у сузор'і Рыб.

Імяніны

Пр. *Івана (Івана Златавуста);*
К. *Апалоніі, Бярнарды, Сабіны, Кірылы, Раймунда, Эрыка.*

НАДВОР'Е на заўтра

Геамагнітныя ўзрушэнні



Абазначэнні:
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— малая геамагнітная бура

...у суседзяў

ВАРШАВА	+5..+7°С	КІЕЎ	-1..+1°С
ВІЛЬНЮС	+3..+5°С	МАСКВА	+1..+3°С
РЫГА	+4..+6°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	0..+2°С

Дзве даты

9 лютага

1568 год — пачала дзейнасць Заблудаўская друкарня, заснаваная Іванам Фёдаравым і яго паплечнікам Пятром Мсціслаўцам (Заблудава — невялікае мястэчка на захадзе Беларусі). Існавала друкарня нядоўга — каля двух гадоў, але яе роля ў гісторыі славянскага кнігадрукавання выключна вялікая. У тыя далёкія часы яна з'яўлялася прыкладам дружалюбных сувязяў брацкіх народаў. Калі Іван Фёдараў і Пётр Мсціславец перабраліся з Маскоўскай дзяржавы на тэрыторыю Вялікага княства Літоўскага, адносіны дзвюх дзяржаў былі напружаныя: якраз тады ВКЛ уступіла ў працяглую спрэчку з Расіяй з-за лівонскай спадчыны.

1904 год — ля берагоў Карэі, атакаваныя 14 японскімі караблямі, прынялі няроўны бой і былі патопленыя сваімі экіпажамі рускія крэйсер «Варяг» і кананірская лодка «Карэец».

Цытата дня:

«Золата забіла больш чалавечых душ, чым жалеза — целаў».

Вальтэр Скот (1729—1799), шатландскі пісьменнік.

Усміхнёмся!

Жанчына, якая ніколі не бачыла, як яе муж ловіць рыбу, ніколі не даведаецца, з якім цярплівым чалавекам яна ўзяла шлюб.

☺

— Прывітанне, мая каханая! Чым займаешся?

— Прывітанне! Гляджу «Дом-2».

— Дурніца, не пішы мне больш...

☺

Яна не вытрымала, адкрыла свой міленькі роцік і сапсавала цудоўную фігуру і дарагі купальнік.

☺

— Скажыце, калі ласка, вы маскавіч?

— Не, я рускі...

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ДЛЯ ВАШАЙ КАРЫСЦІ

Чым сабе дапамагчы ў час магнітных бур

Уплыў атмасфернага ціску і магнітных бур на чалавека прызнае не толькі народная медыцына, але і масцітыя ўрачы. Непрыемныя сімптомы звязаны з фізічнымі і хімічнымі зменамі, якімі наш арганізм рэагуе на працэсы ў атмасферы. Здаровы лад жыцця, правільнае харчаванне, лекавыя напоі могуць абараніць нас ад магнітных бур.

■ Калі вы востра рэагуеце на перамены ў атмасферы, то майце на ўвазе, што пры магнітных бурах абвастраюцца ўсе захворванні, якія маюцца. Пры захворванні на гіпертанію рэкамендуецца на працягу 2—3 тыдняў запар перад сном заліць 1 ст. лыжку кукурузнай мукі шклянкай кіпеню, настояць напрацягу ночы. Зранку размяшаць, выпіць настой і з'есці ўсю гушчу. Праз 30—50 хвілін паснедаць як звычайна. Можна перад сном здрабніць у парашок сталовую лыжку насення кропу і з'есці яго, запіваючы шклянкай цёплай вады з чайнай лыжкай натуральнага мёду. Курсы паўтараць па неабходнасці.

■ У час магнітных бур павялічваецца згусальнасць крыві, таму карысна есці часнок, прымаць прэпараты, якія змяшчаюць нікацінавую кіслату, ці адзін раз у паўгода праводзіць профілактычны прыём аспірыну ў мікрадозах.

■ Калі вы пакутуеце ад перамен надвор'я і ў вас атэрасклероз, то вельмі карысна паміж магнітнымі хваляваннямі праводзіць фізічныя практыкаванні на вуліцы ці ля адчыненага акна, аднак пры гэтым старайцеся не пераахалоджвацца. Непасрэдна ў час магнітных бур ад фізічнай нагрузкі неабходна адмовіцца, асабліва калі ў вас маюцца сардэчна-сасудзістыя захворванні.

■ Для профілактыкі абвастрэнняў хвароб сэрца ці сасудаў піце настойкі півоні, глогу, а калі вы часта нервуецеся, то валяр'яну ці сардэчніку.

■ У час магнітных бур узмацняюцца і працэсы акіслення ў арганізме, таму напярэдадні і ў пару сур'ёзных хваляванняў у атмасферы ўжывайце пабалей сырых ягад, агародніны, садавіны, зеляніва, а таксама піце свежавыціснутыя сокі — цытрусавыя, маркоўны з бурачным, з зялёных яблыкаў.

Сокі трэба піць як мінімум 2 разы на дзень па 0,5 шклянкі.

БЕЗ РЭЦЭПТА

Капусныя кампрэсы

Пры грыпе і ВРЗ з высокай тэмпературай вазьміце сухі чысты капусны ліст, прыкладзіце яго да шыі і зверху абкруціце баваўнянай хусткай. Гэты кампрэс неабходна мяняць кожныя дзве гадзіны.

Капуста «забірае» гарачку, тэмпература паніжаецца, дыханне палягчаецца, боль хутка адступае. Пры моцных ангінах і запушчаных бранхітах надзярыце капусту з крапкай на тарцы, прыкладзіце кашку да вобласці горла і бронхаў, замацуйце кампрэснай паперай і шчыльна абкруціце ручніком. Трымайце не менш чым гадзіну.

-2477-

МЕНЮ ЗДАРОЎЯ

Рыбны дзень

Свежая рыба і морапрадукты раней лічыліся далікатэсамі, а сёння іх можна купіць у любым супермаркеце. Чым не нагода есці дары Нептуна як мага часцей? Тым больш што, на думку дыетолагаў, гэта самая здаровая ежа на свеце.

КАРП З АГАРОДНІНАЙ

Карп (5 шт.), 250 г сыру, 2 цыбуліны, 3 памідоры, 3 бульбіны, 1 балгарскі перац, 100 г маянэзу, соль, перац, прыправы для рыбы, зяленіва, алей.

Падрыхтаваную рыбу пасаліце і натрыце прыправамі для рыбы. Сыр надзярыце на дробнай тарцы. Памідоры парэжце кружочкамі ці долькамі, балгарскі перац — кавалачкамі. Памідоры, перац і сыр змяшайце. Напхайце сумессю карпаў. Форму для запякання змажце алеем. Зверху памажце маянэзам. У прамежках разлажыце нарэзаную долькамі бульбу, зверху — кольцы цыбулі. Цыбулю і бульбу пасаліце. Запякайце ў духоўцы 20 хвілін пры 220 °С. Пасыпце зяленівам.

ГАЛУШКІ З ГАРБУШЫ

На адну порцыю галушак: 120 г філе гарбушы, 0,5 цыбуліны, 0,5 лустачкі белага чэрствага хлеба, 0,5 яйка, 2 ст. лыжкі малака, соль.

Для адвару: па 1/3 сярэдняга бурака, морквіны, кораня пятрушкі, цыбуліны, перац, лаўровы ліст, соль на смак.

Хлеб замачыце ў малацэ, адцісніце. Філе рыбы двойчы прапусціце праз мясарубку разам з цыбуляй і хлебам. У фарш дадайце яйка, пасаліце. Сфармуйце круглыя галушкі. Караняплоды зварыце ў падсоленай вадзе з прыправамі. Адвар працадзіце, давядзіце да кіпення, пакладзіце ў яго галушкі. Гатуйце 40 хвілін на слабым агні. Вылажыце на талеркі, пасыпце зяленівам.

ФАРШЫРАВАНЫЯ КАЛЬМАРЫ

9—10 шт. кальмараў, 5 цыбулін, 300—400 г грыбоў, упакоўка крабавых палачак, 1 шк. рысу, 200 г маянэзу, алей, зяленіва.

Тушкі кальмараў прамыйце пад гарачай вадой, пачысціце. Рыс адварыце, грыбы і цыбулю абсмажце, крабавыя палачкі парэжце. Злучыце смажаныя грыбы, цыбулю, крабавыя палачкі, адвараны рыс, змяшайце з маянэзам. Сырыя тушкі кальмараў напхайце атрыманым фаршам. Кожную тушку намажце зверху маянэзам, пакладзіце на бляху і пастаўце ў духоўку на 15—20 хвілін. Упрыгожце зяленівам.

САЛАТА З КРЭВЕТКАМІ

0,5 кг крэветак, 4 яйкі, 200 г кансерваваных ананасаў, 150 г маянэзу, лісце салаты, 0,5 ч. лыжкі лімоннага соку, прыправы для морапрадуктаў, соль.

Крэветкі адварыце ў падсоленай вадзе, дадайце прыправы. Яйкі адварыце ўкрутую, парэжце кубікамі. З ананасаў зліце вадкасць і таксама парэжце іх кубікамі. Па краі плоскай талеркі разлажыце лісце салаты, на яго кавалачкі ананасаў, зверху яйкі, затым крэветкі. Слаі прамазвайце маянэзам.

ВАРТА ПРЫСЛУХАЦЦА

Алхімія страсці

Як выявілі сацыёлагі, дзве трэці сем'яў распадаюцца ўжо праз тры гады пасля іх стварэння. Чаму? Вучоныя сцвярджаюць: менавіта столькі часу можа існаваць страсць. Пачуццё, якое прымушае пачашчана біцца сэрца, абумоўлена павелічэннем у арганізме ўзроўню некалькіх гармонаў, якія даўжэй чым тры гады жыць у «экстрэмальным рэжыме» не могуць. І калі, акрамя страсці, партнёрам нічога не звязвае, яны расстаюцца.

-2478-

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 24 31 92, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 35.018. Індэкс 63850. Зак. № 744. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12